**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны універсітэт**
**імя Францыска Скарыны”**

**В. С. НОВАК**

# ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА

**ТЭКСТ лекцыі па тэме**
**“Рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый”**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1-21 05 01 “Беларуская філалогія**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Гомель**
**УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”**
**2010**

УДК 398.3 (= 161.3) : 378.147.88 (075.8)
ББК 82.3 (4 БЕІ = 411.3) - 4 : 63.52 (= 411.3) – 731 я73
Н 723

Рэцэнзент:
кафедра беларускай культуры і фальклларыстыкі установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”

Рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”

**Новак, В.С.**
Н 723 Фальклларыстыка : тэкст лекцыі па тэме “Регіянальныя асаблівасці вясельных традыцый” для студэнтаў спецыяльнасці 1- 21 05 01“Беларуская філалогія” / В. С. Новак, М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – 107 с.

Комплекс вучэбных матэрыялаў уключае тэкст лекцыі на тэму «Регіянальныя асаблівасці вясельных традыцый», чатыры часткі практычнага дапаможніка и адрасаваны студэнтам спеціяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія».

У лекцыі апісваюцца вясельныя традыцыі беларусаў, раскрываецца роля і значэнне гэтых традыцый у іх жыцці, вызначаюцца лакальна-рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый на Гомельшчыне, а таксама міфалагічныя ўяўленні ў вясельнай абраднасці і паэзіі.

УДК 398.3 (= 161.3) : 378.147.88 (075.8)
ББК 82.3 (4 БЕІ = 411.3) - 4 : 63.52 (=411.3) – 731 я73

© Новак В. С., 2010
© УА “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны”, 2010

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**ЗМЕСТ**

Уводзіны ………………………………………………………………....... 4

1 Аб вясельных традыцыях усходнеславянскіх народаў.................. 7

2 Традыцыі вясельнай абраднасці беларусаў................................... 15

3 Лакальна-рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый Гомельшчыны ........................................................................... 25

4 Міфалагічныя ўяўленні ў вясельнай абраднасці і паэзіі ............ 85

Бібліяграфія ....................................................................................... 104

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## Уводзіны

Рэгіянальны фальклор – вусна-паэтычная творчасць пэўнага рэгіёна, якая ў той ці іншай ступені адрозніваецца ад агульнаэтнічнага фальклору, вылучаецца самастойнасцю, аўтаномнасцю, характарызуецца наяўнасцю універсалій, уласцівых для канкрэтнай мясцовасці, гэта сістэма лакальных традыцый, але не кожная з іх можа атрымаць статус рэгіянальнай з’явы. Якім чынам складваюцца рэгіянальныя асаблівасці розных жанраў, відаў фальклору? Рэгіён – гэта не толькі паняцце палітыка-адміністрацыйнага значэння, гэта культурна-эканамічны комплекс, які сфарміраваўся гістарычна на пэўнай тэрыторыі і знаходзіцца ў развіцці. Улік сукупнасці ўсіх рэгіянальных фактараў (вытворчага, сацыяльна-гістарычнага, этнічнага, генетычнага, кантактнага і інш.) надзвычай важны для разумення фальклору ў тым ці іншым рэгіёне. У нейкай ступені яны абумоўліваюц характар і мясцовыя асаблівасці працэсаў актыўнага развіцця адных жанраў, захаванасці другіх, трансфармацыю і затуханне іншых. Толькі шырокае франтальнае абследаванне асобных рэгіёнаў дазваляе вызначыць як заканамернасці развіцця агульнаэтнічнага фальклору, так і падкрэсліць рэгіянальныя асаблівасці.

Характарыстыка фальклору беларусаў як агульнаэтнічнай з’явы немагчыма без вылучэння ў ім такіх рэгіёнаў, як Цэнтральны, Усходні (Падняпроўскі), Паазер’е, Заходняе Палессе і Усходняе Палессе, якія адрозніваюцца ў першую чаргу своеасаблівымі фальклорна-этнаграфічнымі комплексамі і абрадавай паэзіяй. Беларускі фальклор розных рэгіёнаў краіны ўяўляе сабой дыялектычнае спалучэнне агульнанацыянальных рысаў і ў той жа час непаўторных рэгіянальных адметнасцей. Гэтая з’ява – існаванне (бытаванне) этнічнага (агульнанацыянальнага) у шматварыянтнай тэматычнай і рэгіянальна-лакальнай разнастайнасці – адна з галоўных заканамернасцей сусветнага фальклору.

Без вывучэння рэгіянальнага фальклору нельга атрымаць поўную характарыстыку бытавання фальклорна-этнаграфічных з’яў у цэлым на тэрыторыі Беларусі, іх сучаснага стану, выявіць як рэгіянальныя, так і мясцовыя адметнасці.

Каб зрабіць сёння вывады аб лёсе беларускага фальклору ў цэлым, трэба за аснову ўзяць матэрыялы ўсіх рэгіёнаў і выявіць найбольш агульныя заканамернасці, тыпалагічна родныя элементы і спецыфічныя адметнасці, звяртаючы ўвагу і на малазначныя элементы, бо ў сукупнасці ўсе мясцовыя асаблівасці, нават дробязныя, дазваляюць стварыць цэласную карціну яго стану і бытавання і зрабіць адпаведныя навуковыя абагульненні.

Сістэматычнае вывучэнне рэгіянальнага фальклору дазваляе не толькі атрымаць уяўленне аб характарыстыцы песеннага рэпертуару,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узаемадзеянні фальклорных традыцый, але і знаёміць з лёсам фальклору ў цэлым і асобных жанраў, міграцыяй сюжэтаў, своеасаблівасцямі і шматграннасцю мастацкай культуры этнічных рэгіёнаў і адметнасцямі яе гістарычнага развіцця. Навуковае даследаванне рэгіянальнага фальклору павінна праводзіцца з улікам картаграфічнага аналізу ўсёй сукупнасці фактаў таго ці іншага рэгіёна.

Рэгіянальны фальклор як арганічная частка агульнанароднага, або агульнаэтнічнага фальклору, фарміруецца на глебе лакальных традыцый, якія ў працэсе бытавання паралельна вар'іруюць. Агульнанародныя прыкметы фальклорнай культуры ўяўляюць сабой розныя абагульненні, універсаліі, інтэгрыруючыя якасці. Свой статус агульнанароднай яна атрымлівае толькі на рэгіянальна-лакальным узроўні. Фальклор як від мастацтва бытуе і функцыянуе непасрэдна на рэгіянальным (лакальным) узроўні. Улічваючы гэты фактар, аб'ектыўна рэгіянальную з'яву можна суаднесці з канкрэтнымі фальклорнымі творамі, якія маюць шмат варыянтаў. Менавіта фальклор асобных рэгіёнаў фарміруецца на аснове агульнафальклорных традыцый, улічваючы этнічна-характэрныя рысы. Найбольш перспектыўныя шляхі асэнсавання рэгіянальнага фальклору – правядзенне комплексных фальклорна-этнаграфічных экспедыцый з мэтай суцэльнага абследавання рэгіёна, паўторнае назіранне і фіксацыя звестак, арганізацыя тэксталагічнай і архіўнай работы, падрыхтоўка рукапісаў рэгіянальных фальклорна-этнаграфічных зборнікаў, каштоўнасць якіх бясспрэчная для адраджэння і захавання культуры. Актуальнымі ў фалькларыстыцы з'яўляюцца праблемы вывучэння рэгіянальнай спецыфікі фальклору, узаемных адносін і сувязей з агульнанароднай фальклорнай культурай, вытокаў яе рэгіянальнасці. У сучасным рэгіянальным фальклоры ў сваёй натуральнай форме ўзнаўлення працягваюць бытаваць асобныя абрады і звычаі, у якіх найбольш глыбока і ўсебакова раскрываюцца асаблівасці менталітэту беларусаў. Багацце рэгіянальна-лакальных фактаў народнай культуры ставарае не толькі аб'ектыўную карціну яго стану бытавання, але і пацвярджае ўсведамленне самімі носьбітамі (выканаўцамі) ідэі яе захавання, перадачы ў спадчыну.

Яскравым узорам бытавання агульнаэтнічнага фальклору і яго ўзаемаадносін з рэгіянальнай фальклорнай традыцыяй з'яўляецца вяселле. Аб'ектыўны факт бытавання рэгіянальных асаблівасцей вясельных традыцый Беларусі дае падставы сцвярджаць, што гэта тая натуральная форма, у якой існуе агульнабеларускае вяселле. Рэгіянальныя адметнасці датычаць як у цэлым структуры вяселля беларусаў, так і асобных абрадавых момантаў песеннага суправаджэння, сістэмы міфалагічных прыкмет і павер'яў. Ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі традыцыйнае вяселле складаецца з такіх абрадавых момантаў, як сватанне, заручыны, зборная субота, пасад, каравай, вясельнае застолле ў хаце жаніха і нявесты, паслявясельная частка.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Прывядзем прыклады рэгіянальных адметнасцей такога абрадавага этапу беларускага вяселля, як сватанне. Напрыклад, своеасаблівым сімвалам згоды на шлюб на тэрыторыі Гомельшчыны былі наступныя абрадавыя дзеянні: дзяўчына калупала ў сцяне мох паміж бярвеннямі (Жыткавіцкі раён, в. Верасніца); адразу разам разразалі два боханы хлеба – той, што прынеслі з боку жаніха, і той, што быў з боку нявесты (Хойніцкі раён, в. Пагоннае); дзяўчына рассцілала перад сватамі вышываны ёю ручнік (Жлобінскі раён, в. Малыя Казловічы); сватоў запрашалі за стол і частавалі "першай чаркай з гарэлкі жаніха" (Кармянскі раён, в. Багданавічы); маладая давала сватам ручнікі, якія сама вышывала (Акцябрскі раён, в. Лескі) і інш. Сімвалам жа дасягнення згоды на шлюб у некаторых вёсках на Магілёўшчыне з'яўлялася зламаная вярхушка каліны: маці маладой выпраўлялі "ламаць каліну" – зламаць вярхушку маладога дрэўца (часцей каліны) і аддаць яе свату. На Міншчыне ў в. Маркава Маладзечанскага раёна згоду на шлюб сімвалізаваў падарунак, у які ўваходзілі хлеб, пляшка гарэлкі, абкручаны поясам ручнік і кавалак палатна.

Як бачым, агульнабеларуская вясельная традыцыя ёсць не што іншае, як абагульненне асаблівасцей вяселля ў асобных рэгіёнах і вёсках. Паводле слушнага выказвання Б.М. Пуцілава, "фальклорная культура выступае як агульнанародная настолькі, наколькі яе змест і яе мова, склад, прынцыпы функцыянавання характарызуюцца наяўнасцю універсалій, агульных для рэгіёнаў, зон, ачагоў" [5, с. 147].

Комплекс вучэбных матэрыялаў уключае тэкст лекцыі на тэму «Рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый», чатыры часткі практычнага дапаможніка и адрасаваны студэнтам спецыяльнасці 1- 21 05 01 «Беларуская філалогія».

У лекціі апісваюцца вясельныя традыцыі беларусаў, раскрываецца роля і значэнне гэтых традыцый у іх жыцці, вызначаюцца лакальна-рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый на Гомельшчыне, а таксама міфалагічныя ўяўленні ў вясельнай абраднасці і паэзіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## 1 Аб вясельных традыцыях усходнеславянскіх народаў

Рускае вяселле, як і вясельная абраднасць беларусаў, захавала рэшткі старажытных гістарычных перыядаў і ўласцівых для іх шлюбных адносін. “Традыцыйны вясельны абрад – не толькі сямейнае свята, але і сакральная з’ява з яе рэлігійна-магічным кампанентам, і юрыдычна-бытавы акт” [6, с. 90].

Як і ў беларускім вяселлі, кожны ўдзельнік рускай вясельнай цырымоніі меў сваю пэўную ролю. Назвы вясельных чыноў шырока вар’іраваліся ў сувязі з асаблівасцямі геаграфічнай лакалізацыі розных тыпаў рускага вяселля. Даследчыкі вылучаюць наступныя геаграфічныя арэалы рускага вяселля: сярэднерускі, паўночнарускі і паўднёварускі.

Адзначым, што ва ўсходнеславянскіх народаў фіксуецца каля 411 назваў удзельнікаў вяселля. “В числе свадебных чинов были: рожники – родственники невесты; дружина, бояре – спутники жениха; боярки, подневестницы – спутницы невесты; подголосницы – поющие девушки; каравайницы – женщины, которые готовят свадебный каравай; стряпуха, куховарка – женщина, готовящая свадебное угощение; коробейники, приданки (отвозят приданое), светилки (держат свечи при венчании), вежливец, опасный, клетник – человек, который мог оградить от колдунов и проч.” [6, с. 91].

Заўважым, што ўсходнеславянскае вяселле мае па сутнасці адзіную кампазіцыю вясельнай абраднасці, якая і ў рускіх, і ў беларусаў, і ва ўкраінцаў складаецца з трох частак: гэта давясельная (“предвенечная”), уласнавясельная і паслявясельная. Калі агульная структурная схема праводзін кожнага з этапаў названых цыклаў мела тыповы характар, то асобныя іх рытуалы ў рускіх, беларусаў і ўкраінцаў мелі адметны характар.

Цікава адзначыць, што пры ўсёй уражваючай варыятыўнасці вясельных традыцый усходнеславянскіх народаў, усё ж гістарычна склаўся пэўны стэрэатып вяселля, агульнага і для рускіх, і для беларусаў, і для ўкраінцаў. Што датычыць рускай вясельнай абраднасці, то варта адзначыць два асноўныя тыпы вяселля: драма і свята. “Первый характерен прежде всего для Русского Севера, старожилов Сибири (в основе своей северных выходцев), семейских Забайкалья. Со дня сговора невеста начинала причитать, причитала и мать, подруги. На юге же России, у казаков, некоторых групп белорусов и украинцев свадьба была веселым действом. Невеста причитала на могиле родителей, пелись грустные песни, только если она оставалась сиротой” [7].

У паўночнай вясельнай абраднасці, у сваёй аснове драматычнай, важным рытуалам, якім адрозніваецца руская традыцыя ад беларускай, з’яўляецца звычай “баня”. Адбываўся ён пасля “дзявічніка” ў такіх рэгіёнах поўначы Расіі, як на Памор’і, у Архангельскай, Аланецкай, Пецярбургскай, Вяцкай, Наўгародскай, Пскоўскай, Пермскай і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

губернях. Сутнасць рытуалу заключалася ў тым, што нявесту абавязкова вялі ў лазню, дзе мылі маладую, а потым гэтай вадой мыліся яе сяброўкі, каб “хутчэй выйсці замуж” (Ульянаўская вобласць).

Галоўнае прызначэнне гэтых абрадавых дзеянняў заключалася ў развітанні нявесты з родным домам і дзявоцтвам.

Адметным давясельным абрадавым этапам з’яўляецца “рукобитье”, сутнасць якога заключаецца ў першым наведванні бацькамі жаніха разам са сватам або свахай бацькоў нявесты. “После переломления пирога сватовья садятся за стол, начинается угощение. Во время переломления пирога невесту проводят под платком, садят у печки или у перегородки на лавку, а подруги около нее стоят или сидят”. У Яраслаўскай губерні рукабіццё суправаджалася галашэннямі, прычым іншы раз нявеста сама галасіла, а ў некаторых выпадках запрашалі з гэтай мэтай “выльницу”.

“Девишник”, як і ў беларускім вяселлі зборная субота (вянкі, дзявічнік, ёлка і інш), – складаны комплекс абрадавых дзеянняў, які ўключае такія абрадавыя дзеянні, як расплятанне касы, мыццё нявесты ў лазні, падрыхтоўка “красоты” (“воли”). У беларусаў жа падчас гэтага этапу рыхтавалі вянок для маладой. А таксама можна вылучыць такія адметныя ў рускім вяселлі рытуалы, як “знішчэнне або перадача “красоты” сяброўцы (жаніху), частаванне жаніхом удзельнікаў абраду. Даследчык А.К. Байбурын заўважыў, што апошняй прыкметай, якая звязвае нявесту з яе ранейшым статусам, з’яўляецца “девья красота”, “зняцце” якой адбывалася ў розных формах: “Красота (“воля”) могла воплощаться в некоем предметном символе. Таковыми могли быть кудель, деревце (например, ёлочка, березка), лента-косоплетка, венок, платок, повязка, веревка и др. Для центральных и северных областей России характерно использование в этой роли деревца, ленты, кудели, для Украины и южных областей – венка, повязки, гульца. Относительно редко встречается в качестве красоты веревка. В Вологодской губернии “... от двора невесты до соседнего натягивали веревочку, обвешанную разноцветными лоскутками, посередине которой висела коса изо льна. Эта веревочка называлась “девичья красота”. Она означала, что в этом доме готовится свадьба, выходит замуж девушка. Веревку обрывали во время свадьбы” [8].

Варта адзначыць, што кульмінацыйныя моманты рускай вясельнай абраднасці суадносяцца з агульнай структурнай схемай беларускага класічнага вяселля, за выключэннем асобных этапаў. Гэта абрадавыя дзеянні, якія адбываліся раніцай вясельнага дня (у доме нявесты і ў доме жаніха); сцэны доступу жаніха да нявесты, благаславенне, ад’езд да царквы, вянчанне, і “окручиванне” (нявесце рабілі жаночую прычоску і надзявалі жаночы галаўны ўбор); вясельнае (“княжий пир”) застолле, “постельные” обряды.

Паслявясельны перыяд у рускай вясельнай абраднасці, як і ў беларусаў, вылучаецца багаццем рэгіянальных назваў, разнастайнасцю сімвалічных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

дзеянняў, што пацвярджае яго “не застыласць”, а імкненне ў кожнай мясцовасці спецыфічна распрацоўваць агульныя ўласцівасці. Напрыклад, наведванне маладымі бацькоў нявесты мела ў розных рэгіянальных традыцыях Расіі такія назвы, як “отгостки”, “отводины”, “к теще на блинки” і інш.

Як адзначыў А.К. Байбурын, “конец свадьбы как особого состояння для всех ее участников знаменуется отводинами – совместным посещением молодыми родителей жены. Этот элемент свадьбы особенно важен для невесты, так как “достраивает” ее путь до полной схемы переходного ритуала: “туда и обратно”, но уже в новом статусе” [9].

У адрозненне ад рускага вяселля, паслявясельная частка на Гомельшчыне мае самыя розныя назвы: “гуляць разгуліны”, “гуляць банкеты” (вв. Багданавічы, Сямёнаўка Кармянскага р-на), “вадзіць цыганаў” (в. Калыбань Брагінскага р-на, вв. Маркавічы, Глыбоцкае Гомельскага р-на), “пірагі, госці” (вв. Любавічы, Хільчыцы Жыткавіцкага р-на), “хвост” (Ельскі р-н, в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на), “хадзіць па бяседах” (в. Савічы Брагінскага р-на, в. Радзін Хойніцкага р-на), “гуляць куру” (в. Галоўчыцы Нараўлянскага р-на), “крошкі”, “гуляць пятухі” (вв. Малевічы, Чырвоны Бераг Жлобінскага р-на), “карэнне” і “банкет”, “пята” (вв. Данілавічы, Стаўбун Веткаўскага р-на), “пярэзвы” (в. Кругавец Добрушскага р-на) “ламаць печ” (в. Кашалёў Буда-Кашалёўскага р-на), “збірацца на папялішча” (в. Дубровіца Хойніцкага, в. Васільеўка Добрушскага р-наў), “гуляць зайца” (в. Алексічы Хойніцкага р-на) і інш.

Паўднёварускае вяселле, як адзначаюць даследчыкі, набліжана да ўкраінскага. Яскравай адметнасцю гэтага тыпу з’яўляюцца адсутнасць вясельных галашэнняў, “агульны вясельны тон” [6, с. 92].

Вывучэнне рускіх фалькларыстычных крыніц адносна паўднёварускай вясельнай абраднасці дазваляе вылучыць пэўныя адметныя рысы. Вяселле ў Белгарадскай, Варонежскай, Ліпецкай і Курскай абласцях выяўляе ў цэлым падабенства абрадавых дзеянняў, песень, уяўленняў. Сватанне адбывалася ў два этапы: папярэдняе і заключнае сватанне. Што датычыць апошняга, то “после того, как согласие родителей невесты получено, сватов приглашали к столу, они переходили наконец матицу, все вместе молились Богу, после чего первым делом разрезали хлеб и давали всем по кусочку, выпивали по рюмке квасу, ставили на стол закуску” [10, с. 32]. Як адзначаюць даследчыкі, абавязковым падчас сватання ў Курскай і Варонежскай абласцях з’яўляўся рытуал “саджэння свахі на печ” у сувязі з будучай роднасцю. Асаблівасцямі вяселля ў паўднёварускіх рэгіёнах з’яўляліся мясцовыя традыцыі ўласнай падрыхтоўкі нявестай адзення для жаніха. “Пропой” – так называўся адзін з перадвясельных этапаў на поўдні Расіі, ідэнтычны гэтаму абрадаваму моманту беларускія запоіны. “Но по старинным обычаям, в отличие от современных, ни жениха и его товарищей, ни невесту и ее подруг на пропой не приглашали” [10, с. 32].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асобнай гаворкі заслугоўвае вясельная абраднасць Сібіры, у якой адлюстраваліся элементы вяселля розных этнічных традыцый, напрыклад, у в. Максімаўка Цюкалінскага р-на, дзе кампактна пражывалі чалдоны-старажылы, украінцы, немцы і бранскія перасяленцы з Суражскага р-на, які мяжуе з Беларуссю. Што датычыць апошніх, то яны складалі пераважную большасць сярод жыхароў в. Максімаўка. Адметнасць вяселля, якую захавалі бранскія перасяленцы, – гэта другі дзень пад назвай "клад" – "ряженый, на которого надеты были вывернутые шубы, рваное тряпье, а по всем карманам и углублениям насыпаны мелкие деньги" [7].

Калі бацькі нявесты давалі дазвол на шлюб, то дазвалялі сватам пакласці хлеб. Выконваліся заручынныя песні, якія мелі тыя ж матывы, што і песні заручын у беларусаў. Цікавы звычай пад назвай "парить жениха" адбываўся напярэдадні "дзявічніка". Сутнасць яго заключалася ў наведванні жаніха дзяўчатамі (дружкамі маладой), якія прыносілі яму і свякрусе падарункі. Трэці дзень вяселля быў вядомы пад назвай "лавки мыть": "Мало кто из гуляк успокаивался на третий день: с утра шли к невесте – лавки мыть, – опять же требовали угощения. Потом отправлялись по дворам тех, кто гулял первые два дня, требовали с них кур и в случае отказа грозились передушить всех, кого поймают. Собранных птиц несли молодой, одну рубили на куриную лапшу и опять гуляли" [7].

Калі паўночнарускае вяселле было драматычным па сваёй агульнай скіраванасці (пераважалі галашэнні ў яго структуры), то сярэднерускі тып вяселля вызначаўся спалучэннем песень і галашэнняў, аднак выконвалася найбольшая колькасць песень.

Па сутнасці можна вылучыць такія ж тыпы і ў беларускай вясельнай абраднасці. Паводле слушнай заўвагі З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеевай, "агульнабеларуская песенная культура праяўляе сябе ў сукупнасці мясцовых песенных традыцый пяці этнакультурных рэгіёнаў: паўночнага (Паазер'е), паўднёвага (Гомельскае і Брэсцкае Палессе), усходняга (Падняпроўе), заходняга (Панямонне), цэнтральнага (Міншчына)" [11, с. 3].

Рытуалы з вясельным хлебам характэрны для вяселля ўсходніх славян. На тэрыторыі Рускай Поўначы ён называецца "банник", у цэнтральных і паволжскіх рэгіёнах – "курник", на тэрыторыі Украіны і Беларусі – "каравай, калач". Варта адзначыць, што і ў месцах акрэсленых рэгіёнаў можна вылучыць яшчэ і лакальна акрэсленыя зоны вясельнай спеўнай культуры. Матэрыялы па рускай вясельнай абраднасці даюць падставы сцвярджаць, што класічны рускі вясельны абрад – складаны комплекс, які аб'яднаў элементы вяселля розных тыпаў, характэрных для рэгіёнаў Расіі.

Па матэрыялах мінулага стагоддзя і сучасных звестках можна меркаваць, што на тэрыторыі Палесся былі распаўсюджаны тыповыя для Украіны і Беларусі формы бытавання вясельнага фальклору. "Жанравы склад традыцыйнага фальклору Палесся ў асноўным характарызуецца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рысамі, агульнымі для народна-паэтычнай творчасці ўсіх усходніх славян. Але суадносіны яе жанрава-тэматычных цыклаў і відаў, функцыянальнасць, інтэнсіўнасць бытавання і развітасць асобных з іх адрозніваюцца пэўнай рэгіянальнай своеасаблівасцю або, дакладней сказаць, шматстайнасцю мясцовых выразаў" [12, с. 248].

Традыцыйная вясельная абраднасць і паэзія палешукоў па змесце і настраёвасці цесна звязаны з асноўнымі этапамі і рытуаламі вясельнага дзейства.

Як адзначыў даследчык В.І. Ялатаў, "сам вясельны абрад ва ўсіх зонах рэгіёна амаль адзін і той жа. Асабліва варта вылучыць рытуал сімвалічнага выкупу нявесты, які захаваўся паўсюдна. Вельмі ўстойлівы таксама момант збору сяброўак нявесты на вячэрні дзявочнік і абрад "пасада". І разам з тым, мы не сустрэлі вёсак з абсалютна аднолькавым сцэнарыем вясельнага абрада і рэпертуарам вясельных песень. У кожным выпадку маюцца свае мясцовыя асаблівасці ў выкананні гэтага даволі складанага рытуальнага дзейства, нюансы, якія сталі ўжо традыцыяй для дадзенай вёскі і прадугледжваюць строгую паслядоўнасць і пунктуальнасць іх выканання" [13, с. 41].

Заўважым, што па структуры вясельны абрад украінцаў мае падабенства да вяселля рускіх і беларусаў. "Як виглядав увесь весільний обряд у княжні часи, про це знаемо небогато. Ще тепер українське весілля збереглося у старовинних формах із традиційними звичаями й піснями. Можемо здогадуватися, що в давні часи ці обряди були ще болше різнорідні й мальовничі, і що більше – кожній обряд мав тоді свое реальнее значение, був зрозумілий для всіх. Із весільних установ, які тепер ще живуть у народі, лиш де які згадуються у княжні часи" [14, с. 30-31].

Асноўныя структурныя моманты ўкраінскага вясельнага абраду наступныя: "сватання", "заручини", "вільце", "коровай", "вінчання", "весілля", "комора", "перезва". Звернемся да характарыстыкі асобных абрадавых этапаў. Напрыклад, калі маладая згодна на шлюб, то "в час сватання колупае піч" (в. В. Доч Барзнянскага р-на Чарнігаўскай вобл., ад Крыўды Ганны Паўлаўны, 1931 г.н.). Свата, які быў галоўным персанажам на вяселлі, у мясцовай традыцыі называлі старастам і ён звычайна "домовляеться, плете котели". Калі нявеста давала згоду на шлюб, то ставіла "могорич", калі ж не згодна была, то "підносить гарбуз".

Сватанне на тэрыторыі Украіны, як і ў беларусаў і рускіх, адбывалася ў жартаўлівай іншасказальнай форме: "Постукавши у вікно, вони просять, щоб їх пустили до хати, посилаючись на пізню годину та на сваю втому з дороги. В хаті починаеться нарада, чи впускати, чи не пускати, і, звичайно, верішують питання позитивно. Жених з дружком зостаються завше в сінях та починають розшукувати наречёну, що її мати обачно вже вислала з хати, а старости входять до хати та, після звичайного привітання, виймають з мішка хліб, цілують його та віддають господареві. Той також цілуе хліб та

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кладе його на стіл і питається старостив, хто вони такі та куді йдуть. Тоді старости починають оповідати небувалу історію, що нібы вони мисливці, гнали куницю та запримітили, шо вона сховалась у цій хаті, та що вони батають знайти її... Ім одповідають висловом недовір'я та пропонують іти соби геть по-доброму. Тоди старости проголошують, що сила на їхньому боці, бо вони в запасі мають ще двох козаків у сінях, та кличуть жениха з дружком. Ті входять і тягнуть за собою й наречену, що відповідно противиться такому насильству" [15, с. 195-196].

Як у рускіх і беларусаў, падчас сватання ва ўкраінскіх вёсках, калі дасягалася дамоўленасць аб шлюбе, то ўсіх сватоў (стараст) перавязвалі ручнікамі ("пов'язуе ними старостів через плече"), а жаніху "затикае вишивану хустку за пояс".

Асноўныя рытуалы ўкраінскіх заручын, якія ў адрозненне ад сватання, маюць найбольш важнае значэнне, наступныя: рытуальны дыялог паміж сватамі, перавязванне іх ручнікамі, выкуп, благаслаўленне маладых хлебам, пасад маладых (на покуці), выкананне заручынных песень, абмен падарункамі паміж бацькамі жаніха і нявесты, частаванне (калі малады застаецца ў доме маладой, то маці маладога "сцелить їм постіль, визнаючи вже цим право жениха заставатися з її дочкою").

Напярэдадні вяселля ў хаце маладой пачынаюць рыхтаваць "вільце" або "гільце". "Так звуть конче зелену (зимою з хвої) гілку або маленьке деревце, що його втикають у хліб та прикрашають усім, що можна мати на той час: пучечками з ріжних квітів, з грабини, калини, барвінку, рути..." [11, с. 197].

Падрыхтоўка "вільца" адбываецца ўрачыста, суправаджаецца шматлікімі рытуаламі і песнямі, мае ярка выражаны рэлігійны характар: "Гільце ставлять на кінці столу, і воно зістаеться там ціле весілля, а в гуцулів його носять скрізь перед молодими" [11, с. 197]. Адначасова з падрыхтоўкай вельца, уюць і вянкі для маладых у суправаджэнні рытуальных песень.

У рускім вяселлі, асабліва ў яе паўночным варыянце, такі вясельны момант, як "дзявочнік", складаўся з наступных структурных элементаў: падрыхтоўка "красоты" ("воли") – маглі быць кудзеля, дрэўца, вянок, хустка, лента. "Для цэнтральных і паўночных абласцей Расіі характэрна выкарыстанне ў гэтай ролі дрэўца, ленты, кудзелі, для Украіны і паўднёвых абласцей – вянка, павязкі, гільца" [8], расплятанне касы, мыццё нявесты ў лазні, знішчэнне або перадача "красоты" сяброўцы ("жаніху"), частаванне ўдзельнікаў абрада з боку жаніха. Падкрэслім, што ва ўкраінскім вяселлі развітанне з "калінай", расплятанне касы адбывалася ў дзень вяселля, напярэдадні ад'езду да вянца.

Вясельны абрад украінцаў, як і беларусаў, на тэрыторыі Палесся вызначаецца тым, што адбываецца па "каравайнаму тыпу". "Коровай – це святий хліб, що мае велике ритуальне значення та безперечно жертовний

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

характер; його назва дуже близька до санскритського слова kravya, …латинского – саго, а всі ці слова означають м’ясо (сюди стосуються теж слова крава, корова, кров, krew тощо); ця назва натякае на те, вдо його вживають замисць тварин, яких колись приносили в жертву” [15, с. 198]. Адметнасць ва ўпрыгажэнні каравая датычыць “вырабу з цеста галубоў”.

Сам каравайны абрад, як і беларускі, уяўляе сабой комплекс рытуальных дзеянняў, звязаных з этапамі падрыхтоўкі і выпечкі-каравая. Як пацвердзілі ў вёсцы В. Доч Барзнянскага раёна Чарнігаўскай вобласці, “перед весіллем печуть коровай, всю роботу робіть щаслива жінка, щоб і ця дівчина була щасливою. Печуть багато шышок/уточок” (Запісана ад Крыўда Ганны Паўлаўны, 1931 г.н.). У мясцовай традыцыі падрыхтаванае “вельца” (галінкі вішні) ставілі ў чорны хлеб, упрыгожвалі кветкамі, лентамі. “Коровай і вільце стоять перед молодими. Потім віткі й з квітамі (вільце) роздають гостям, дітям, вмісті з короваем” (в. В. Доч Барзнянскага раёна Чарнігаўскай вобласці).

Адным з рытуалаў, які адбываўся напярэдадні вяселля, з’яўляўся рытуал расплятання касы. Калі ў рускай вясельнай абраднасці звычайна касу расплятали родзічы нявесты і яе сяброўкі, іншы раз (у Арлоўскай і Пскоўскай губернях) выконваў гэты рытуал жаніх, то на тэрыторыі Украіны гэтае дзеянне выконваў “дружок” маладога, а сяброўкі “змазвалі валасы маслам” [8]. Захаваліся звесткі, што на Валыншчыне бытаваў звычай “адразання” часткі касы нявесты жаніхом: жаніх павінен быў адным ударам сякеры адсекчы канец касы, прыбіты цвіком да сцяны. У іншых раёнах Украіны практыкавалася сімвалічнае адразанне касы: дружка клаў касу на палку, а староста тройчы праводзіў нажом па ёй.

Адметнасць беларускага абраду расплятання касы звязана з “падсмальваннем валасоў”, а таксама з тым, што сімвалічныя дзеянні з касой адбываліся, калі маладая сядзела на пасадзе. Даследчыкі М.В. Доўнар-Запольскі і Н.М. Нікольскі супастаўлялі пасад жаніха з абрадамі ініцыяцыі, а пасад нявесты звязвалі з ідэяй пладавітасці, увасабленнем якой з’яўляліся дзяжа і зерне.

Каравай з’яўляецца шматзнакавым сімвалам. Даследчыкі А.А. Патабня, М.Ф. Сумцоў, Н.М. Нікольскі і інш. выявілі такія значэнні каравая, як яго сувязь з ідэяй урадлівасці, дастатку, багацця; выкарыстанне ў якасці ахвяры, увасабленне шчасця і долі, сувязь з вобразамі жаніха і нявесты, сонца і месяца, з канцэпцыяй сусветнага дрэва.

Актуалізацыя значэння каравая як сімвала долі звязана з яго падзелам і каравайнымі пажаданнямі. Калі вянок (“красота”) – сімвал дзявоцтва, волі, то каравай – сімвал новай долі. “Сіметрычна таму, як на першым этапе вяселля “девья красота” дзеліцца паміж сяброўкамі (прадстаўніцамі малодшай групы), то на другім этапе каравай дзеліцца паміж прадстаўнікамі старэйшай групы, у якую ўваходзяць і маладыя. Узоры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каравайных пажаданняў, запісаных на Чарнігаўшчыне, блізкія да рускіх і беларускіх тэкстаў:

"Дарую троячку, щоб купили конячку, // да не ту конячку, що пасеться, // а що "жигулями" заветься"; "Дарую вінок цібулі, щоб молода свекрусі не давала дулі"; "Дарую рядно сіна, щоб молода верхи на молодого сіла" і інш.

Адметнасцю ўкраінскага вяселля з'яўляюцца тэатралізаваныя гульнёвыя дзеянні:

- глиною замазують висна;
- матер молодої катають на возку, вона частуе всіх горілкою;
- підкідають у гору кума, куму, родичів;
- куль молотять (солому);
- курятнікі несуть молодий курку, йдуть з пустою корзиною у квітах. Іх обшукують, не пускають. Як шо комусь таемно удасться пронесті курку і кинути під піч, то ця курка буде молода (Запісана ў в. В. Доч Барзнянскага раёна Чарнігаўскай вобласці ад Крыўда Ганны Паўлаўны, 1931 г.н.).

Калі маладую забірае малады, то каля варот раскладаюць агонь, праз які павінны пераехаць маладыя. На Чарнігаўшчыне ў вёсцы В. Доч Баразнянскага раёна "молода встае на возі і розбівае аб землю стакан з зерном". Як і ў беларусаў і рускіх, поезд маладых сустракае ў сябе на падвор'і маці маладога з хлебам і соллю. У класічным украінскім вяселлі гэты структурны абрадавы момант вядомы пад назвай "комора".

Заключным акордам украінскага вяселля з'яўляецца "перезва": "У дійності перезва починається вже з посольства до матері молодої з повідомленням про щасливий вислід шлюбної ночі" [15, с. 208].

Звесткі пра ўкраінскі вясельны абрад яскрава дэманструюць два яго накірункі: гісторыка-драматычны і рэлігійны. Першы накірунак выражаецца ў такіх рытуалах, як "зборы до походу, феодальні відносини, сутички з родам молодої тоўо, а дали, не маючи змоги захопити молоду силою, – мирові пересправи, що кінчаються згодою – викупом молодої; потім знову йдуть насільницькі вчинки: грабіж пасагу, відвезения молодої з особливим підкресленіям її чужоплеменного походження у формі обовязкового мовчання тощо" [15, с. 209].

Рэлігійнымі кампанентамі вясельнага абраду з'яўляюцца "співи, прикрашания гільця, вживання вінків та особливо печення короваю з молитовним звертанням до сонця, мисяця та до зірок тощо" [15, с. 209].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 2 Традыцыі вясельнай абраднасці беларусаў

Структура вясельнай абраднасці Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ўключае такія асноўныя абрадавыя этапы, як пярэпыты і сватанне, каравай, пасад, вяселле ў хаце нявесты, ад'езд дружыны да хаты жаніха, вяселле ў хаце жаніха, дзяльба каравая, паслявясельная частка (пярэзвы, "пярэводзіны", "адведкі"). На Століншчыне давясельная частка складаецца з двух этапаў – пярэпытаў і сватання. Адзначым, што такі абрад, як пярэпыты, практычна сёння не існуе, бо маладыя самі вырашаюць пытанне аб згодзе на шлюб, а бацькі ўдзел у гэтым не прымаюць. Што датычыць сватання, то, напрыклад, у вёсцы Рубель Столінскага р-на малады прыходзіў у хату да сваёй абранніцы і нёс для ўсёй сям'і маладой "пасталы" (лапці), якія кідаў на сярэдзіну хаты і гаварыў: "Ці подобненькі постолікі?". Калі дзяўчына згодна выйсці за яго замуж, то казалі: "Подобенькі". Пасля гэтага хлопец пасылаў сваіх сватоў да бацькоў дзяўчыны. Старэйшага свата ў мясцовай вясельнай традыцыі называлі "татусём". Падчас сватання мелі месца такія рытуалы, як рытуал благаслаўлення нявесты з боку бацькоў і рытуальны дыялог паміж бацькамі маладых. Сватанне ў вёсцы Гальцы Столінскага р-на суправаджалася песняй "Ой, у полі бярозанька развіта". Адзначым, што са сватаннем, якое адбывалася ў жартаўлівай форме і суправаджалася цікавымі іншасказальнымі дыялогамі, быў звязаны на Гомельшчыне і на Брэстчыне рытуал выкупу нявесты: "Звычайна радня са стараны маладой нявесту хавае і паказвае падстаўную, затым пасля выкупу выводзяць сапраўдную" (в. Грабяні Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бацькі нявесты заўсёды прасілі выкуп: "Дасце карову, бочку зерня, пярыну, аддамо нашу дачку" (в. Маневеж Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.).

Уласна вяселле на Століншчыне пачыналася з замешвання цеста на каравай і з яго выпечкі. Кожны этап каравайнага абраду суправаджаўся ў строгай паслядоўнасці з прыгатаваннем абрадавага хлеба тэматычна звязанымі паміж сабой песнямі. У вёсках Харомск і Рубель рыхтавалі два караваі: адзін у нявесты, а другі – у жаніха. У названых вёсках выконвалі рытуал абменьвання караваямі, якія выпякалі ў форме месяца. У хлебе-караваі, паводле павер'яў, быў увасоблены Бог продак, таму невыпадкова ў каравайных песнях прасілі яго прыйсці "з неба каравай учыняці, замясіці...":

*Спуціса з неба,*
*Ты цепэр нам трэба,*
*Сядзь дэй на покуцці,*
*Будзь нам дэй до помачы,*
*Посвэці нам з гаю,*
*Дэй до нашого короваю,*
*Посвэці яснэнько,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Шчоб было светленько* (в. Рубель).

Ідэя ўрадлівасці аб'ядноўвае цэлую групу каравайных песень і рытуалаў, якія выконваліся з мэтай магічнага ўздзеяння на раслінны свет, каб атрымаць багаты ўраджай.

Абрад выпечкі і ўпрыгожвання каравая на Століншчыне захоўвае агульнатрадыцыйную вясельную аснову, аднак, выяўляе і адметныя рэгіянальныя асаблівасці: выпечка караваяў у выглядзе "месяцаў", рытуал абменьвання імі з боку маладых, цікавыя павер'і, звязаныя з выпечкай і ўпрыгожваннем каравая. Адметным у структуры вяселля Брэсцкага Палесся быў і абрад пасада, які пачынаўся з "прыбірання нявесты": звычайна яе "ўбіралі дружкі", садзілі на дзяжу, пакрытую аўчынай, і ў гэты час прысутныя выконвалі песню:

*Не тоскуйце, дзеўкі, вы по мне,*
*Позбірайце краскі вы мое,*
*Краскі мое да позбірайце,*
*У пучэчкі повязайце,*
*Вейце вэнкі шчо недзеленькі,*
*Успомінайце шчо годзіноньк*і (в. Беражное).

Зазначым, што на Століншчыне адбываўся толькі абрад пасада маладой, "маладога на пасад у нашай мясцовасці не садзілі". Перад тым, як ехаць да маладой, малады і яго дружына садзіліся за сталы, а пасля "скідвалі грошы маладому на шчаслівую дарогу" (в. Харомск).

Адметнасцю вяселля на Століншчыне з'яўляецца і такі факт: перад тым, як ехаць у царкву, маладых садзілі на пасад разам. Прычым, заключнай часткай пасаду было рытуальнае пакрыванне галавы маладой хусткай, ручніком, або кавалкам палатна. Перад ад'ездам у царкву бацькі маладой тры разы "пераходзяць дарогу з хлебам і соллю". Пры гэтым сваты выконваюць песню:

*Постой, зяцю, хоць хвілінoньку,*
*Подзіўлюса на дзецінoньку.*
*Трэба было не хваліціса,*
*Посадзіці дэй дзівіціса,*
*Ой, мы её не хваліліса,*
*Не садзілі, не дзівіліса* (в. Беражное, в. Харомск).

Надзвычай сціплыя звесткі пра пасад пададзены ў кнізе "Палескае вяселле" (Мн., 1984). Што датычыць апісанняў гэтага моманту на Брэстчыне, то яны, на наш погляд, не адрозніваюцца багаццем рытуалаў і адпаведных песень. Як адзначыла Г.П. Труш з вёскі Маневеж Драгічынскага р-на, "замест пасада існаваў абход стала. Перад вянчаннем жаніх гэта рабіў у сваёй хаце, нявеста ў сваёй, у асноўным у той жа дзень раніцай. Пасярод – стол, на стале – хлеб, соль, абраз. Сядзяць маці і бацька.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Жаніх абходзіць стол тры разы, цалуе хлеб, абраз і развітваецца з бацькамі. Нявеста робіць тое ж самае ў сябе ў хаце".

Падчас вяселля ў хаце маладой выконваюцца наступныя абрады, якія сімвалізуюць яднанне маладых: цалаванне маладых, абмен падарункамі паміж "радамі", "успавіванне" маладых, спажыванне агульнай рытуальнай стравы. Сярод гэтых рытуалаў асабліва вылучаецца рытуал "успавівання маладых", які быў запісаны ў в. Беражное: "Хросная маці з наміткою ў руках подыходзіць до молодых і кажэ: "Сватовэ, пановэ, позвольце нашых молодых усповіць". Вона бэрэ намітку, абкручвае её вокруг голоў молодых і кажэ: "Пэршы род, другі род, трэці род – усяго гарод". После гэтого намітку вешають на печ у хаце маладой" (в. Беражное). Прыведзены абрад суправаджаецца песняй-ілюстрацыяй:

*Успавівшініца скачэ,*
*Ой, наша молодая плачэ.*
*Ой, дзеўкі, дзеўкі, вы мое,*
*Позбірайце краскі вы мое,*
*Краскі мое позбірайце,*
*У вэночкі позвівайце.*
*Вейце вэночкі шчо суботанькі,*
*Успомінайце шчо недзеленькі* (в. Беражное).

Вяселле ў хаце маладой уключае такія рытуалы, як рытуал абмену падарункамі паміж дружкамі маладога і маладой і рытуал адорвання падарункамі сватоў.

Напярэдадні вяселля ў хаце жаніха адбываліся такія абрадавыя сімвалічныя дзеянні, як сустрэча маладых не толькі бацькамі жаніха, але і іншымі запрошанымі на вяселле гасцямі, благаслаўленне маладых, абсыпанне іх хмелем і жытам, рытуал запрашэння бацькам жаніха маладых за вясельны стол.

Для паслявясельнай часткі Брэстчыны характэрны такія тэрміналагічныя назвы, як "пярэзвы" (в. Беражное), "пярэводзіны" (в. Харомск), "адведкі" (в. Рубель). Сутнасць такіх абрадавых момантаў адна і тая ж. Узаемнае наведванне бацькоў маладых адбываецца праз пэўны час пасля вяселля. На пачастунак запрашаюцца блізкія сваякі. Спачатку маладыя разам з бацькамі жаніха і яго родзічамі ідуць да бацькоў нявесты ў першую нядзелю пасля вяселля. Нявеста да гэтага дня не мае права наведваць сваіх бацькоў. На наступны дзень са сваёй часткай каравая да бацькоў жаніха "на перазоў" ідуць бацькі і родзічы нявесты.

На Брэстчыне другі дзень вяселля з'яўляецца самым вясёлым днём, калі госці нявесты з яе "прыданым" ехалі ў перазоў да жаніха (в. Дружылавічы Іванаўскага р-на, Дземянцей Л., Навумавец В. у 1981 г.). Гэты абрадавы момант блізкі па назве, абрадавых дзеяннях да паслявясельнай часткі на Гомельшчыне, якая ў некаторых вёсках мела нават назву "пярэзвы". На другі дзень вяселля ў мясцовасцях Гомельскай вобласці госці жаніха

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

збіраліся ехаць да нявесты. У гэты дзень адбываліся такія рытуалы, як сустрэча маладога і яго дружыны цёшчай, абсыпанне зернем нявесты, торг паміж дружкамі жаніха і дружкамі нявесты, выкуп нявесты і яе прыданага дружынай жаніха, развітанне маладой з бацькамі, сустрэча маладых у хаце маладога яго бацькамі, частаванне жанчын-прыданак.

Трэці дзень вяселля звязаны з дзяльбой каравая і на Брэстчыне, і на Гомельшчыне. Як было адзначана вышэй, абодва караваі на Гомельшчыне дзеляць, як і пякуць, паасобку, а на Брэстчыне "на стол ставяць каравай жаніха і нявесты" (в. Маневеж Драгічынскага р-на).

Умоўна вылучаная паслявясельная абраднасць беларусаў Брэсцкага Палесся сімвалізавала далучэнне нявесты да новага сямейнага ўкладу жыцця, забеспячэнне шчаслівага жыцця маладым, пажаданне працягу роду. З гэтай часткай звязаны шэраг рытуалаў ачышчальнага характару, накіраваных на ахову дома ад уздзеяння злосных духаў, звышнатуральных істот.

Структура вясельнай абраднасці Брэсцкага Палесся ў асноўным супадае са структурай агульнабеларускага вяселля, а таксама ў некаторых абрадавых момантах вылучаецца спецыфічна адметнымі рысамі, якія закранаюць розныя ўзроўні: сістэму вобразаў, прыкмет і павер'яў, міфалагічных вераванняў, кампазіцыю, вербальна-песеннае суправаджэнне.

"Асноўныя вясельныя абрады супадаюць ва ўсіх мясцовасцях Беларусі. Адхіленні датычацца галоўным чынам мясцовых асаблівасцей. Напрыклад, у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна каравай пякуць, а потым дзеляць толькі ў доме жаніха. У доме нявесты пякуць прадаўгаватыя пірагі, абвітыя пляцёнкай з цеста (у выглядзе дзявоцкай касы). Гэтыя вясельныя пірагі называюцца вярчамі. Калі маладая пакідае родны дом, яна бярэ верч з сабой, а ў доме жаніха кладзе яго на печ. У пэўны час верч называецца снеданнем. Па звычаю, раніцай на другі дзень вяселля радня маладой (хросная маці, цёткі, замужнія сёстры) вязе да яе матчына снеданне, у якое абавязкова ўваходзіць верч" [20, с. 53].

Сваё рэгіянальныя адметнасці мае вяселле і ў такіх рэгіёнах Беларусі, як **Магілёўшчына і Віцебшчына**. Звернемся непасрэдна да структуры вясельнай абраднасці на Магілёўшчыне. Адзначым, што асноўныя структурныя моманты вяселля – гэта заручыны, вечаруха, каравай, прыезд дружыны жаніха па нявесту, пасад, вянчанне, абрад "дарэння", развітанне нявесты з родным домам, вяселле ў хаце маладога, другі і трэці дні вяселля. Абрадавы момант заручыны (запоіны) адбываўся, калі была дасягнута дамоўленасць сватоў. На заручыны ўсю сваю радню павінна была запрашаць сама нявеста. Сярод асноўных рытуалаў гэтага вясельнага этапу можна назваць такія, як адорванне нявестай радні жаніха ручнікамі і палатном, адорванне жаніхом сваёй абранніцы грашыма, выкананне адпаведных песень, у якіх знайшла адлюстраванне абрадавая сітуацыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заручын (“На заручыны пазвалі”, “Да прапойнічак-татка” (в. Малыя Бортнікі Бабруйскага раёна), “Заручанкі-закручанкі, Бог нам даў” (в. Бяседавічы Хоцімскага раёна). Тэрмінам “вечаруха” на Магілёўшчыне, у прыватнасці ў Хоцімскім раёне, называлі развітальны вечар, які ладзілі жаніх і нявеста для сваіх сяброў напярэдадні вяселля. Атмасфера незвычайнай эмацыянальнай псіхалагічнай напружанасці адлюстравалася ў песнях, якімі суправаджаўся гэты абрадавы этап: “Станьця, дзевачкі, у кружку”; “Хадзіла Манечка па расе”; “Дзевачкі мае, прыдзіце ка мне” (в. Ліпаўка Хоцімскага раёна).

Свае рэгіянальныя адметнасці меў абрад пасаду на Магілёўшчыне. Напрыклад, у Слаўгарадскім раёне “нявесту, апрануўшы ў вясельны ўбор, вялі на пасад, г.зн. садзілі на кажух за сталом, які стаяў каля ганка, і з ёю разам падвянесніц: госці дарылі маладую, пасля дзялілі каравай. У Быхаўскім раёне на пасад нявесту вялі падвянесніцы пасля прыезду жаніха па загаду яе старшага брата. У Мсціслаўскім раёне пасад абоіх маладых адбываўся разам у хаце нявесты перад вянчаннем: іх абводзілі тры разы вакол стала і садзілі на кут на кажух” [21, с. 65].

Каравайны абрад на Магілёўшчыне быў развіты не ва ўсіх раёнах. Напрыклад, у Мсціслаўскім і Хоцімскім раёнах каравайных песень не выконвалі, хаця каравай абавязкова прысутнічаў на вяселлі. У Слаўгарадскім і Быхаўскім раёнах існаваў разгорнуты каравайны абрад: “каравай гатавалі хросныя маці маладых, якім дапамагалі сваячкі жаніха ці сяброўкі нявесты, пяклі каравай у суботу, напярэдадні вяселля”. Выкананне каравайнага абраду ў Бабруйскім, Асіповіцкім і Глузскім раёнах суправаджалася каравайнымі песнямі. Паслявясельная частка на Магілёўшчыне ў асноўным мела назву “цыганы”.

Вясельная абраднасць на Віцебшчыне пачыналася з абраду сватання. Напрыклад, у вёсцы Васіліны Пастаўскага раёна пры ўмове згоды нявесты на шлюб, напітак, які быў прынесены сватамі, пералівалі ў пустую бутэльку, якую дзяўчына ўкручвала ў пояс, а затым надзяляла ўсіх сватоў тонкай ільняной тканінай. Абрадавы момант сватання ў гэтай мясцовасці меў яшчэ назву першыя заручыны, у час якіх вясельныя песні не спяваліся. Другія заручыны, як правіла, адбываліся ў наступную суботу і суправаджаліся песнямі: “Прапіла маці дачку”. У час зборнай суботы “маладая разлівала ваду, якой быў паліты яе вянок, у сподачкі, і сяброўкі выпівалі, каб хутчэй выйсці замуж”. Абрад пасаду ў маладога і маладой выконваўся аднолькава. Розніца толькі была ў тым, што ў нявесты ён суправаджаўся песнямі, а ў жаніха песні не выконваліся. Абрад адорвання маладых адбываўся двойчы: у нядзельную раніцу пасля пасада і ў час вясельнага застолля. Пасля заканчэння абраду вянчання фату маладой накідвалі на дзяўчат, якія стаялі побач, “каб яны не заседзеліся ў дзеўках”. Калі сустракалі бацькі маладых, то на ганку рассцілалі кажух, на які маладыя станавіліся, “каб багата жылі, і вадзіліся авечкі”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У вёсцы Гомель Полацкага раёна Віцебскай вобласці напярэдадні вяселля бацька або брат маладой ішлі ў лес і высякалі маленькую ёлачку, якую затым упрыгожвалі і ўтыкалі ў каравай, які рыхтавалі ў хаце маладой. Адметным быў той факт, што ў гэтай мясцовасці рыхтавалі вялікі каравай для маладой і маленькі каравай жаніху. Калі каравай маладой упрыгожвалі, то каравай жаніха “не ўкрашалі”. Цікавым момантам у вясельнай абраднасці вёскі Шумацёнкі Полацкага раёна з’яўляўся такі, як “закідваць маладую”: “Сваты хустку на маладуху кідаюць. Калі закінуць – тады бясплатна яе забіраюць”. У вёсцы Смалькі Гарадоцкага раёна, калі дзяўчына не жадала выходзіць замуж, то яе сяброўкі плялі гарохавы вянок і “надзявалі на няўдалага жаніха”. Структура вясельнай абраднасці ў вёсцы Міхасёнкі Міёрскага раёна складаецца з такіх абрадавых момантаў, як сватанне, вяселле ў хаце маладой, прыезд дружыны маладога да нявесты (“Косю, з двара, з двара”), ад’езд маладых да хаты маладога, вяселле ў хаце маладога. Цікавай была пaслявясельная частка ў вёсцы Слабодка Браслаўскага раёна. Бацькоў “маладухі госці садзілі на барану і адвозілі ад дома, а маладуха павінна была выкупіць свёкра і свякроўку гарэлкай”.

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы па вясельнай абраднасці Віцебскай вобласці былі зафіксаваны ў такіх мясцовасцях, як вв. Сваціца, Бікульнічы, Гомель, Шумацёнкі Полацкага раёна; в. Смалькі Гарадоцкага раёна; в. Станюкі Сенненскага раёна; в. Міхасёнкі Міёрскага раёна; вв. Слабодка, Далёкія Браслаўскага раёна; в. Баброва Лепельскага раёна; в. Народзіна Расонскага раёна. Традыцыі вясельнай абраднасці на Магілёўшчыне былі зафіксаваны ў в. Лапічы Асіповіцкага раёна; в. Цёмны Лес Дрыбінскага раёна; в. Макранскія Хутары Быхаўскага раёна; в. Малыя Бортнікі Бабруйскага раёна; в. Ліпаўка Хоцімскага раена; в. Лютня Мсціслаўскага раёна.

Вясельная абраднасць і паэзія **Мінскай вобласці** вылучаецца таксама непаўторнымі рысамі, якія датычаць як асобных структурных элементаў, так і сістэмы міфалагічных прыкмет і павер’яў. Для сватання характэрны традыцыйны рытуальны дыялог паміж бацькамі жаніха і нявесты. Адметнасцю давясельнай часткі былі такія этапы, як малыя і вялікія запоіны, з якімі быў звязаны рытуал дамоўленасці наконт пасаду.

Заключным этапам давясельнай часткі быў этап заручын, сярод рытуалаў якіх можна назваць рытуал абвязвання ручнікамі сватоў, абменьванне падарункамі, вызначэнне тэрміна вяселля. Уласна вяселле, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, пачыналася з замешвання цеста на каравай. У некаторых вёсках Міншчыны адбываўся гэты рытуал у дзень вяселля, а ў некаторых месцах – у зборную суботу.

У в. Сяргеевічы Пухавіцкага раёна абрад “каравая” пачынаўся “з благаслаўлення на каравай”, калі садзілі яго ў печ, таксама прасілі благаславення.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зборная субота – важны абрадавы этап вяселля, абавязкова рабілі вяночак, вышывалі ручнікі, спявалі песні. Найбольш развіты гэты этап ва ўсходняй частцы Мінскай вобласці.

Вяселле ў маладой і маладога пачыналася адначасова. Калі маладая збіралася з маладым ад’язджаць да яго, то апраналася ў суседняй хаце, у в. Азерыцкая Слабада Смалявіцкага раёна абавязкова “выкуплялі ўваход у хату і кветкі”.

Пасад нявесты ў в. Шчэса Вілейскага раёна ўключаў такія элементы, як пакрыванне дзяўчыны матэрыяй, падстрыганне і падсмальванне валасоў, заплятанне касы дзяўчыне (звычайна гэта рабіла шаферка). У в. Ракаў Валожынскага раёна, паводле ўспамінаў М.М. Набароўскай, пасад адбываўся наступным чынам: “Пачыналі ад таго, што слалі на стале абрус і спускалі яго на пол – чым даўжэйша, аж да дзверы… Колькі хватала. А на стале ставілі абраз, часцей Матку Боску ці Мікалая-цудатворца. А пры абразе свечкі палілі. І з боку пры абрусе ставілі калоду дубовую, а як не было дубовай, то хоць якую. Калоду прыносіў бацька і слаў на яе кажух аўчынай дагары. Маладую заводзілі цераз дзверы, яна кленчыла пры стале перад абразом і малілася. Тады да яе падыходзіў брат, браў за касу і вёў да калоды, што і з кажухом. Ён садзіў яе на кажух, яна падбірала ногі, каб на зямлі не стаялі, а ён у той час нешта казаў шэптам” [22, с. 179].

Пасля абраду вянчання на застоллі ў в. Азярыцкая Слабада выконвалі велічальныя песні кожнаму хлопцу і дзяўчыне з дружыны маладога. Калі адпраўляюць маладую да маладога, то адорваюць яе “на каравай”, першымі адорвала маці, бацька, родныя. Распаўсюджаным звычаем на Міншчыне быў звычай абсыпання жытам маладых (в. Азярыцкая Слабада Смалявіцкага раёна).

Вяселле ў маладога “ідзе сваім ходам, калі прыязджаюць маладыя, ім перагароджваюць дарогу. Нявеста павінна стаць на дзяжу”, затым адбываецца адорванне маладой свякрухі.

Абрад завівання маладой – неад’емны этап вяселля ў хаце маладога, калі “маладую пераводзілі ў жаноцкі стан”, выконваючы пэўныя сімвалічныя дзеянні. Прывядзем прыклад сучасных фальклорна-этнаграфічных звестак пра вясельны абрад у в. Кішчына Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

Сватанне адбывалася ў традыцыйнай форме, меў месца іншасказальны рытуальны дыялог, звязаны з купляй-продажам цялушкі. Падчас сватання адбываўся пасад (калода, пакрытая вывернутым кажухом). Калі садзілі на пасад, выконвалі песню: “Благаславіце нашу маладую княгіню, // На пасадзе сесці, на шчаслівым месце, // Русы валасы пастрыгчы. // Бог благаславіць”.

Адметным мясцовым звычаем быў такі звычай, як выкладванне з тоўстага шнура на галаве маладой крыжа з выкананнем песні “Благаславі, Госпад Бог”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вясельны абрад у вёсцы Выдрыца Крупскага раёна Мінскай вобласці складаўся з такіх абрадавых этапаў, як сватанне, запоіны, зборная субота, вянчанне. Абрад пераводу маладой у жаноцкі стан адбываўся на другі дзень вяселля, калі "ў нявесты знімаюць вянок і завязываюць платок". Абрад дзяльбы каравая адбываецца ў хаце маладога, але дзеляць каравай, які прывезла з сабой маладая. Запоіны замацоўвалі згоду на шлюб: "калі праходзілі запоіны, то счыталі, што свадзьба будзіць абязацельна".

На тэрыторыі Копыльскага раёна Мінскай вобласці былі свае адметнасці мясцовага характару і закраналі яны структуру, сістэму вобразаў і міфалагічных прыкмет і павер'яў.

У вёсцы Семежава традыцыйнае сватанне, калі дасягалася згода на шлюб, завяршалася тым, што маладыя ішлі запрашаць родзічаў на вяселле.

Лакальнай адметнасцю запоін з'яўлялася адорванне з боку роду маладога маладой і яе блізкіх і наадварот, "маладая дорыць падаркі роду маладога". Калі дзяўчына не дае згоды на шлюб, то павінна вярнуць маладому "хлеб і гарэлку назад".

У вёсцы Семежава Копыльскага раёна вядзецца своеасаблівая падрыхтоўка да вяселля: "дружкі мыюць падлогу, падметаюць двор, нацягваюць навалачкі з вышытымі ромбамі з двух бакоў на падушкі, што дараць маладой бацькі. Пачынаецца вяселле ў суботу, гуляюць толькі друзья маладых, толькі маладзёж".

Рытуал сустрэчы маладога бацькамі маладой суправаджаецца частаваннем мёдам, гарэлкай і выкананнем песні "Ой, выйшла маці да зяця вітаці". Рытуал выкупу маладой з боку маладога ажыццяўляецца старшай дружкай і суправаджаецца таксама песняй жартоўнага зместу: "Да казалі, дружко вельмі хорош, // А ж у нашаго дружка буслаў нос". Абрадавы момант сустрэчы маладых у доме маладога звязаны з выкананнем песень "Выйдзі, выйдзі, мамачко, паглядзі", "Ой, знаці, знаці, што чужая маці" і з рытуалам "пакрывання маладых чырвонай хусткай".

Цікавымі мясцовымі асаблівасцямі з'яўляюцца такія рытуальныя дзеянні маладых, як "набіранне дружкам вады з калодзежа, упрыгожванне ручнікамі хлявоў і варот, упрыгожванне калодзежа вышытым ручніком, а затым "маладая з маладым нясуць вядро з вадою, накрытае платком, на мезеных пальцах у сад, выліваць пад яблыню". Дадзены фрагмент звязаны з прадуцыравальнай магіяй.

Сярод іншых абрадавых дзеянняў у хаце маладой вылучаюцца такія, як разыгрыванне сцэнкі выбару сапраўднай нявесты, праверка ў танцах фізічных якасцей маладой.

На другі дзень вяселля ў хаце маладога "маці маладога прыносіць "прасніцу", і маладая прадзе", а госці адорваюць падарункамі, кідаючы іх "на прасніцу".

У вёсцы Маставікі Мядзельскага раёна сярод вясельных этапаў вылучаліся сватанне, "прапоіны", агляд дома жэніха, "дзявочын вечар".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сімвалам згоды на шлюб з'яўлялася абвязаная палатном бутэлька з жытам, якую дзяўчына аддавала сватам. Зборная субота мела лакальную назву “дзявочын вечар”, суправаджалася выкананнем песень “Зборная суботка настала”, “Пайшла Настачка ў агарод”. Пасад таксама меў месца ў сістэме мясцовага вяселля: “Нявесту ад парога вядуць два браты па палатку, гучыць песня “Лятуць, лятуць два лебедзі цераз сад”. Рытуал благаславення маладой у роднай хаце ажыццяўляецца яе бацькамі і сватамі. Каб засцерагчыся ад злых духаў, дружына маладой павінна была тройчы “па сонцу” абысці вакол сталоў. Рытуал выкупу прыданага з боку маладога адбываўся наступным чынам: “На прыданае садзяцца дзеці і не аддаюць, пакуль малады не дае выкуп”.

Запісаныя звесткі па вясельнай абраданасці і паэзіі на тэрыторыі Мінскай вобласці адрозніваюцца, у параўнанні з вяселлем Гомельшчыны сціпласцю рытуалаў, абрадавых дзеянняў, міфалагічных вераванняў.

Звернемся да характарыстыкі вясельных традыцый **Гродзеншчыны.** Адзначым, што ў параўнанні з вяселлем Гомельшчыны, заходнебеларуская вясельная традыцыя выглядае больш збеднена. Калі на тэрыторыі Гомельскай вобласці яшчэ нават сёння даволі ўстойліва захоўваюцца ў народнай памяці жыхароў розных вёсак асобныя этапы вяселля, то даволі нераўнамерна прадстаўлена вясельная традыцыя на Гродзеншчыне. У найбольш поўным выглядзе яна захавалася ў Астравецкім, Дзятлаўскім, Ваўкавыскім, Навагрудскім, Ашмянскім, Смаргонскім раёнах. Паводле даследаванняў, праведзеных Т.Б. Варфаламеевай, апісанні вяселляў названых мясцовасцей сканцэнтравалі ў сабе “характэрныя абрадава-этнаграфічныя і песенныя рысы традыцыйнага вяселля цэнтральнай зоны беларускага Панямоння: даволі развіты цыкл каравайных абрадаў, развітыя абрады пасаду і маладой, і маладога, адсутнасць у значнай колькасці мясцовых традыцый абрадаў, звязаных з расчэсваннем, “адразаннем” і выкупам касы маладой, а таксама абраду адзявання ёй жаночага галаўнога ўбору і г.д.” [17].

Пра вясельную традыцыю ў мінулым на заходніх землях Беларусі можна даведацца з дарэвалюцыйных запісаў, зробленых на тэрыторыі Ваўкавыскага і Ашмянскага паветаў Віленскай губерні, а таксама ў в. Парэчча Слонімскага павета [18].

Цікавасць уяўляюць і сучасныя запісы вясельнай абраднасці і паэзіі на Гродзеншчыне. Заўважым, што структура класічнага беларускага вяселля цалкам захоўваецца ў рэгіянальным вяселлі раёнаў Гродзенскай вобласці. Напрыклад, паводле звестак, запісаных у Астравецкім, Воранаўскім, Гродзенскім, Мастоўскім, Слонімскім, Шчучынскім раёнах, структура вяселля на Гродзеншчыне ўключае такія абрадавыя этапы, як запыты, сватанне, заручыны, дзявочнік, каравай, запрашэнне гасцей, першы дзень вяселля, другі дзень вяселля, вяселле ў маладога, гасціна.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У вёсцы Мілаванне Слонімскага раёна сватанне і заручыны, як адзначылі інфарматары, супадаюць у часе правядзення: “Сваты бываюць суботаю. Вот ужэ малады ўходзіць са сватам у хату, але бэльку не пераходзяць, гаворацЬ: “Сват прысланы, каб быў стол засланы, // Дзе тая кветка, што цвіла ўлетку?”. Адзначым такія асаблівасці вясельнай традыцыі сватання на Гродзеншчыне, як адсутнасць дзяўчыны пры размове сватоў, “наварочванне чаркі на бутэльку з гарэлкай” пры ўмове згоды на шлюб. Пра няўдалае сватанне на Гродзеншчыне гаварылі: “спаліць хадляўкі” (в. Геранёны Іеўскага раёна); “пайсці дахаты з аўсяным боханам” (ні з чым) (в. Замасцяны Шчучынскага раёна) [19]. Асаблівасцю заручын з’яўлялася такое абрадавае дзеянне, якое было вядома ў народзе пад назвай “падаць на запаведзь”. Як указваюць М.А. Даніловіч, Н.К. Памецька, І.В. Піваварчык, сутнасць апошняга заключалася ў тым, што “святар падчас імшы за прызначаную суму грошай абвяшчае народу, што такая паненка выходзіць замуж за такога кавалера” [19, с. 10]. “У час, які адводзіўся для гэтага звычая (ад двух да пяці тыдняў), бацюшка чытаў запаведзі і пытаўся ў прыхаджан, ці не ведаюць яны чаго такога, што магло б перашкодзіць шлюбу: ці не з’яўляюцца маладыя сваякамі, ці няма ў іх іншай пары? За тыдзень да вяселля бацюшка абвяшчаў аб яго тэрміне сваёй пастве” [17, с. 8].

Асноўныя рытуалы дзявочніка – гэта падрыхтоўка вянка і кветак для дружыны маладога і маладой, выкуп вянка нявесты яе раднёй, заплятанне касы, пачастунак. Цікава заўважыць, што не ўсюды на тэрыторыі Гродзеншчыны быў вядомы рытуал пляцення вянка ў маладой, “у некаторых мясцовасцях вянок маладой плялі ў маладога” [19, с. 13].

На тэрыторыі Гродзеншчыны ладзілі вяселле “на два бакі”, два вясельныя застоллі ў хаце бацькоў жаніха і ў хаце бацькоў нявесты.

Асноўнымі рытуаламі першага дня вяселля ў хаце маладой з’яўляюцца наступныя: сустрэча бацькамі маладой дружыны маладога, торг апошняй за маладую; звядзенне, злучэнне дружыны жаніха з дружынай нявесты, абрад дарэння, пасад маладой; ад’езд да вянчання; вянчанне, частаванне гасцей у хаце маладой, рытуал “іграць марш”, уласна абрад дарэння. Рытуалы ў час вяселля ў хаце маладога наступныя: сустрэча маладых бацькамі жаніха, завязванне хусткі маладой, вясельнае застоллле. “Заканчваецца вяселле “гасцінай”, якая мае некалькі дзей: “гасціна”, “перша гасціна”, “першы пачастунак”, “салодка водка”, “пірагі” [19, с. 33].

Паслявясельная частка на Гродзеншчыне, як і на Гомельшчыне, мае ў залежнасці ад мясцовасці свае лакальныя назвы, напрыклад, “на пірагі”, “у госці”, “пярэзвы” і інш.

Як бачым, вясельная традыцыя Гродзеншчыны захоўвае адметныя асаблівасці абрадаў і рытуалаў, багацце вясельнай песеннай лірыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 3 Лакальна-рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый Гомельшчыны

Вясельная традыцыя на Гомельшчыне адрозніваецца яркімі самабытнымі рысамі і надзвычай устойліва захоўваецца ў жывым бытаванні. Зробленыя запісы вясельнага абраду і паэзіі ў розных раёнах Гомельскай вобласці дазваляюць зрабіць вывад аб тыповым агульнапалескім характары вясельнага сцэнарыя і песеннага рэпертуару, а таксама аб спецыфічных лакальных праявах бытавання вясельнай традыцыі. Хоць агульная структура палескага вяселля не разыходзіцца з агульнабеларускім вяселлем, аднак карціна багатай яго варыянтнасці не толькі ў межах асобных раёнаў, але і вёсак. Пярэсты характар бытавання вясельнай традыцыі, напоўненай у кожным канкрэтным выпадку непаўторным зместам, дазваляюць сцвярджаць факт самабытнасці вясельнага жанру ў дачыненні да пэўнага геаграфічнага раёна.

Адзначым добрую захаванасць на тэрыторыі **Рэчыцкага** раёна вясельнай традыцыі, мясцовая спецыфіка якой выяўляецца на прадметным, акцыянальным і вербальным узроўнях. Дакладна рэгламентаваныя па этапах абрадавыя дзеянні былі закліканы забяспечыць у будучым дабрабыт маладой сям'і, замацаваць факт шлюбу ў свядомасці людзей. Падкрэслім, што рэчыцкі вясельны комплекс, захоўваючы агульнабеларускую аснову, вылучаецца адметнымі лакальнымі рытуальнымі песнямі, складаецца з такіх абрадавых момантаў, як сватанне, запоіны або заручыны (у некаторых вёсках гэтых этапаў не было), дзявочы вечар, каравай, першы дзень вяселля, вянчанне, другі дзень вяселля і паслявясельная частка ("куры", "драць курэй", "галоўні разграбаць", "пярэзвы", "пятухі").

Сярод цікавых давясельных звычаяў можна вылучыць наступныя: калі маладая не дае згоды на шлюб, то ў час сватання выносілі гарбуз (в. Холмеч, Вятхінь, Капань), "вешалі гарбуз на плот" (в. Ровенская Слабада), вярталі назад прынесены сватамі хлеб (в. Левашы); калі сваты дасягнулі дамоўленасці аб вяселлі, то мяняліся хлебам (в. Холмеч), калі нявеста згодна выйсці замуж, то "падыходзіць да стала, на яком стаіць бутэлька з гарэлкай, прывезеная бацькамі жаніха, і развязвае красную лентачку" (в. Зашчоб'е); разразае хлеб сватоў (в. Ліскі), калі "ішлі ў сваты, то звязвалі вілікі, штоб жылі дружна" (в. Левашы). Іншы раз падчас сватання ў вёсцы Зашчоб'е, калі маладая не згодна на шлюб, то "ставяць сватам на стол гарбуз". У вёсцы ж Капань у такім выпадку "выстаўлялі гарбузу за парог".

Сватанне ў вёсках Рэчыцкага раёна суправаджалася традыцыйнымі рытуаламі: дыялогам, абвязваннем сватоў ручнікамі, абсыпаннем маладых зернем. Сватанне ў вёсцы Холмеч суправаджалася наступнай песняй жартоўна-сатырычнага характару:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Прыехалі к нам недалёкія,*
*Картавыя, недарэкія.*
*Дзе вы, свашачкі, валачыліся,*
*Што па пояс памачыліся?*
*А мы ў саломе начавалі,*
*Мышы вушы паз’ядалі.*
*Мы сена не касілі,*
*Мы сена не прасілі,*
*А прыехалі да вас маладую браць.* (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Холмеч Рэчыцкага р-на ад Панцялей Кацярыны Міхайлаўны, 1929 г.н.).

Нявеста частавала сваіх сябровак хлебам, які прынеслі сваты: “Я па кусочку ўсім дзеўкам давала, штоб яны за мной услед замуж ішлі” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Холмеч Рэчыцкага р-на ад Панцялей Кацярыны Міхайлаўны, 1929 г.н.).

Калі замуж выходзіла дзяўчына-сірата, то кіраваліся пэўнымі народнымі міфалагічнымі ўстаноўкамі: “ёй распускалі левую касу, калі не было маці, а правую касу распускалі, калі маці была жывая, а бацькі не было, распускалі левую касу, а правую заплятал”. Калі ж дзяўчына была круглай сіратой, “ёй распускалі косы і надзявалі вяночак з белых кветак” (в. Ровенская Слабада). У вёсцы Броннае Рэчыцкага р-на маладая разбівала ў сваёй хаце гаршчок падчас вясельнага застолля, каб “хутчэй адвыкнуць ад сваёй сям’і”.

Такі абрадавы этап, як дзявоцкі вечар, у структуры вясельнай абраднасці і паэзіі Рэчыцкага раёна адбываўся ў розных вёсках у розныя дні, напрыклад, у в. Холмеч – у суботу, у в. Зашчоб’е – у пятніцу. Рытуал падрыхтоўкі вянка суправаджаўся песнямі, у якіх гучалі матывы суму і тугі маладой у сувязі з яе расставаннем з бацькоўскай хатай, матывы прадчування цяжкай долі замужняй жанчыны.

Каравайны абрад як кульмінацыя вяселля суправаджаўся песнямі, пажаданнямі, адрозніваўся цікавымі міфалагічнымі прыкметамі і павер’ямі. Рыхтавалі каравай у хаце жаніха і ў хаце нявесты. Як паведамілі інфарматары з в. Жмураўка, рытуал дзяльбы каравая меў такую адметнасць, як “запіс на коміне ўсіх падарункаў”, адрасаваных маладым.

Асаблівасцю вяселля ў Рэчыцкім р-не з’яўляецца такая дэталь, як “страляніна” з боку дружыны маладога, калі ехалі забіраць маладую: “Замкнулі ў хаце маладую, дык пабілі акно – лезлі к нам па мададую. Едуць – страляюць” (в. Дземяхі). Цікава, што ў в. Зашчоб’е за вясельны стол вядзе маладых хлопчык, якому “ў кружку налiваюць кампот і кідаюць туды капейкі, даюць яму канфеты” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Зашчоб’е Рэчыцкага р-на ад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Цэйка Раісы Нікіфараўны, 1937 г.н., студэнткай Грабейнікавай Т.). У гэтай вёсцы давялося запісаць і цікавае міфалагічнае павер'е, паводле якога трэба было "гасцям маладой з вяселля ад жаніха ўкрасці дзве талеркі і дзве лыжкі, а потым аддаць свякрусе, каб маладая быстрэй прывыкала жыць у свякрухі" (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Зашчоб'е Рэчыцкага р-на ад Цэйка Раісы Нікіфараўны, 1937 г.н., студэнткай Грабейнікавай Т.). Адметным быў у в. Зашчоб'е і рытуал, які сімвалізаваў яднанне маладых: "Хлопчык, які заводзіў маладых за стол, доўжэн быў расплесці касу нявесце. Потым бралі косы жаніха і нявесты, вынімалі з круглага хлеба дзве гарашчых свечкі і імі падпальвалі косы, якія ўмесце гараць, потым тушылі, а свечкі кідалі на печ, спяваючы песні" (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Зашчоб'е Рэчыцкага р-на ад Цэйка Раісы Нікіфараўны, 1937 г.н., студэнткай Грабейнікавай Т.).

У абрадзе царкоўнага вянчання ўдзельнічала толькі моладзь. Паводле народных уяўленняў, нельга было пераходзіць дарогу вясельнай дружыне, асцерагаліся, калі на шляху раптам сустрэнуцца кот, дрэнны чалавек, цыганка. Меркавалі, што ў такім выпадку маладыя будуць бедна жыць. Сачылі, каб падчас вянчання не патухлі свечкі, бо калі адна з іх патухне, то хто-небудзь з маладых памрэ (в. Левашы).

Мясцовую афарбоўку набывае рытуал "завівання маладой" у вясельным абрадзе в. Ровенская Слабада, дзе абавязкова, "завіваючы косы маладой", уплялі туды лён, каб "у маладых лён заўсёды добра радзіў". Звычай пераводу дзяўчыны-нявесты ў жаночы стан суправаджаўся яе галашэннем і жартоўным дыялогам-спрэчкай паміж сяброўкамі нявесты і жанчынамі, якія "коскі маладой закруцілі, у бабу прыўрацілі".

*Дзеўкі:*
*– Завівала, сцерва,*
*Маю косачку сцерла,*
*Сцерла-самяла,*
*Пад чапец схавала.*

*Бабы:*
*– Што захацелі,*
*Тое мы здзелалі:*
*З цеста паляніцу,*
*З дзеўкі маладзіцу.*
*Дзеўкі:*
*– Ах вы, бабы, бабы,*
*Што ж вы нарабілі?*
*Падружачку нашу*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*На век закруцілі* (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Ровенская Слабада Рэчыцкага р-на ад Цішанка Таццяны Андрэеўны, 1918 г.н.).

Арганічнай часткай духоўнай культуры Рэчыцкага р-на з’яўляюцца і звычаі, прывезеныя жыхарамі-перасяленцамі з за-бруджаных у сувязі з чарнобыльскай катастрофай раёнаў Гомельшчыны. Напрыклад, рытуал “пераводу” маладой у жаноцкі стан у в. Багушы Брагінскага р-на здзяйснялі хросная маці і дзве жанчыны, адна з якіх трымала талерку з грабянцом, а другая – хустку: “знімаюць вяночак і кладуці тарэлку, потым жанчыны просяць у дружак: “Дайце нам масла, памазаць маладой коскі, штоб яны ляжалі хораша”, потым завязвалі маладой хустку” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Ліскі Рэчыцкага р-на ад Міхаленка Кацярыны Ігнатаўны, перасяленкі з в. Багушы Брагінскага р-на).

Першы дзень вяселля ў вёсцы Броннае, як і ў іншых мясцовасцях Рэчыцкага р-на, адбываўся ў хаце маладога: “Маладых сустракалі бацькі жаніха – з абразом у руках бацька, з хлебам-соллю маць. Маладыя цалуюць абраз, кланяюцца бацькам” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Броннае Рэчыцкага р-на ад Рудэнка Анастасіі Давыдаўны, 1925 г.н.). Цікавасць уяўляе той момант, калі маладыя павінны былі па чарзе “адкусіць хлеба”. Хто адкусіў большы кавалак, будзе ў сям’і старэйшы” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Броннае Рэчыцкага р-на ад Рудэнка Анастасіі Давыдаўны, 1925 г.н.).

Вялікае значэнне надавалі беларусы Рэчыцкага Палесся цнатлівасці маладой. “Незахаванне цноты ў беларусаў, як і ў іншых славянскіх народаў, лічылася вялікім грахом” [23, с. 85]. Напрыклад, калі дзяўчына захавала цнатлівасць, то “бацькі жаніха ставяць на стол радам з маладымі чырвонае віно з вялікім чырвоным бантам. І такое ж самае віно дарацьмаці нявесты” (г. Рэчыца, в. Будка). Калі нявеста прадэманстравала маральную чысціню, то “матку яе катаюць на тройцы, а еслі нявеста не чэсная, матке надзяваюць на шыю хамут і водзяць па ўсёй дзярэўні” (в. Ровенская Слабада).

Другі дзень вяселля ў вёсцы Броннае адзначалі ў жаніха. Асаблівасцю мясцовай традыцыі з’яўляўся рытуал, звязаны з падмятаннем нявестай хаты: “У раніцу нявеста павінна першай падмесці хату. А калі гэта зрабілі сяброўкі, то павінна даць ім выкуп” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Броннае Рэчыцкага р-на ад Рудэнка Анастасіі Давыдаўны, 1925 г.н.). Цікавым лакальным элементам гэтага вясельнага этапа ў в. Броннае з’яўляецца “сумесны выхад маладых раніцай да калодзежа па ваду”. Калі нявеста ідзе адна, то “бабы абліваюць яе вадой”. У в. Холмеч у панядзелак спецыяльна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

радня маладой везла шафу ў хату жаніха. Выконвалі вясельныя песенныя радкі сатырычнай скіраванасці:

*А ў нашага свата*
*З вербы, з лазы хата.*
*Ні клеці, ні павеці,*
*Недзе скрыні дзеці,*
*Ой, ні таго свірна,*
*Ой, ні таго свірна,*
*Што заганяюць свіння* (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Холмеч Рэчыцкага р-на ад Панцялей Кацярыны Міхайлаўны, 1929 г.н.).

Адметным з'яўляецца факт страляніны па чырвоных сцягах, якімі ўпрыгожвалі шафу: "пачэсна будзе таму, хто праб'е".

Паслявясельная частка ў вёсках Рэчыцкага раёна мела розныя назвы: гэта і "драць курэй" (вв. Азершчына, Ровенская Слабада), "пярэзвы" (вв. Будка, Заходы), "куры" (в. Зашчоб'е), "на пятуха" (в. Капань) і інш.

Трэці дзень вяселля ў г. Рэчыца называлі "курэй драць": "Са стараны жаніха ідуць к бацькам нявесты, ловяць курэй, забіваюць іх, вешаюць на жэрдку і два чалавекі нясуць да таго месца, дзе збіраюцца гуляць, раскладваюць кастры, дзяруць курэй, пякуць на кастры" (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў г. Рэчыца ад Кузьмянок Веры Акімаўны, 1930 г.н.). У вёсцы Будка паслявясельная частка вядома пад назвай "куры", праўда, ходзяць у госці да тых, хто "гуляў вяселле". У вёсцы Броннае трэці дзень вяселля – гэта "цыгане". Абавязковымі элементамі з'яўляюцца пераапрананне ў цыган, наведванне двароў удзельнікаў вяселля, збіранне прадуктаў, прыгатаванне ежы. Жыхары Рэчыцы адзначылі, што заўсёды пасля вяселля "з боку маладой бацькі, сваякі, кожны сам па сабе, завуць на пярэзву. Звалі тых, каго лічылі патрэбным, звалі на працягу месяца" (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў г. Рэчыца ад Кузьмянок Веры Акімаўны, 1930 г.н.).

У вёсцы Зашчоб'е працяг вяселля ў панядзелак насіў назву "куры": "раніцай госці ходзяць па дварам, крадуць курэй, тады іх вараць, ставяць на стол" (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Зашчоб'е Рэчыцкага р-на ад Цэйка Раісы Нікіфараўны, 1937 г.н.). У вёсцы Капань тыя ж паслявясельныя абрадавыя дзеянні, якія адбываліся ў хаце маладога, мелі назву "пеўня драць". Абавязковым атрыбутам быў суп, звараны з пеўня.

Звычай "драць курэй" на трэці дзень вяселля характэрны і для вяселля в. Ровенская Слабада: "і ў нявесты гуляюць, дзяруць курэй, і ў жаніха дзяруць курэй. Двары аддзельна гуляюць" (Фальклорны архіў кафедры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Ровенская Слабада Рэчыцкага р-на ад Якавец Таццяны Уладзіміраўны, 1961 г.н.). У вёсцы Заходы праз тыдзень пасля вяселля адбываюцца “пярэзвы”, галоўная мэта якіх праведаць маладых. У вёсцы Будка “на пярэзвы” збіраліся госці і наведвалі ўсіх удзельнікаў вяселля, а на наступны дзень хадзілі па хатах і збіралі курэй, з якіх варылі суп і вечарам елі. У вёсцы Андрэеўка на трэці дзень пасля вяселля госці ішлі “галоўні разграбаць”, або “курэй драць”, наведванне маладымі і раднёй жаніха бацькоўскай хаты нявесты ў в. Азершчына называлася таксама “драць курэй”: “госці ідуць на двор, ловяць курыцу, заб’юць, абскубуць, звараць – і на стол. І шуцюць: “курыца ўкусная – нявеста будзе ўкусная” (Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Запісана ў в. Азершчына Рэчыцкага р-на ад Цуранковай Соф’і Кандратаўны).

Запісы звестак пра вясельныя традыцыі на **Мазыршчыне** пацвярджаюць факт блытаніны вясельнай тэрміналогіі, у прыватнасці, у в. Махнавічы сватанне і запоіны аб’ядноўваліся ў адзін этап, а вось назве “заручыны” зусім не адпавядалі тыя абрадавыя дзеянні, якія ўласцівы гэтаму этапу ў класічным беларускім вяселлі.

Сутнасць мясцовых заручын – у тым, каб бацькам жаніха дамовіцца з бацькамі нявесты аб часе, выбраным для сватання. На гэтым вясельным этапе маладая адорвае бацькоў жаніха падарункамі: “нявеста дорыць кохту, платок свякрусі, а свёкру – палаценца”.

На сватанне-запоіны прыходзяць 15 чалавек, сярод якіх хросныя бацькі жаніха, бацька з маці і браты жаніха, дзядзькі. Размова паміж сватамі вядзецца ў дыялогавай іншасказальнай форме. Падчас вяселля ў хаце маладой адбываецца выкуп ёлкі, што сімвалізуе выкуп дзяўчыны-нявесты: “Маладога не пускаюць за стол, пака ня выкупяць маладую. А каля маладой сядзяць дружкі, якія заказваюць княжым, колькі грошай трэба за ёлку. Як яны дадуць столькі грошай, дык маладога саджаюць за стол, дружак выганяюць, і свахі спяваюць:

*Ідзіце, дружкі, ад мяне,*
*Няхай сядзе Колечка ля мяне”* (в. Махнавічы)

Вясельны абрад, зафіксаваны ў в. Загорыны Мазырскага р-на, сведчыць аб добрай развітасці і ўстойлівай захаванасці каравайнай вясельнай абраднасці і паэзіі. Усе рытуальныя дзеянні, звязаныя з падрыхтоўкай каравая, суправаджаліся песнямі, у якіх цэнтральнае месца займаюць персаніфікаваныя вобразы самога каравая, печы:

*Зажурыўся каравай,*
*У каморы стоячы.*
*Вы танцуйце, спявайце,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*А пра яго не дбайце.*

У песнях “Закідай, мамка, дровы”, “Ой, едзем, мы едзем, да ні дарогі, ні следу”, якія гучалі адпаведна пры выхадзе маладой з роднай хаты і па дарозе да хаты маладога, гучаць матывы развітання з маці, матывы пошуку правільнага шляху да хаты маладой: “Закідай, мамка, дрова // Да бывай, мамка, здарова”; “Ой, едзем, мы едзем, да ні дарогі, ні следу, // Да каня паганяем, // Да дарогі пытаем, // Да па галках страляем, // А галачкі да на сошачку, // А пер’ечка на падушачку”.

Падчас сустрэчы свёкрамі маладой выконваецца песня, у якой гучаць просьбы да нявесткі: “Не будзь санліва, драмліва, // Да распусці долю // Па майму двару, // Каб пачулі валы ды каровы // Дай баравыя пчолы”.

Рытуал развівання маладой выконвалі дзве жанчыны, адна з якіх была з боку радні жаніха, другая – з боку радні нявесты.

Вяселле ў Мазыры і яго ваколіцах, як і ў іншых рэгіёнах Гомельшчыны, Беларусі, складаецца з трох частак – давясельнай, уласнавясельнай і пaслявясельнай. Захоўваючы агульнанацыянальныя рысы, вясельная абраднасць і паэзія Мазырска-Прыпяцкага Палесся вылучаецца рэгіянальнымі і лакальнымі асаблівасцямі, якія выяўляліся і на ўзроўні асобных абрадавых этапаў, і ў рытуалах, і ў прыкметах, павер’ях, і ў прадметнай атрыбутыцы.

Відавочна, што вяселле ў Мазырскім краі пачыналася са сватання, у якім звычайна ўдзельнічалі родны бацька, хросны бацька, родны дзядзька (у некаторых мясцовасцях колькасць сватоў была большай). Галоўная цырымонія перадвясельнага этапа – сватанне суправаджалася жартоўным іншасказальным дыялогам, у працэсе якога выказваліся згода ці нязгода маладой на шлюб. У ім адлюстраваліся рэшткі ўяўленняў, звязаных з купляй-продажам нявесты: “*Ішлі, да зашлі. Чулі, што ў вас цялічка ё. Хацелі яе купіць*” (г. Мазыр, ад Чуб Надзеі Сяргееўны, 1928 г.н.). Менавіта на этапе сватання бацькі жаніха і нявесты дамаўляліся, на які дзень прызначаць вяселле і якімі будуць яго выдаткі. Калі маладая давала згоду на шлюб, то “*ручнікі вешае сватам*” (г. Мазыр, ад Назарчук Марыі Фёдараўны, 1927 г.н.), а калі не згодна, то выносяць сватам гарбуз: “*во як не захоча, так гарбузу кладзе*” (г. Мазыр, ад Гузоўскай Ганны Іванаўны, 1932 г.н.); “*выкачвалі цераз парог гарбуз*” (г. Мазыр, ад Шэшка Паліны Арцёмаўны, 1933 г.н.). Паводле ўспамінаў Таццяны Аляксандраўны Целяпун, 1916 г.н., гэта быў звычай “сыры гарбуз”.

Вышэйназваную мясцовую традыцыю адмовы ад шлюбу дапаўняе сімвалічнае абрадавае дзеянне з чайнікам: “*еслі дзевка проців, то она проходзіла міма сватов з пустым чайнікам*” (г. Мазыр, ад Раманоўскай Алы Васільеўны, 1941 г.н. Заўважым, што інфарматар жыла раней на тэрыторыі Усходняй Украіны). Калі маладая выпівала адразу паднесеную ёй сватамі чарку гарэлкі, то гэта сведчыла ў народных павер’ях аб яе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жаданні выйсці замуж: “*еслі маладая выпівае рюмку, значыт, ана сагласна і выходзіт замуж*” (г. Мазыр, ад Дзмітрыевай Ганны Аляксандраўны, 1922 г.н.). Прыведзеныя звесткі таксама пацвярджаюць факт узбагачэння мясцовых павер’яў, бо інфарматар прыехала ў г. Мазыр з в. Ліхаўня Нараўлянскага раёна.

Пра звычай абменьвацца хлебам падчас сватання прыгадала Галіна Пятроўна Кандратава, 1916 г.н., з в. Навікі (жыла раней у Палтаўскай вобласці). Калі нявеста не давала згоды на шлюб, то магла проста збегчы з хаты: “*А як адказвала, дык можа ўжо ўцякці з хаты ваобшчэ*” (г. Мазыр, ад Крупы Міхаіла Ігнатавіча, 1930 г.н.).

Жыхарка Мазыра Ксенія Сцяпанаўна Пархоменка, 1931 г.н., прывезла з в. Шуты Ельскага раёна, дзе жыла раней, мясцовыя адметнасці традыцыі сватання: калі дзяўчына не пагаджалася на шлюб, то “*сколько гарэлкі прыносілі, яна ўсё ў карзіну і аддавала назад, еслі сагласна – не аддавала*”.

Разгорнутым у мазырскім вяселлі быў каравайны абрад. “Напярэдадні вяселля вечарам і ў доме жаніха, і ў доме нявесты ў прысутнасці вялікай колькасці сваякоў і знаёмых адбывалася вялікая ўрачыстасць са строгім захаваннем усялякіх абрадаў, а менавіта пячэнне караваяў…” [18, с. 219]. “Каравай – вясельнае абрадавае печыва. Сімвалізуе багацце, дабрабыт будучай сям’і, атаясамліваецца з маладымі, іх доляй і шчасцем. Даўней каравай выконваў і функцыю матэрыялізаванага Бога-продка” [24, с. 246]. “Сімволіка каравая – гэта перш за ўсё сімволіка хлеба, з якім было звязана ўсё жыццё селяніна. Таму і ў працы, і ў абрадах і звычаях, у песнях і іншых вуснапаэтычных творах хлеб (жыта) – важнейшы атрыбут і вобраз, боства, здольнае забяспечыць шчасце і дабрабыт чалавека” [25, с. 131].

Агульнапрынятым было ў народзе запрашэнне шчаслівых у сямейным жыцці жанчын рашчыняць цеста для каравая і выпякаць яго: “*толькі штоб не разводніцы і не халасцячкі былі, штоб жанатыя былі маладыя жэншчыны*” (г. Мазыр, ад Жылянок Праскоўі Максімаўны). Звычай “апяваць каравай” суправаджаўся песняй-ілюстрацыяй, у якой у гіпербалізаваным выглядзе паказваецца працэс падрыхтоўкі яго саставу: “*Што ў том караваі? // З сямі палёў пшаніца, // З сямі крыніц вадзіца, // З сямі курак яечко, // З сямі дворак маслечка…*” (г. Мазыр, ад Чуб Надзеі Гардзееўны, 1928 г.н.).

Адзначым, што ў Мазырскім павеце, як вядома са зробленых К. Машынскім апісанняў вяселля, “рыхтавалі не толькі каравай, але пякуць – у князя так званы месяц у форме сярпа, велічынёй на дзве далоні, а ў княгіні замест гэтага рагаля – так званую шышку. Гэту шышку маладая трымае за пазухай, едучы да свёкра і абходзячы ў яго гаспадарчыя будынкі” [18, с. 391].

Цікавай з’яўляецца наступная адметная дэталь падчас падрыхтоўкі каравая: “*У каравай усягда ў сярэдзіну лажылі яйцо. Эта яйцо выразалі і ім давалі – маладым*” (г. Мазыр, ад Мельчанка Алены Міхайлаўны, 1929 г.н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“Яйка і яешня лічыліся магічнымі сродкамі, якія забяспечвалі маладым дзетароднасць” [16, с. 578]. Як паведаміла Ганна Іванаўна Гузоўская, 1932 г.н., “*ну, от у каравай лажылі яйцы цэлыя, туды, у сярэдзіну. Ну і маладыя дзяўчаты, якія ўжэ стаяць, калі каравай дзеляць, дык яны ўжэ стараюцца ўхапіць тое яйцэ. Штоб замуж пайсці, дык надо тое яйцэ з’есці*”. З гэтым дзеяннем, як бачым, звязана таксама прадуцыравальная магічная сіла яйка як першакрыніцы жыцця, менавіта таму каравайніцы выяўлялі вялікую асцярожнасць, калі клалі цеста на яйка (а іх магло быць і “тры штукі”): “*Куда цеста будуць лажыць на лапату, кладуць яйца, штукі тры, так у шкарлупках ложацьпрама на зярно. І ўжо яно не должно раздавіцца. Так пакласці трэба, штоб цеста паклалася, а яйцо не раздавілася*” (г. Мазыр, ад Кадол Алены Паўлаўны, 1930 г.н.). З караваем звязвалі сямейнае шчасце і дабрабыт маладых. З гэтай мэтай імкнуліся, каб каравай быў “багатым”: “*бальшым і красівым, бо чэм лучшы каравай, цем больш будзет у сям’е пладавітасці, дабра, шчасця*” (г. Мазыр, ад Сузько Зінаіды Ісакаўны, 1930 г.н.).

Лапата ў рытуале пасадкі каравая ў печ надзялялася магічнымі ўласцівасцямі. “У кантэксце вяселля сімволіка лапаты хлебнай непасрэдна судачыняецца з сімволікай каравая і таму выяўляе ідэі багацця і ўраджаю, шлюбу і культу продкаў, ідэі самога роду; належнае месца займае і фалічная метафарычнасць лапаты хлебнай” [16, с. 279]. Паводле мазырскіх павер’яў, моц хлебнай лапаты, зробленай з дуба, па прынцыпу сімільнай магіі павінна была паўплываць на якасць дзетанараджэння: “*бяруць эту лапату ўсю ў муке, ідуць туды і б’юць тых мужыкоў па галаве не крэпка, а так, толька для сімвалу… Гэта зацем робіцца, каб усе дзеці ў маладых былі башкавітыя, разумныя…*” (г. Мазыр, ад Кадол Алены Паўлаўны, 1930 г.н.).

Адметнасцю мазырскага вяселля з’яўляецца і абрадавы этап пад назвай “Ёлка”, якая, па словах інфарматараў, сімвалізавала пачатак вяселля: “*ёлка абазначае сімвал свадзьбы. Ёлка, каравай – гэта ўсё, свадзьба началась*” (г. Мазыр, ад Кадол Алены Паўлаўны, 1930 г.н.). “*Вот зрэжуць з лесу ёлачку красівую, прынясуць, у цветы бумажныя, у ленты ўсякія прыбіраюць … і свечачкі цапляюць*” (г. Мазыр, ад Гузоўскай Ганны Іванаўны). Як бачым, ёлка ўяўляла сабой невялікае дрэўца, упрыгожанае рознакаляровымі стужкамі, кветкамі, свечкамі і з’яўлялася сімвалам дзявоцтва маладой. Паводле міфалагічных вераванняў мазыран, тая дзяўчына, якая “*сарве з ёлкі “свечкі”, хутчэй замуж пойдзе*” (Запісана ад Мануілавай Яўгеніі Мікалаеўны, 1929 г.н.).

Засяродзім увагу на тых фактах міфалагічных уяўленняў, якія знайшлі адлюстраванне ў абрадавых момантах мазырскага вяселля. Напрыклад, не дазвалялася пераходзіць дарогу з пустым вядром, калі ехала вясельная дружына. Паводле народных вераванняў, маладая не павінна была “весяліцца, а то дрэннае жыццё будзе”. У народных уяўленнях, звязаных з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вяселлем, мела месца і магія дзетанараджэння: калі маладая пераступала парог хаты маладога, то, каб лягчэй было нараджаць дзіця, “яйцо на парозе разбіла”: “*яйца нада кінуць, гаварат, когда бярэменна, дык штоб раджаць лягчэй было*” (г. Мазыр, ад Крупы Міхаіла Ігнатавіча, 1930 г.н.). Падчас рытуалу “звядзення свечак маладой і маладога” сачылі за тым, чыя свечка будзе “*вышэ, той верх і возьме*” (г. Мазыр, ад Бондар Валянціны Мікалаеўны, 1944 г.н.).

З ачышчальнай і апатрапеічнай магіяй агню быў звязаны рытуал пераезду вясельнай дружыны праз запалены сноп саломы: “*паджыгаюць жа этат сноп – “куль” і цягнуць жа гэтага ваза цераз агонь: і жаніха, і нявесту, і дзве пасцельніцы – усіх цераз этат агонь*” (г. Мазыр, ад Кадол Алены Паўлаўны, 1930 г.н.). Цікавасць уяўляе і мазырскі рытуал прыгатавання і разбівання кашы ў сістэме вясельнай абраднасці і паэзіі, што сведчыць аб узаемадзеянні з радзінна-хрэсьбіннай абрадавай паэзіяй. Магічная сіла зерня з’явілася вытокам сакральнасці рытуальнай стравы – кашы, чарапкі з якой клалі на галаву маладой і верылі, што гэта паспрыяе хутчэйшаму нараджэнню дзіцяці.

Па тым, як гарэлі свечкі, меркавалі пра лёс маладых: “*Кагда к канцу свадзьбы адзінакавыя па дліне свечкі былі рознай велічыны: нявесціна длінная стаіць, а жаніха ўся згарэла – эта гаворыць а том, што жэна пераэкывёт мужа*” (г. Мазыр, ад Кадол Алены Паўлаўны, 1930 г.н.).

Паслявясельную частку пад назвай “хвост” адзначалі звычайна на трэці дзень вяселля. Сярод рытуальных дзеянняў, якія мелі жартоўна-камічны характар, выконвалі наступныя: пераапраналіся ў цыган, выбіралі з ліку старэйшых удзельнікаў вясельнай цырымоніі нявесту і жаніха, рыхтавалі кашу і “разбівалі” гаршчок (гэтыя рытуалы мелі магічнае прадуцыравальнае значэнне, былі звязаны з магіяй дзетанараджэння).

Надзвычай складаны і цікавы вясельны абрадавы комплекс **Лоеўшчыны**, які, як і традыцыйнае беларускае вяселле, складаецца з давясельнай, уласнавясельнай і паслявясельнай частак. Асноўныя абрадавыя этапы лоеўскага вяселля – гэта сватанне, заручыны, “дзявішнік”, каравай, вянчанне, вяселле ў хаце маладой, вяселле ў хаце маладога, паслявясельная цырымонія. Звернемся да характарыстыкі асноўных рытуалаў і вераванняў, звязаных з вясельнымі абрадамі, якія маюць у кожнай канкрэтнай мясцовасці сваю адметную спецыфіку, дасканала распрацаваную сістэму пэўных абрадавых дзеянняў, вялікую тэматычную разнастайнасць песенных сюжэтаў.

Увогуле “вяселле – комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі (песні, музыка, танцы, гульні, прыгаворы і інш.), якія суправаджаюць урачыстасць заключэння шлюбу і з’яўляюцца няпісаным юрыдычным актам зацвярджэння новай сям’і. Жывучасць вясельнай абраднасці тлумачыцца вялікай важнасцю сям’і,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

звязанай з асноўнай умовай існавання народа – яго ўзнаўленнем” [24, с. 126].

Сватанне – гэта адзін з важнейшых абрадаў перадвясельнага перыяду, мэтай якога было дасягнуць дамоўленасці аб шлюбе маладых. Важныя рытуальныя дзеянні гэтага абрадавага этапу давясельнай часткі – іншасказальны дыялог паміж сватамі і бацькамі маладой, сімвалічныя дзеянні маладой пры ўмове згоды або нязгоды на шлюб, перавязванне сватоў ручнікамі. Адметная асаблівасць сватання на Лоеўшчыне – бутэлька гарэлкі, перавязаная “чырвонай або розавай лентай з бантам”, якую прыносілі сваты. Як сведчаць жыхары, такі звычай быў шырока распаўсюджаны ў іх мясцовасці (вв. Сінск, Бывалькі, Дзяражычы, Вулкан, Каўпень і інш.). На лоеўшчыне, як сведчаць інфарматары, колькасць людзей, што ішлі ў сваты, звычайна абмяжоўвалася наступнымі асобамі: “бацька, маці, хросная маці, хросны бацька, яшчэ якія родныя” (Запісана ад Сідарэнка Ганны Дзмітрыеўны, 1936 г.н., в. Бывалькі). Аднак у іншых вёсках маглі ісці ў сваты толькі бацька, брат і хросны жаніха (в. Дзімамеркі), або бацькі, хросная маці і родны дзядзька (в. Вулкан), або жаніх, дзядзькі і жанатыя браты (в. Казярогі), бацькі і хросныя (в. Каўпень). Вар’іруецца ў мясцовай традыцыі і час сватання: хадзілі ў сваты “пасля пакопвання картошкі” (Запісана ад Булацкай марыі дзмітрыеўны, 1936 г.н., в. Дзімамеркі), позна вечарам, “часоў у двянаццаць” (Запісана ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г.н., в. Казярогі), пасля заходу сонца (в. Мохаў). Як адзначылі вяскоўцы, вяселле звычайна не прызначалі ў пост (вв. Рэкорд, Крупейкі). Пасля таго, як бацькі нявесты і жаніха станоўча вырашылі пытанне, прасілі таксама і дзяўчыну пацвердзіць сваю згоду на шлюб. Калі нявеста была згодна выйсці замуж, то выконвалі наступныя дзеянні: яна пераразала хлеб папалам (г.п. Лоеў, вв. Бывалькі, Вулкан), адорвала падарункамі сватоў (в. Дзяражычы), уласна вышытымі ручнікамі (в. Крупейкі), бацькі маладой запрашалі сватоў за стол (в. Каўпень), прымала хлеб ад хроснага бацькі жаніха (в. Пабядзіцель). Часам у знак згоды бацькі нявесты і сваты выпіваюць “па першай чарцы-заручыны” (Запісана ад Зязюля Наталлі Пятроўны, 1949 г.н., в. Карпаўка). Калі ж дзяўчына не хацела ісці замуж, то яна выходзіла ў апранутым навыварат кажусе (в. Малінаўка), выносіла сватам “гарбузу вараную” (вв. Мохаў, Дзімамеркі і інш.) альбо пачынала месці падлогу ў хаце, што таксама сведчыла пра тое, што яна адмовіла сватам.

Заручыны (“запоіны” ў в. Бывалькі) як наступны абрадавы этап вяселля мог адбывацца адразу ж пасля сватання, у той жа дзень (в. Бывалькі, г.п. Лоеў) ці праз некалькі дзён (в. Карпаўка). Часам “заручынамі” называлі вечар перад вяселлем, калі моладзь збіралася гуляць: “заручыны – ета толькі маладзёж” (Запісана ад Карась ксеніі Іванаўны) (вв. Вулкан, Казярогі). на заручынах “перавязваюць ручнікамі сватоў” (в. Каўпень).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асноўная ж мэта дадзенага этапа – прызначыць час вяселля і вырашыць шматлікія пытанні яго правядзення (в. Ліпнякі).

Галоўным атрыбутам нявесты быў вянок, які яна разам з сяброўкамі рабіла з кветак і стужак (вв. Бывалькі, Казярогі і інш.). Сяброўкі таксама дапамагалі нявесце і ў дзень вянчання: апраналі, заплятали касу, прычым апошняе рабілі, пасадзіўшы дзяўчыну на вывернуты кажух або падушку (в. Малінаўка). Каб не сурочылі маладых, нявесце "затыкалі ў плацце іголку", хросная маці маладой тройчы аббягала вакол машыны (в. Казярогі).

Распаўсюджаным на Лоеўшчыне з'яўляецца і царкоўны абрад вянчання, які таксама меў свае адметнасці. Нельга было пераходзіць дарогу маладым, калі тыя ехалі вянчацца, нельга было спяваць па дарозе да вянца (в. Каўпень). У царкве маладыя станавіліся на ручнік – "падножнік" (в. Карпаўка) і падчас абыходу вакол іконы павінны былі "цягнуць" яго за сабой (вв. Карпаўка, Крупейкі). Рабілася гэта дзеля таго, каб сяброўкі маладой таксама выйшлі замуж.

Асцерагаліся, каб падчас вянчання не патухлі свечкі ў руках маладых: "калі агонь патушыцца, то той, у каго патухла, доўга жыць не будзе і скора памрэ" (в. Мохаў).

Пасля вянчання, калі бацькі жаніха сустракалі маладых, то нявеста, ступіўшы на парог, спынялася на некалькі хвілін і прамаўляла ўціхую ад усіх: "Ваша хата, ваша печ, маё слова, мая рэч". Гэты факт можна растлумачыць імкненнем маладой заручыцца падтрымкай духаў продкаў. "Парог, найбольш рытуалізаваны сімвал мяжы паміж хатай як максімальна засвоенай, "акультуранай" чалавекам часткі прасторы, і навакольным, патэнцыяльна варожым светам (іншасветам), светам памерлых" [16, с. 366].

Пасля таго, як адбылося вянчанне маладых, бацькі з хлебам-соллю і іконай сустракаюць іх (в. Карпаўка). У структуры мясцовай вясельнай абраднасці важнае месца займаў рытуал абсыпання жытам жаніха і нявесты, які выконвалі, каб маладыя жылі багата. Калі ж іх благаслаўлялі бацькі, то абавязкова трэба было выпіць прапанаваную гарэлку, а чаркі разбіць: "Калі чарка не разаб'ецца, то дрэнна будуць жыць" (в. Ліпнякі). Лічылі, што чарку трэба "разбіваць праз плячо, а не пад ногі", бо "гэта значыць – шчасце пад ногі" (в. Ліпнякі).

У некаторых вёсках (в. Бывалькі) бытаваў звычай карміць мёдам маладых, каб такім жа салодкім было іх жыццё.

Напярэдадні вяселля выпякалі два караваі (з боку жаніха і з боку нявесты), якія аздаблялі разнастайнымі ўпрыгожваннямі. Пяклі каравай толькі замужнія жанчыны, добрыя гаспадыні (в. Дзімамеркі і інш). Каравай рабілі круглым, каб "дарога жыццёвая ў маладых была чыстая, шырокая" (п. Пабядзіцель). Каравай, як сведчаць інфарматары, мог мець такія памеры, што даводзілася нават "разбіраць печ" (в. Мохаў). Дзяліў каравай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

або сват (вв. Дзімамеркі, крупейкі), або хросныя бацькі (вв. Бывалькі, вулкан). Верхнюю частку каравая аддавалі маладым, а тыя яго "даюць у платочак дружкам, штоб скора замуж ішлі" (в. Казярогі). У в. Крупейкі "вярхушку" каравая аддавалі малым дзецям, а маладым увогуле забаранялі яго каштаваць ("Можа хто на каравай жадае шчасця, а другія – не, дык вот не бяры свайго каравая"). Як растлумачылі жыхары вв. Казярогі, Ліпнякі маладым аддавалі верх каравая, яго сярэднюю частку, каб такім жа "мяккім" было іх сумеснае жыццё. У в. бывалькі перад тым, як падзяліць каравай, галоўны сват, як сведчаць інфарматары, браў качаргу або які-небудзь іншы прадмет і пачынаў стукаць ім па сцяне, запрашаючы гасцей "на ўспамаганне", што сімвалізавала ў мясцовай традыцыі пачатак рытуалу адорвання маладых.

Падчас вяселля з маладой здымалі вянок, расплятали касу і завязвалі хустку, што сімвалізавала пераход дзяўчыны ў новае для яе становішча – замужняй жанчыны. Касу дзяўчыне мог расплятаць старэйшы брат ці малады хлопец, якому сваты давалі выкуп за стужкі (в. Крупейкі). Аднак сустракаецца варыянт, калі касу расплятала маленькая дзяўчынка 5-6 гадоў (г.п. Лоеў). У в. Карпаўка стужкі вешалі на вокны, а ў в. Бывалькі іх кідалі гасцям: калі яны траплялі ў рукі сяброўкі нявесты, то шлюб будзе ўдалы, а калі ў рукі сябра жаніха, то "мужык будзе біцца" (Запісана ад Сідарэнка Ганны Дзмітрыеўны).

Існаваў на Лоеўшчыне і звычай садзіць маладых на кажух, каб жылі багата. Каб маладыя заўсёды былі разам, ім на галовы клалі века з дзяжы (вв. Крупейкі, Бывалькі, Мохаў і інш.).

Вечарам маладыя накіроўваліся да бацькоў жаніха. Дзяўчына везла з сабой пасаг, які размяшчалі ў хаце жаніха. Туды ж маглі прыйсці і аднавяскоўцы, каб паглядзець, ці багатая нявеста (в. Бывалькі). Уваходзячы ў дом свякрухі, нявеста становіцца на парог і спрыгвае з яго, каб яе любілі ў этым доме" (в. Дзімамеркі). Хто першы з маладых пераступіць цераз парог, той будзе гаспадаром у доме (в. Дзімамеркі). Хто больш адкусіць хлеба, якім сустракаюць маладых іх бацькі, той таксама будзе верхаводзіць у сям'і (в. Дзімамеркі). Каб не было сварак, маладыя пераступалі разам праз "асколкі разбітай нявестай тарэлкі" (в. Дзімамеркі). На другі дзень вяселле працягвалася ў хаце маладога.

Паслявясельная частка вядома на Лоеўшчыне пад рознымі назвамі: "Куры" ("па ўсёй дзярэўні ў тых людзей, што булі на свадзьбе, збіраюць курэй і гуляюць") – в. Дзімамеркі; "Папялішча" (курэй, бутэлькі гарэлкі і інш., што збіраюць па дварах удзельнікаў вяселля, "зносяць у адзін двор к маладой ці к маладому. Папялішча дзелаюць такое") – в. Вулкан; "Збіраць курэй" ("У канцы вечара на жываце бацькі маладога білі гаршчок з попелам", што абазначала канец вяселля) – в. Ліпнякі; "Галоўні" ("збіраюць курэй у тых людзей, хто ўчаствавау у вяселлі") – в. Каўпень; "Пярэзвы" ("чэраз адну нядзелю едуць к маладой, каб паглядзець, як жыве

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

яна. Первы дзень гуляюць у маладой, другі – у маладога, ну, а трэці – гэта апахмелка”) – г.п. Лоеў; “Разгрэбіны” (“кажды, хто гуляець, дае курыцу ці петуха. На палку павесяць і ідуць ужэ. Гулялі, пераадзяваліся ў цыганей”) – в. Вулкан, п. Кірава.

Фальклорна-этнаграфічныя звесткі па вясельнай абраднасці Лоеўшчыны дазваляюць сцвярджаць, што мясцовыя варыянты абраду вылучаюцца як разнастайнасцю дзеянняў, рытуалаў, так і багаццем музычна-песеннага суправаджэння. Гэты факт яшчэ раз падкрэслівае значнасць вывучэння фальклорнай спадчыны Лоеўскага рэгіёна.

Добрай захаванасцю рытуалаў і песень адрозніваецца вясельная абраднасць **Ельскага** раёна, структуру якой складаюць абрады давясельнай часткі, уласнавясельнай і паслявясельнай. Што датычыць давясельнага перыяду, то ў в. Валаўск ён быў прадстаўлены сватаннем-запоінамі (запоіны адзначаюцца ўслед за сватаннем у гэтыя ж дзень, ноч). У сваты звычайна прыходзіла 5-7 чалавек, сярод якіх былі жаніх, бацька жаніха, дружка, дзядзька жаніха (в. Валаўская Рудня). У в. Сугакі сватаць дзяўчыну хадзілі хрышчоныя маці і бацька, маці і жаніх. Сватанне суправаджалася жартоўным іншасказальным дыялогам паміж сватамі і бацькамі нявесты. Напрыклад, у в. Дабрынь першы сват пачынаў гаворку:

– Мы заблудзіліся, пакажыце нам дарогу. Мы чулі, што ў вашай хаце ёсць дзяўчына, а ў нас – гарны хлопец. Ваш тавар – наш купец, наш хлеб – ваша вадзіца, наш хлопец – ваша дзявіца. Пакажыце нам вашу дзявіцу, ці спадабаецца яна нам.

Калі дзяўчына згодна выйсці замуж, то яна выпівае чарку гарэлкі, пададзеную жаніхом, калі ж не згодна на шлюб, то “дае гарбуз” (в. Валаўск). У в. Мядзведнае падчас сватання не адразу паказвалі жаніху яго нявесту, спачатку “выводзілі дзеўку яку другую. І так некалькі разоў выводзілі другіх”. Калі ехалі ў сваты, то гучалі жартоўныя песні з вуснаў дзяўчат, адрасаваныя хлопцам, і наадварот хлопцы выконвалі гумарыстычныя песні, прысвечаныя дзяўчатам.

*А мы думалі, што вы прыехалі,*
*А вы пешкі прыйшлі,*
*Жаніха ў мяшку прыняслі,*
*Яго ногі цяляпаліся,*
*За іх сабакі заядаліся* (в. Мядзведнае)

Калі не было згоды з боку дзяўчыны на шлюб, то яна чаркі з гарэлкай не брала і да родных жаніха не падыходзіла, нават вяртала той хлеб, што прывезлі сваты, і гэта абазначала “гарбуза кінуць”. Цікавым з’яўляецца ў мясцовай вясельнай традыцыі рытуал “сукання свечак”, які адбываўся як у маладога, так і ў маладой. Прыезд дружыны жаніха па маладую суправаджаўся рытуалам “выкупу ёлкі”, што знайшло адлюстраванне ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

адпаведных жартоўных песнях. Пасля таго, як “забралі ёлку”, свахі “на парозе злучалі свечкі”:

*Мір з мірам міруецца,*
*Сваха з свахай цалуецца.*
*На снежном порозе,*
*Да на лютом морозе* (в. Мядзведнае).

Падчас вяселля ў хаце маладога адбываўся пасад маладой; рытуал пераводу маладой у жаноцкі стан здзяйсняла свякруха, якая “завязвае молодой той платок, шо маці молодой дала, і свой платок, а наверх – ленту красную”.

Калі ішлі ў сваты ў в. Дзвіжкі, то гаварылі: “Мы ішлі, заблудзіліся, хочам высватаць долю хлопцу молодому”. Гучалі ў гэты час і песенныя радкі:

*А-у, сенечкі, за дзвермі*
*Ткала Танечка рушнікі,*
*– Ткі, Танечка, хуценько,*
*Ужэ ж твое госці блізенько.*
*– Хай ідуць здаровы,*
*Ужэ ж мої рушнікі готовы.*
У в. Асавы дружкі спявалі, калі ехалі сваты:
*Прыляцеў верабейка, чэ, чэ, чэ,*
*Сеў на акенцы, шчабячэ,*
*Скажу табе, дзевачка, надзею,*
*Што прыедзе Іванка ў нядзелю.*
*Хоць не ў ету, да ў тую,*
*Я яму снеданне згатую,*
*Скажу табе, Манечка, добрую весць,*
*Што твой Іванка на дварэ есць.*
*Застаялась буйна канапелька ў дарозе,*
*Да не даў ёй ветрачок яшчэ болей*
*Пастаяці, лісцікамі шаптаці.*
*Да не даў Іванка яшчэ болей пагуляці,*
*Да расплёў косачку, да разліў слёзачку.*

Па звестках інфарматараў, у в. Бякі на заручынах маладую садзілі на пасад і спявалі песню “Ляцелі галачкі ў тры радочкі”.

Рытуал выкупу “ёлкі” ў гэтай мясцовасці адбываўся пад канец заручын, калі малады забіраў “ёлку” і нёс да сябе. На пасадзе адбываліся абрадавыя дзеянні, звязаныя з пераводам маладой у жаноцкі стан (“завіванне маладой”).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Зборная субота на Ельшчыне вядома пад назвай “ёлка”. Як паведаміла Сцепаніда Гаўрылаўна Шаціла, 1918 г.н., з в. Сугакі, “у лесе зрубалі верх ёлкі, дома ету ёлку ўпрыгожвалі бумагай, вянкі з каласнікамі надзявалі, сукалі свечкі”. Паводле ўспамінаў Зінаіды Міхайлаўны Ляўкоўскай, 1940 г.н., з в. Дубраўка, дзяўчаты плялі тры вяночкі, адзін з якіх надзявалі на галаву, а “два маленькія вяночкі – на рукі, на запясця”. З міфалагічных прыкмет, звязаных з гэтым этапам, інфарматар прыгадала наступнае: “Дружок браў дружку і танцуе з ёю, ды стараецца пасадзіць яе, а яна не даецца. Калі ж пасадзіць, то дзеўка замуж не выйдзе” (в. Дубраўка). У зборную суботу ў вёсцы Казлы дзяўчаты ішлі ў лес, “зрубалі верхавіну сасны”, прыносілі дадому, пры гэтым спявалі:

*Ой, хвоя, хвоя борова,*
*Ты ў боры росла, шумела,*
*Дорогою ішла, звінела,*
*А ў сені ўвайшла – зов’яла,*
*А ў хату ўвайшла –*
*На столе стала, зоззяла,*
*Дзе сабе кветачак набрала.*

Калі ўпрыгожвалі “ёлку”, “сукалі” свечкі з боку жаніха і нявесты:

*Як мы свечачкі сукалі,*
*То ўсе садочкі стопталі,*
*Усе кветачкі сарвалі,*
*Усе кветачкі сарвалі,*
*Ганне свечачку сукалі.*

Пра пасад як асобны абрадавы момант расказалі жыхаркі в. Рамязы Таццяна Антонаўна Бычкоўская, 1929 г.н., і Марыя Васільеўна Ткачук, 1926 г.н.: “З дзеўкі вянка знімалі, падкручваюць косы, свякруха дае хустку і падсмальвае косы нявесце, бо цяпер яны збліжаліся, станавіліся раднёй”. Калі садзілі маладую на пасад, то спявалі песню:

*Станавіся, радзіна, уся ў рад,*
*Ідзе дзевачка на пасад,*
*Коскамі плечыкі ўсцілае,*
*Слёзкамі вочыкі ўмывае.*

Калі ж адбываўся абрад пераводу маладой у жаноцкі стан, то гучалі наступныя песенныя радкі:

*Ой, дай, маці, масла,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Я ж твою коровочку пасла*
*Ад росы до росы,*
*Помазаць косы.*
*Што хоцелі, то зрабілі,*
*З цеста пеляніцу,*
*З дзеўкі молодзіцу* (в. Рамязы)

Каравай рыхтавалі і ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты. З гэтай мэтай запрашалі каравайніц, ролю якіх у в. Казлы, напрыклад, выконвалі хросная маці, сястра, цётка, абавязкова замужнія, шчаслівыя ў сямейным жыцці жанчыны. Кожны этап падрыхтоўкі каравая суправаджаўся песенькамі-ілюстрацыямі пэўных абрадавых дзеянняў. Імкнуліся, каб кожны этап падрыхтоўкі каравая быў дакладным, бо ад якасці выпечкі яго, лічылі, залежыць шчасце маладых. Напрыклад, калі мясілі цеста, то спявалі:

*Я сяду на ганачку,*
*Сядзела, у акенца глядзела,*
*Ці прыйдуць прасіці*
*Мяне каравай мясіці.*

* * *

*Коровай, раю,*
*Я ж каля цябе граю,*
*Ручкамі бяленькімі,*
*Персценькамі срэбранькімі.* (в. Кавалі)

Калі пасля прыгатавання каравая жанчыны мылі рукі, спявалі:

*Коравайнікі, ручкі мыйце*
*Да вішанькі ліце,*
*Каб вішанькі радзіліся,*
*Каб дзеткі любіліся.* (в. Новая Рудня)

Калі пяклі каравай, гучалі наступныя песенныя радкі:

*Наша печ рагоча,*
*Коровою хоча.*
*Прыпячок заліваецца,*
*Коровою дожыдаецца.*

Калі ўжо каравай быў выпечаны, гучалі і такія песенныя радкі:

*Ой, дзе ж тыя кавалі,*
*Што стальныя тапары?*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Трэба печ рубаці,*
*Каравай выймаці.* (в. Новая Рудня)

Калі вымалі каравай з печы, выконвалі адпаведныя каравайныя песні:

*Обозваўся коровай у печы,*
*Одбіў сабе плечы.*
*Шышкі з лускі,*
*Коровай з грэчкі,*
*А нашы дружкі по-шляхецкі.* (в. Кавалі)

* * *

*Обозваўся коровай з печы,*
*Дзе ж мае коровайніцы,*
*Ці на мяду запіліся,*
*Што на мяне забыліся* (в. Дабрынь).

Калі нясуць каравай у камору, спяваюць:

*Перапечы – каравай, перапечы,*
*Ці ёсць сцежачка да клеці.*
*Ёсць сцежачка да маленькая,*
*А на ёй травіца зеляненькая.* (в. Дабрынь)

Абрадавы этап прыезду жаніха па нявесту быў звязаны з выкупам "ёлкі" і "злучэннем" свечак маладых. Прыезд дружыны маладога да маладой у в. Дабрынь суправаджаўся песняй:

*Пусці, сваце, у хату,*
*Нас тут не багата.*
*Хаця ручкі пагрэці,*
*Маладой паглядзеці.*

Як адзначыла Соф'я Карнееўна Антоненка, 1928 г.н., з в. Дабрынь, "сходзяцца баяра з прыданымі, зносяць свахі свечкі і пяюць:

*У цябе свяча і ў мяне,*
*У цябе дзіця і ў мяне.*
*Ой, звядзем свечкі да купкі,*
*Звядзем дзяцей да хаткі.*
*Ой, зацвіла каліначка*
*Да на лютым марозе.*
*Пацалуймося, мая свахначко,*
*На сянечнам парозе.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Мір з мірам міраваліся,*
*Сваха з свахай цалаваліся*
*Да на лютам марозе,*
*На сянечнам парозе.*

Рытуал выкупу “ёлкі” таксама суправаджаецца песнямі. Дружкі сватам спяваюць:

*Прыехалі сваты па ёлку*
*І прывезлі гарэлку.*
*Мы гарэлкі не цураемся*
*І на ёлку памяняемся.*

* * *

*Не гніся, сватко, не гніся,*
*Кладзі чырвонец – садзіся.*
*А не чырвонец да ўсю медзь,*
*З чым прыехаў, з тым і едзь.*
*Уеццa сватко, уеццa,*
*Як лісіца ў лесе,*
*Як салавейко ў стрэсе,*
*Як мыш над крупамі,*
*Так сват над грашамі.*
*Мы думалі, што сваты багаты,*
*Але яны скупаваты.*
*Па месту хадзілі,*
*Старцоў разбівалі,*
*Дружак даравалі.*
*Не ляскай, сватко, пужкаю,*
*Перад нашаю дружкаю.*
*Лясні, сватко, галавою,*
*Перад нашаю маладою.* (в. Дабрынь)

Кульмінацыйным момантам вяселля з’яўляецца дзяльба каравая. Адметнасцю гэтага моманту з’яўляецца рытуал “апяванне каравая”:

*Рано да рано штось у лесе звінело,*
*Рано, рано штось у лесе звінело.*
*Рано да рано не звінело, гаварыло.*
*Рано, рано не звінело, гаварыло.*
*Рано да рано, а ў том лесе новы двор,*
*Рано, рано, а ў том лесе новы двор.*
*Рано да рано, а што в этом во дворэ?*
*Рано, рано, а што в этом во дворэ?*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Рано да рано стоіць столік дубовой,*
*Рано, рано, стоіць столік дубовой.*
*Рано да рано, а што на том століку?*
*Рано, рано, а што на том століку?*
*Рано да рано да ляжыць коровай божы дар,*
*Рано, рано да ляжыць коровай божы дар.*
*Рано да рано, а што в этом короваю?*
*Рано, рано, а што в этом короваю?*
*Рано да рано да семі крыніц вадзіца,*
*Рано, рано да семі крыніц вадзіца.*
*Рано да рано да семі полей пшэніца,*
*Рано, рано да семі полей пшэніца.*
*Рано да рано да семі курак яечка,*
*Рано, рано да семі курак яечка.*
*Рано да рано да семі дварок масліца,*
*Рано, рано да семі дварок масліца.*
*Рано да рано да кому коровай кроіць,*
*Рано, рано да кому коровай кроіць?*
*Рано да рано старшому дружку кроіць,*
*Рано, рано старшому дружку кроіць.*
*Рано да рано, а я, братцы, не маю,*
*Рано, рано да шчэ к тому не смею.*
*Рано да рано, а каму коровай кроіць*
*Рано, рано, а кому коровай кроіць?*
*Рано да рано младшэму дружку кроіць,*
*Рано, рано младшэму дружку кроіць.*
*Рано да рано, а я, братцы, умею,*
*Рано, рано, да шчэ к тому сумею,*
*Рано да рано, а мы эты коровай раскроймо,*
*Рано да рано, да на мір божы раздаймо,*
*Рано да рано да на золотыя тарэлкі,*
*Рано, рано да нап’ёмся гарэлкі* (в. Валаўск).

Падзел каравая суправаджаўся разнастайнымі пажаданнямі, у якіх адлюстраваўся народны светапогляд, знайшлі месца пэўныя маральна-этычныя ацэнкі і ўстаноўкі, эстэтычныя погляды, філасофскае асэнсаванне з’яў навакольнага свету. Чаго толькі не жадалася маладым: багацця, грошай, шчасця, кахання, пашаны ва ўзаемаадносінах, цярплівасці да жыццёвых нягод, працалюбства, умення ладзіць са свёкрамі:

*Дарую молодым грошы, шоб былі хорошы;*
*Дарую рубля, шоб купілі корабля, шоб удзень каталіся, а ўночы кахаліся;*
*Дарую ступу з таўкачэм, шоб не прыходзіла дочка до маткі з плачэм;*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Жадаю молодой, шоб у свякрухі ўмела жыць, ткаць, прасць, шыць і ў свякрухі ўкрасць, бо ў свякрухі така ўласць: як не возьмеш, так не дасць* (в. Мядзведнае).

Развітанне маладой з родным домам – найбольш драматычны момант вяселля, які сімвалічна асэнсоўваўся ў песнях як, напрыклад, у адной з тых, што выконвалі ў вёсцы Сугакі:

*Дзевачка на адыходзе,*
*Пасадзіла арэшка ў агародзе.*
*Расці, расці, мой арэшанька,*
*Маей мамцы на пацешанька,*
*Будзе мая мамка арэшанькі рваці,*
*Мяне ўспамінаці.*

Калі каравай быў падзелены, маладыя збіраліся ад'язджаць да хаты жаніха, пры гэтым спявалі песню:

*Убірайся, не кайся,*
*Убірайся, не кайся.*
*З мамкаю распрашчайся.*
*Закідай, мамко, дрова,*
*Закідай, мамко, дрова,*
*Оставайся здорова.*
*Ты, свякруха, трэскі,*
*Ты, свякруха, трэскі,*
*Сподзявайся нявесткі* (в. Мядзведнае).

Маладая забірае з сабой "сваё дабро", усё, што падрыхтавалі ёй бацькі на ад'езд да маладога (пасцель, падушкі, коўдру, посцілкі). Збіраючы сваё "прыданае", маладая звярталася да маці:

*Ходзем, мамко, у комору,*
*Подзелім добро з тобою.*
*Тобе – ніт бердзечка,*
*А мене – полоценечко.*
*Тобе, мамко, хата, сені і комора,*
*А мене – бодня, скрыня і корова* (в. Казлы).

Калі ад'язджае нявеста, то ў вёсцы Засінцы спяваюць:

*Адступіцесь, ворагі,*
*Да не пераходзьце дорогі,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Няхай пярэедзе Господзь Бог,*
*Шоб у дорозе нам помог.*

Смутак маці і яе шкадаванне ў сувязі са стратай сваёй надзейнай памочніцы ў дамашніх гаспадарчых справах перададзены ў радках:

*Агляніса, маці, на ўглы ў хаце,*
*А ляжы ў куточку,*
*Павязем тваю дочку.*
*Закідай, мамка, дрова,*
*Оставайся здорова,*
*А ты, свякруха, трэскі,*
*Да спавядайся нявесткі.*
*Да пабачыш, мая мамачка, без дачкі*
*Папрарастаюць па-за лаўкамі казлячкі,*
*А ложачкі пад лаўкамі возьмуцца мураўкамі.* (в. Засінцы)
Калі маладыя пад'язджаюць да хаты маладога, то спяваюць:
*Да збірайцеся, дзецi,*
*Да збірайцеся, дзеці.*
*Прывезлі медзвядзішча,*
*Прывезлі медзвядзішча,*
*Да на новае сялішча* (в. Мядзведнае).

У гэты час да маладой падносілі дзяжу, і калі яна захавала цнатлівасць, то станавілася на яе. Паводле ўспамінаў Надзеі Аляксееўны Бурмэль, 1938 г.н., з в. Мядзведнае, "потом молода прыбірае хату молодому своім прыданым, вывешвае на показ, послі свякруха завязвае молодой той платок, шо маці ёй дала, і свой платок, а наверх – ленту красную". У в. Казлы, калі маладыя ўжо пад'язджалі да падвор'я жаніха, спявалі:

*Выйдзі, матухно, поглядзі,*
*Што табе бояры прывязлі:*
*Ці сіву казу, ці осла,*
*Ці табе нявеста хороша?*
У адказ з вуснаў нявесты гучала:
*Ой, хорош, хорош дзятлаў нос,*
*Такую ж мяне і Бог прынёс.*

Гасцей з боку маладой ("прыданых") сустракаюць "са стаканчыкам, з гарэлкаю, закускаю, усіх частуюць і запрашаюць у хату" (в. Валаўск).

Вясельнае застолле ў хаце маладога завяршаецца дзяльбой каравая, пасля чаго, напрыклад, у в. Валаўск малады павінен быў падараваць цёшчы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

новыя чобаты, папярэдне пасадзіўшы “яе на лаву і вымыўшы ёй водкою ногі”:

*Чоботы, чоботы, вы мое,*
*Наробілі клопоту вы мое* (в. Валаўск).

Паслявясельная частка ў вёсках Ельскага раёна мае такія назвы, як “хвост”, або “прасці вучыць”. Паводле выказвання Вольгі Максімаўны Лобан, 1940 г.н., з в. Кочышчы, гэты абрадавы момант “лучшэй гуляюць, чым свадзьбу, прыбіраюць старых людзей як маладых, старую жанчыну нараджаюць за хлопца, а мужчыну – у дзяўчыну, вянка надзяюць, вянчаюць, завіваюць, варожаць, хто будзе галава сям’і. Пасля завівання глядзяць, хто ўперад скочышь з-за стала: “як ад боку дзеўкі ўперад скочыць жанчына, што завівае, то жанчына будзе галоўнай у сям’і, калі ж з боку мужчыны хутчэй скочыць завівальніца, значыць, мужчына будзе галава сям’і”.

Рыхтуюць імправізаваны каравай (“ложаць у чугун картошку сырую”), выклікаюць гасцей з пажаданнямі на каравай, жартуюць, спяваюць, “калі маладую вядуць да маладога, то імкнуцца што-небудзь украсці з дзявочага двара: дзяжу, ступу, курэй, кароў” (в. Кочышчы). Непаўторнай і багатай на народныя выдумкі была паслявясельная частка. У вёсках Казлы і Сугакі на трэці дзень вяселля “хадзілі па пярэзвах, пачынаўся сапраўдны маскарад, пераапраналіся цыганамі, “лавілі пеўня, паілі гарэлкай, танцавалі, рыхтавалі для маладых кашу з пеўнем”. У в. Мядзведнае “выносілі прасніцу, лён, каб нявеста прала, паказала сваё ўмельства”. Як паведаміла Ганна Трафімаўна Клабук, 1938 г.н., з в. Асавы, пасля вяселля маладыя абменьваліся вельцамі, якія рабілі перад вяселлем: “высякуць з грушы трайчатку, кветкамі пакрасуюць і ў канцы вяселля абмяняюцца маладыя, на канец страхі вельцо прыб’юць, дык і відна, колькі свадзьбаў у вёсцы было”.

Вясельная абраднасць у **Добрушскім** раёне захоўвае агульнарэгіянальную аснову і вызначаецца мясцовымі асаблівасцямі. У структуры вяселля можна вылучыць такія абрадавыя этапы, як магарыч, заручыны, каравай, выкуп маладой, дзяльба каравая, вяселле ў хаце жаніха. На магарычы дамаўляліся аб тэрмінах вяселля, а таксама маладая адорвае падарункамі свёкра і свякруху. На заручынах адбываўся рытуал “завівання вельца”: “Вілі, вілі вельца з бярозкі, // Пайшлі дзевачкі цвярозкі”. У вёсцы Ніўкі на вяселлі меў месца выкуп маладой з боку дружыны жаніха. Абрад дзяльбы каравая здзяйснялі два дружкі, перавязаныя ручнікамі.

У вёсцы Ачэса Рудня сватанне і запоіны складалі давясельную частку. Сярод рытуалаў давясельнага перыяду варта адзначыць такія, як рытуальны дыялог паміж бацькамі маладой і сватамі, перавязванне жаніховай маці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ручнікамі сватоў, адорванне з боку маладой бацькоў маладога падарункамі. Паслявясельную частку ў вёсцы Васільеўка адзначалі ў панядзелак (“папялішча”), у аўторак (“адводзіны”). Паводле ўспамінаў Ніны Платонаўны Філімонцавай, 1937 г.н., “у панядзелак – папялішча, калі сундук прывязуць, курэй смаляць. Казалі: “Папялішча пойдзем дуць. Свадзьба ж то ўчора была, а сёння пойдзем папялішча дуць, курэй збіраць, смаліць”. Курэй назбіралі, пачынаюць смаліць, а тады крупнік вараць і садзяцца за стол, і папялішча дуюць”.

Шматлікімі міфалагічнымі прыкметамі і павер’ямі вызначаліся вясельныя этапы ў гэтай мясцовасці, напрыклад, лічылася, што калі некалькі дачок у сям’і, то трэба сватаць старэйшую. Пасля ад’езду сватоў нельга было зачыняць дзверы на замкі, бо інакш “дзяўчына замуж не выйдзе”. Забаранялася падмятаць хату. Асцерагаліся, каб кот дарогі не перабег, калі раптам так адбывалася, то “нада за гузік хватацца, каб была ўдача”.

Сімвалам згоды на шлюб падчас сватання з’яўлялася такая прыкмета: “калі ўжо сваты заходзяць у хату, то кладуць на стол хлеб, булку, як толькі цёшча возьме і адрэжа кусок, паложа, значыць яна сагласна, а як хлеб забірае са стала і аддае ў рукі, значыць, усе сваты ідуць дамоў, не сядаўшы. Калі нявеста не згодна на шлюб, то жаніху прывязваюць чайнік, і той павінен выйсці з чайнікам, а тады ўжо хлопцы з яго смяюцца. Ну, хто што робіць. Хто з веніка матузку дае, хто чайнік, хто ступку” (в. Васільеўка, ад Філімонцавай Ніны Платонаўны, 1937 г.н.).

Верылі вяскоўцы, што “калі маладую везлі на кані, і ён распрогся, то і жыццё маладых так жа павінна разбурыцца”. Засцерагальнай магіяй тлумачыцца пераезд маладых праз раскладзенае вогнішча (“клалі агонь, і штоб цераз агонь пераехаў конь, каб ачысціць маладых ад усякай нечысці”).

Абрадавы этап “сватанне” ў вёсцы Тонеж **Лельчыцкага** р-на вядомы пад назвай “магарыч”, падчас якога і дамаўляліся бацькі жаніха і нявесты наконт вяселля.

З выпечкі каравая і пачынаецца вяселле. Было традыцыйна агульнапрынятым правілам – запрашаць для падрыхтоўкі каравая “багатых людзей, шчобы не было ўдовы”. Спачатку вяселле гулялі ў маладога, а затым ён са сваёй дружынай ехаў да маладой. У структуры мясцовай вясельнай традыцыі важнае месца займае рытуал выкупу маладой, які ілюструецца ў адпаведных песенных радках:

*Маршалок харошы,*
*Маршалок харошы,*
*Да бері свої грошы,*
*Ідзі на вуліцу,*
*Купі жонкі сподніцу.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Цікавымі абрадавымі дзеяннямі вылучаецца і рытуал, звязаны з ёлкай: "ім ужэ, гэтым хлопцам-маршалкам, нада ўкрасці етую ёлку ад дзявок". Кожны вясельны этап суправаджаўся адпаведнымі песеннымі тэкстамі, напрыклад, калі малады забіраў маладую пасля вясельнага застолля, то гучалі наступныя радкі:

*Ето ж тобе, маці,*
*Ето ж тобе, маці,*
*Чатыры вуглы ў хаці,*
*А пяты ў куточку,*
*А пяты ў куточку,*
*Павязом тваю дочку.*
*Шосты на парозі,*
*Шосты на парозі,*
*І твая дочка ў дарозі.*

Структура вясельнай абраднасці ў вёсцы Грэбені Лельчыцкага р-на ўключае такія абрадавыя этапы, як сватанне, каравай, ёлка, свечкі, прыезд дружыны маладога (перапой), дзяльба каравая, вяселле ў маладога, трэці дзень вяселля. Звернем увагу на мясцовыя асаблівасці вясельных этапаў і звязаныя з імі вераванні.

На сватанні ў в. Грэбені меў месца рытуал паказу "падстаўленай" нявесты. Сімвалам згоды на шлюб з боку маладой былі словы маладой "На здароўе" ў адказ на пажаданне маладога "Будзь здарова". Сімвалам адмовы жаніху з'яўляўся гарбуз, які "выкочвалі з хаты". Асаблівасцю падрыхтоўкі цеста на каравай з'яўляўся той факт, што кожная каравайніца спачатку "месіць асобна патрошку цеста, а затым усё цеста складаюць уместа і месяць далей".

Абавязковым момантам лельчыцкага вяселля з'яўлялася ёлка, якую "ў намечаны дзень дружкі маладой вырубалі ў лесе, а дзеўкі ўпрыгожвалі кветкамі і вешалі кошт". Спецыфічным мясцовым фактам з'яўлялася падрыхтоўка як з боку жаніха, так і з боку нявесты свечак: "кожны бок робіць сваю свечку, робяць яе 3, 5, 7 жанчын, якія добра жывуць у пары". Рытуал "злучэння свечак" маладых адбываўся, калі дружына маладога прыязджала за маладой, і здзяйснялі гэтыя сімвалічныя дзеянні магічнага яднання маладой пары хросныя маці нявесты і жаніха. Што датычыць "ёлкі", то ў выніку торгу паміж сватамі і дзяўчатамі, "верх ёлкі ломяць і кідаюць у пары, каб дзеўкі хутчэй ішлі замуж".

Цікавым вясельным момантам з'яўляецца сам прыезд маладой у хату свякрухі, а таксама адметныя і тыя рытуалы, што тут адбываліся: развешванне, напрыклад, "закосянкамі прыдання" маладой.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Абрад завівання маладой уключаў наступныя абрадавыя дзеянні: “знімалі з галавы нявесты ўбор, маслам мазалі косы, завязвалі дзве хусткі: чырвоную і белую, махалі хросныя маці хусткай над галовамі маладых, мяняліся месцамі і хутчэй імкнуліся сесці (“якая хутчэй сядзе, тая будзе і спрытнейшая”).

Для структуры вясельнага абраду **Брагіншчыны** характэрны такія этапы, як сватанне, магарыч, оцьведы, змовіны, каравай, прыезд маладога да маладой, вянчанне, вясельнае застолле ў маладога, па бяседах (в. Савічы). Вясельныя этапы ў в. Залессе – гэта сватанне, другі дзень вяселля, прыезд маладога да маладой, завіванне маладой, трэці дзень вяселля; у в. Калыбань – сватанне, першы дзень вяселля, другі дзень вяселля, цыганы.

На тэрыторыі Брагінскага раёна ў сваты прыходзілі ў суботу вечарам, праўда, колькасць сватоў у розных вёсках была неаднолькавая. Іншы раз колькасць удзельнікаў гэтага вясельнага этапу ахоплівала 15-40 чалавек, “пасля вячэры сватоў перавязваюць палаценцамі, жанок перавязваюць платкамі, дзявок – плаццямі і дагаворваюцца аб вяселлі”. У вёсцы Калыбань Брагінскага раёна сваты прыходзілі звычайна ў пятніцу, сватанне ж называлася магарычом, на якім прысутнасць нявесты была абавязковай. Як адзначыла Г.М. Лісіца, “у нядзелю маці маладога збірае кумоў, сясцёр і ідзе на пагляднае, нясуць падарункі нявесце і дагаворваюцца аб вяселлі”.

Своеасаблівым было сватанне і ў вёсцы Савічы Брагінскага раёна. Як адзначыла М.М. Кудан, у сваты хадзілі ўтраіх – жаніх і два добра знаёмыя мужчыны. Калі ж ужо высватаюць нявесту, то клікалі хросных. Дзяўчына не адразу давала згоду на шлюб, “дзеля смеху”, як растлумачыла інфарматар, “прычэплівалі да хлясціка фуфайкі жаніха коўш з вадой, штоб пацёг па хаце”, падкрэсліваючы гэтым, што “дзеўка не хацела ісці замуж”. Такое абрадавае дзянне выконвалі ўсе тры сваты. Сімвалам жа згоды на шлюб з’яўляўся разрэзаны нявестай пірог. Паводле звестак М.М. Кудан, “як разрэжа адразу, добра жыць будуць маладыя, а калі там рэжа ды яшчэ падумае, да і зноў і другі, і трэці раз, то ўжэ кажуць, што пагана будуць жыці”. Лакальнай адметнасцю вясельнай традыцыі ў вёсцы Савічы з’яўляўся магарыч, калі ў хаце нявесты збіраліся яе блізкія родзічы (родныя цёткі, дзядзькі, хросная маці, хросны бацька) і частаваліся. Асобным этапам у давясельным перыядзе вылучаліся “оцьведы”, калі ў госці да маладой прыходзілі родзічы жаніха і прыносілі падарункі. Паводле ўспамінаў М.Т. Кузьмянок з вёсцы Міхнаўка Брагінскага раёна, жаніх і нявеста перад тым, як выпіць першую чарку, павінны былі сказаць: мама і папа, давайце вып’ем, гэта значыць, што жаніх такім чынам звяртаўся да бацькоў нявесты, а нявеста – да бацькоў жаніха. Калі нявеста была згодна на шлюб, то “пераразала хлеб, які прыносілі сваты, адну яго палавінку выносіла на вуліцу, дзе звычайна збіраліся яе сяброўкі, і кідала хлеб уверх. Было пакое павер’е: хто першы зловіць гэты хлеб, той наступны пойдзе замуж”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асноўныя рытуалы вясельнага застолля ў маладой у в. Савічы – гэта завіванне маладой, благаслаўленне маладых. Паслявясельная частка ў в. Савічы мела назву “па бяседах” – удзельнікі вяселля прымалі на сваіх падвор’ях гасцей: “спачатку ідуць к хросным, тады бяседа ўжо ідзе к бабам, а тады ўжэ к дзядзькам, цёткам і другім гасцям”. Песенныя тэксты, запісаныя ў в. Нудзічы Брагінскага р-на, ілюструюць асноўныя абрадавыя вясельныя моманты і рытуалы: напрыклад, заручынныя песні (“Заручаеш мяне, мамка, заручаеш”), песні на пасад (“Станавіся, радзіначка, уся ў рад”), каравайныя (“Караваю, караваю, я ля цябе добра йграю”) і інш.

У каравайнай абраднасці меў месца цікавы рытуал “пасыпання маладых шышачкамі з цеста”. Прыезд маладога да маладой вызначаўся рытуалам выбару сапраўднай маладой з ліку падстаўных нявест.

Падрыхтоўка каравая суправаджаецца кароценькімі песенькамі, якія ілюструюць асноўныя абрадавыя этапы, напрыклад, калі расчыняюць каравай “замужнія паважаныя шчаслівыя жанчыны, якія добра жывуць”, то прыгаворваюць:

*Із сямі крыніц вада,*
*Із сямі пшаніц мука,*
*Загранічнае масла*
*І яец паўтараста* (в. Савічы).

Каравайніцы, рыхтуючы абрадавы вясельны хлеб, адносіліся да гэтай справы надзвычай адказна і сур’ёзна. Ад якасці выпечанага каравая залежыў лёс маладых, шчасце ў іх сямейным жыцці. Важнасць каравайных рытуалаў пацвярджалі і песенныя радкі, якія гучалі падчас самой выпечкі каравая:

*А, караваю-караваю,*
*Я ля цябе добра граю.*
*Хачу цябе не спаліці*
*Да ўвесь род абдзяліці* (в. Савічы).

Падчас сватання ў в. Пажаркі Брагінскага р-на адбываўся рытуал абменьвання хлебам паміж бацькамі маладых. Сімвалам згоды на шлюб з’яўляўся разрэзаны маладой “хлеб папалам”. Інфарматары пацвердзілі дзейнасць у сістэме вясельнай абраднасці як сімвала замацавання шлюбу не абраду царкоўнага вянчання, а дзяльбы каравая.

Рытуал выкупу пасагу нявесты адбываецца напрыканцы вясельнага застолля ў маладой, а на вяселлі ў маладога “маладую пераводзяць у жаноцкі стан”: “знімаюць з галавы маладой вянок з лентамі, вешаюць яго на ікону, а на галаву маладой адзяваюць хустку, стукаюць маладога з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

маладой галовамі, каб жылі ў саглассі” (в. Пажаркі). Паслявясельная частка ў гэтай мясцовасці мае назву “цыганы”.

Значную ролю ў фарміраванні нацыянальнай ментальнасці жыхароў **Чачэрскага** р-на адыграла вясельная паэзія. Можна вылучыць наступныя абрадавыя этапы вясельнай абраднасці: сватанне, заручыны, ёлачка, выпечка каравая, прыезд дружыны жаніха па нявесту, вянчанне, першы дзень вяселля, другі дзень вяселля, трэці дзень вяселля (“Курыца”).

Сватанне на Чачэршчыне адбывалася позна ўвечары. У сваты звычайна ішлі хросны бацька, старэйшы брат ці дзядзька, малады з дружкамі. У іншасказальнай форме сваты паведамлялі аб мэце свайго прыходу: “Вось ехалі мы па вашай вёсцы, і сказалі нам, што ў гэтай хаце прадаецца добрая цёлачка. Хочам мы на цёлачку паглядзець. Калі цёлачка будзе добрая, мы яе купім, бо ёсць у нас бычок. Загаруніўся ён адзін” (в. Матнявічы). Калі збіраліся ехаць у сваты, то ў в. Палессе выконвалі песню:

*У дарозе Валодзька начуе,*
*А дома Марына вячэру гатуе,*
*Рыбачку з ікрою.*
*Прыедзе Валодзька з сястрою.*
*Мы тую рыбачку паядом,*
*Сабе Марынку павядзём.*

Як паведамілі ў в. Залессе, “у першы дзень сваталіся, а на другі дзень дамаўляліся, дзе свадзьбу гуляць, колькі гасцей, каго зваць, у каго гуляць: у жаніха, нявесты, у двух дамах”.

На заручынах прысутнічае ўжо большая колькасць людзей, родзічы жаніха, радня і сяброўкі нявесты. Гучыць той жа рытуальны дыялог, што і на сватанні:

– У вас – тавар, у нас – купец, глядзіце, які маладзец. Мы прыехалі здалёку, шукаем дзяўчыну, ясну красачку. Людзі падказалі, што ў вас ёсць.

– Дык у нас жа многа ясных красачак. За якой жа вы прыехалі? Выбірайце.

Падводзяць да сватоў, паводле ўспамінаў Фядоры Мікалаеўны Кавалёвай, 1925 г.н., з в. Каменка, сяброўак нявесты, якіх сваты “абзываюць “касая”, “крывая”, “злая”, пакуль да іх не падводзяць нявесту”. Выконваецца песня:

*А мы пойдзем на заручыны,*
*А ў іх сенцы закручаны.*
*Пакуль сенцы адкруцілі,*
*Нашу Галечку заручылі* (в. Каменка).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Звычай утойвання маладой, паказ “падстаўных нявест” адлюстроўваў старажытныя ўяўленні нашых продкаў, вытокі якіх былі звязаны з апатрапеічнай (ахоўнай) магіяй.

У пятніцу перад вяселлем, як адзначыла Вольга Пятроўна Дзяржынская, 1932 г.н., з в. Матнявічы, “збіраюць дзявічкі”, дзеўкі наражаюць ёлку, пры гэтым спяваюць песню:

*Наша ёлачка зіму і лецечка зелена,*
*Наша Ганначка ўсю нядзелю весела.*
*Наша ёлачка зіму і лецечка зелена,*
*Наша Ганначка ўсю нядзелю весела.*
*У пятніцу па ваду ішла засмучона,*
*А ў суботу вяночак пляла, плакала.*
*У пятніцу па ваду ішла засмучона,*
*А ў суботу вяночак пляла, плакала.*
*Не плач, не плач, мамачка дарагая,*
*Не плач, мамачка родная.*
*Благаславі сваю дачушку ў доўгую дарогу,*
*Благаславі сваю дачушку ў доўгую дарогу.*

З “вярхушкай ёлкі” звязана цікавая міфалагічная прыкмета: на вяселлі “маладая абязацельна павінна сарваць гэтую вярхушку, значыць, яна будзе мець верх над маладым, ваабшчэ ў доме верх над усімі” (в. Матнявічы). На “дзявічках” (“ёлцы”) выконвалі і такую жалобную песню, як “Баравыя васілёчкі”:

*Баравыя васілёчкі зацвілі,*
*А ўсе горы камяныя ўслалі.*
*Туда ішла Ганначка ціхенька,*
*А за ёю яе мамачка блізенька:*
*– Не йдзі, не йдзі, мая мамка, за мною,*
*Цяжолая разлука нам з табою.*

Малады едзе па маладую з 2-3 паджанішкамі і са сваёй сястрой (“свяцілкай”), якая трымае ў руках дзве свечкі. Дружыне маладога, па словах Ф.М. Кавалёвай, 1925 г.н., з в. Каменка, перагароджваюць длінная жэрдкай дарогу – “ловяць зайца”. У гэты час дружкі з маладой выконваюць песню:

*Стукнулі, грукнулі сані на дварэ.*
*– Паглядзі, мамачка, ці ні па міне.*
*– Па цібе, дачушка, па цібе.*
*– Гатуй, мамачка, кублік мне.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*– Едзь, мая дачушка, без кубла,*
*Ты мае кудзелькі не скубла.*
*– Скубла, мамачка, шамацела,*
*За Іванечку хацела.*

Гэты вясельны момант уключае рытуал выкупу нявесты і ёлкі, адорвання з боку маладой падружкамі свяцілкі, маладога і паджанішнікаў, рытуал расплятання касы маладой. Будучы лёс, сямейнае шчасце маладых вызначалі па запаленых свяцілкай свечках: “Калі слязіцца свечка маладой – будзя плакаць, калі тухня – не будзя жыць з мужыком”.

Калі збіраюцца везці нявесту да маладога, то спяваюць песню, “прыбіраючы дугу лентамі, паперай”:

*– Нежаласлівая Галечка*
*Не разжаліла мамку сваю.*
*– Як захачу, дык разжалю.*
*Павешу ўплёт на прыплёт,*
*Куды мая мамка ў клець ходзя.*
*У клець ідучы, забача,*
*А з клеці ідучы, заплача:*
*– Гэта мае дачушкі ўплёты,*
*Усё дзявочае работы* (в. Каменка).

Калі маладая пакідае бацькоўскі дом, папярэдне атрымаўшы благаславенне ад бацькоў, то развітваецца: “Станьце, мае родныя, у парозі, пакланюся я вам у дарозі”. Адначасова гучалі наступныя песенныя радкі:

*Ехала Галечка з двара далоў,*
*Зламіла ў бярозы верх далоў.*
*– Расці, мая бярозка, без верха,*
*Жыві, мая мамачка, без міня,*
*Без мае русыя косачкі.*
*Не адзін год я яе часала*
*І за адзін вечарок прайграла.*

У в. Мяркулавічы, калі маладыя едуць да жаніха, выконваюць песню, адрасаваную свякрусе:

*Выйдзі, мамачка, паглядзі,*
*Што табе баяры прывязлі.*
*Скрыню-пярыню,*
*Шчэ й маладую княгіню.*
*Пярынаю будзеш накрывацца,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*А княгіню будзеш пасылаць.*

У сувязі з апошнім песенным радком існавала такое міфалагічнае павер’е, калі “назаўтра свякруха пасылала нявестку па ваду. Каго маладая сустрэне, той і народзіцца: калі мужчыну – хлопчык народзіцца, жанчыну – дзяўчынка народзіцца” (в. Мяркулавічы).

Сустракалі маладых бацькі жаніха, прычым свякруха, як паведаміла Ф.М. Кавалёва, 1925 г.н., з в. Каменка, “ссаджвала маладую з воза і адзявала на яе галаву платок, а свёкар браў ікону з рук маладой і нёс яе на кут”. Затым яна падносіла маладым чаркі, звяртаючыся да сына:

*Не пі, Ванечка, чаркі,*
*А выллі коніку за грыўку,*
*Штоб яго грыўка каляна была,*
*Штоб тая Галечка слухмяна была.*

Малады выліваў чарку, а маладая крыху выпівала. У гэты час у хаце маладога вывешвалі “рушнікі, скацеркі, пасцілкі, коўдры, каб паказаць прыданае маладой” (в. Каменка).

Радня маладой, уваходзячы ў хату, выконвала жартоўную вясельную песню:

*А ў нашага свата*
*Некрытая хата,*
*Ні клеці, ні павеці,*
*Некуда маладую дзеці.*
*А дзе вы нашу маладую дзелі?*
*Ці ў клець схавалі,*
*Ці па ваду паслалі?*
*У клеці сядзіць, занізкі ніжа,*
*Чырвоненькія, зялёненькія* (в. Каменка).

Паводле ўспамінаў Г.Р. Афанасенка, 1915 г.н., з вёскі Будзішча (цяпер жыве ў в. Урыцкае Гомельскага р-на), калі “нявесту прыводзяць у хату жаніха, то бабы бяруць нявесту і вядуць у клець, там ёй скручваюць валасы платком”. Пры гэтым выконваецца песня:

*Хадзіў-брадзіў добры моладзец*
*Па крутой гарэ,*
*Завіваў ён русы кудзелькі*
*Ой, на буйнай галаве,*
*Знадаела мне, знадаела мне*
*На чужых жа то завіваючы,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Маладзічак заглядаючы.*

Кульмінацыйным момантам вясельнай абраднасці з’яўлялася дзяльба каравая. Сват звяртаецца да ўсіх прысутных з прапановай каравай дзяліць: “Госцейкі дарагія, срэбныя, залатыя! Паміж нас маладая – кветка палявая. Яна начэй не спала, каравай рыхтавала. Сама сеяла, сама веяла, сама выпякала, сама ж нас на гэта вяселле гукала. Дык дазвольце каравай пачаці, маладым долі-шчасця пажадаці” (в. Іванаўка). У гэты час спяваюць песню:

*Ой, не дарыце, пагадзіце,*
*Пакуль Госпад Бог прыйдзе.*
*Госпад Бог ідзе, долю нясе.*
*Цяпер мы дарыць будзем.*
*Ой, не дарыце, пагадзіце,*
*Пакуль мамачка прыйдзе,*
*Родная прыйдзе.*
*Мамачка ідзе, хлеб з соллю нясе.*
*Цяпер мы дарыць будзем.*

Загадзя падрыхтаваны каравай жанчына-каравайніца, шчаслівая ў сямейным жыцці, ставіць на галаву і нясе ў хату з клеці пад гукі песні:

*Ішоў каравай па масту,*
*Сустрэў каравай старасту,*
*Сустрэў каравай старасту.*
*Хто ж цябе, каравай, наліваў,*
*Хто ж цябе, каравай, наліваў?*
*Налівалі каравай пчолачкі,*
*Налівалі каравай пчолачкі,*
*А ўсе мужнія жоначкі,*
*А ўсе мужнія жоначкі.*
*Хто ж цябе, каравай, выкупя,*
*Хто ж цябе, каравай, выкупя,*
*А нам сто рублей выплаця?* (в. Матнявічы)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У шматлікіх каравайных пажаданнях знайшлі адлюстраванне народныя маральна-этычныя нормы сямейнага і грамадскага жыцця:
*Дару маладым гадзіны, каб на будучы год пазвал на радзіны.*
*Дару курачку-квактуху, каб Ганначка слухала свёкра і свякрушку.*
*Дару вам пялёнку, каб завярнулі Алёнку.*

*Падарыла б гуся, да мужыка баюся, падарыла б курыцу, ды ўцякла на вуліцу. Дык дару дам пару галубоў, каб да гробу была верная любоў (в. Матнявічы).*

*Дарую вам хлебам і соллю, шчасцем і доляй, на мае дары, дачушка, выбачай, сама рана ўставай, мужа пабуджай, багацце нажывай (маці маладой).*

*Дарагія дзеці, жадаю вам, каб у вашым дамочку, у вашым хлявочку, у вашым садочку ўсе радзіла і пладзіла (бацька маладой).*

Пасля каравая маладых клалі спаць, а раніцай адбываўся рытуал “агледзін пасцелі, сарочкі маладой”. Як паведаміла Ф.М. Кавалёва з в. Каменка, “калі маладая – дзеўка, яе горда ставілі на дзежку, а калі не, то не ставілі. Ета шчыталася пазорам”. З міфалагічных прыкмет і павер’яў, звязаных з вяселлем, Ф.М. Кавалёва назвала наступныя: “Радаваліс, калі на свадзьбу ішоў дождж, шчыталі, што ета к багацтву. Калі ідзе дождж на свадзьбу, то казалі, што маладыя любілі прыгаркі есці”.

Другі дзень вяселля на Чачэршчыне быў звязаны з узаемным наведваннем гасцямі жаніха радні нявесты, а трэці дзень вяселля пад назвай “курыца” ўяўляў сабой своеасаблівы спектакль, у якім, па словах Міколы Козенкі, “паўтараліся ў жартоўна-гратэскавай форме часткі некаторых папярэдніх вясельных абрадаў і рытуалаў” (Вясельная курыца // Мастацтва, 1995, № 8). Еўдакія Пятроўна Маслава, 1948 г.н., з в. Залессе падкрэсліла, што “на трэці дзень усе госці к абеду ішлі ад нявесты да жаніха, курыцу маглі задушыць адразу, а маглі жывую смаліць. У жаніха дома варылі курыны суп. Усе садзіліся за стол і павінны былі папробаваць курыны суп”.

Сабраны матэрыял па вясельнай абраднасці яскрава прадэманстраваў карціну багатай мясцовай варыянтнасці як асобных этапаў абраду, паслядоўнасці, характару эпізодаў і рытуалаў, назваў, так і песеннага складу палескага вяселля, якое, аднак, устойліва захоўвае агульную структуру беларускай вясельнай абраднасці. Канкрэтныя ўмовы бытавання напаўняюць вясельны абрад у кожным выпадку спецыфічнымі мясцовымі асаблівасцямі, якія і ствараюць яго шматколерны воблік.

У вясельным абрадзе **Буда-Кашалёўскага** раёна можна вылучыць такія этапы, як сватанне, заручыны, выпечка каравая, вяселле (3 дні), адведкі. Сватанне адбывалася звычайна ў суботу, у сваты хадзілі бацька жаніха, жаніх, маці, родзічы (вёска Кашалёў), у вёсцы Бацунь у сваты ішлі толькі мужчыны.

Дыялог, які адбываўся паміж бацькамі нявесты і сватамі з боку жаніха, дапамагаў высветліць галоўнае пытанне – ці згодна дзяўчына на шлюб. Калі яна давала згоду выйсці замуж, то кланялася сватам, ставіла посуд на стол. Пасля дасягнення ўзаемнай дамоўленасці аб шлюбе нявеста абвязвала ручнікам усіх сватоў, а жаніху завязвалі хустку на шыю. Пахвала ў адрас дачкі гучала не толькі ў час рытуальнага дыялогу з боку яе бацькоў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

што яна і “старанная, і разумная, і слухмяная, і з твару прыгожая, і зварыць, і спячэ, і ткаці, і прасці ўмее”, але і ў спецыяльнай песні “Сваткі любімыя”:

*Сваткі любімыя,*
*Дружкі любезныя,*
*З нас вачэй не варацiця,*
*На нас, любезныя, узгляніце*
*Ды і саміх сябе пакажыця.*
*Глядзіця, вот наша нявеста,*
*Не храма, не крыва.*
*Яна тонка прадзець,*
*Кросны звонка тчэць,*
*Халсты бела беліць.*
*Напрала, наткала,*
*Дар’я наспраўляла* (в. Дземідоўка).

У вёсцы Кашалёў, калі ўжо дзяўчыну высваталі, то спявалі песню:

*Запіта дзеванька, запіта,*
*Шоўкам хустанька шыта.*
*Запівалі яе ўначы,*
*Вышывалі хустаньку пры свячы.*
*Запівалі яе ўвесь род,*
*Родны баценька напярод.*
*Ох, п’яна я ды хілюся,*
*Іду дадому ды баюся,*
*Паганага мужа маю,*
*Будзе біці – добра знаю.*

Асноўнымі рытуаламі заручын на Буда-Кашалёўшчыне з’яўляліся наступныя: абменьванне пярсцёнкамі, заплятанне касы нявесты, звязванне ручніком рук маладых над хлебам, “упрыгожванне ёлкі”, якая з’яўлялася сімвалам жыцця, маладосці, дзявоцтва, прыгажосці. Паводле ўспамінаў Ганны Іванаўны Бажанковай, 1911 г.н., з вёскі Кашалёў, “калі маладую вязуць да маладога, то ад ёлкі стараліся прынесці дамоў кветкі, упрыгажэнні”, што павінна было прынесці шчасце ўсёй сям’і.

Заручыны замацоўвалі згоду нявесты на шлюб і суправаджаліся песнямі:

*Прапіў бацька дачку*
*На салодкім мядочку*
*Ды й на белай тарелцы.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Ды й на белай тарелцы,*
*Ды й на горкай гарэлцы.*
*Да напіўшыся, скача,*
*Да напіўшыся, скача,*
*А праспаўшы, усё плача:*
*– Куды ж маё да дзіця пайшло,*
*А ці ў бор да па ягады?*
*А ці ў бор да па ягады,*
*Ці ў святліцу за вадзіцай?*
*Сватачка, сватачка, мая мамачка,*
*Глядзі ж майго да дзіцятачка* (в. Іванаўка).

Напярэдадні вянчання ў хаце бацькоў маладой адбываўся такі вясельны абрадавы момант, як пасад, калі нявесту садзілі на дзяжу, засланую кажухом (навыварат). Брат ці сястра маладой вялі яе на пасад, прычым дарожка да дзяжы замятаецца вышытым ручніком, каб быў светлы шлях у жыцці. Маладой расчэсвалі косы і грэбень закідвалі на печ.

Калі вялі маладую-сірату на пасад, выконвалі песню:

*Станавіся, радзіначка, уся ў рад,*
*Да вядуць Наташку на пасад.*
*На пасад пасаджана, як лебядзінка,*
*А Наташа-сірацiначка.*
*Усю радзіначку яна абышла,*
*Свае роднай мамкі не знайшла.*
*Усю радзіначку мінае,*
*Сваю родну мамку шукае.*
*Галовачка мая бедная ў вяночку,*
*Няма мае роднай мамкі ў радочку.*
*Галовачка мая бедная ў цвеце,*
*Няма мае роднае мамкі ў свеце* (в. Сінічына, п. Расцяробы).

Матывамі смутку і журбы прасякнуты і наступны тэкст песні, якой суправаджаўся пасад у вёсцы Кашалёў:

*Галечка дзевачак сабрала,*
*Сабрала забор таткаў –*
*Гібкія лавачкі масціла*
*І ў рад дзевачак садзіла.*
*А сама села вышэй усіх,*
*Думачку задумала горш усіх.*
*Чым мне па двару насласці,*
*А як мне свякроўку назваці.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Лістом па двару трэба сласці,*
*Свякроўку мамачкай назваці,*
*А свёкарку татачкам зваці.*

Рытуал расплятання касы, які адбываўся падчас пасаду нявесты, адлюстроўваецца ў песні “Меншы братачка касу расплятаў”:

*Меншы братачка касу расплятаў,*
*Павесіў уплёт,*
*Куды мамачка ў клець ходзе.*
*У клець будзе ісці – забача,*
*З клеці будзе ісці – заплача:*
*Гэта маёй дачушкі ўплёты,*
*Усе дзявоцкія работы.*
*Як яна ўсе гэтыя ўплёты насіла,*
*Таткаў двор красіла.*
*Кінула ўплёты насіць,*
*Кінула таткаў двор красіць* (в. Кашалёў).

У першы дзень вяселля жаніх прыязджае за нявестай. Калі збіраліся ехаць да маладой, спявалі:

*Дабранач, бацюхна,*
*Ды не лажыся спаці,*
*Ды не лажыся спаці,*
*Бо не будзям начаваці,*
*Бо ночанька цёмненька,*
*Дарожанька дрэнненька,*
*Каб нам ды не зблудзіці*
*Ды чаго б не забыці.* (в. Ліпа)

*Там поле роўненька,*
*На двары коней поўненька.*
*А там хлопчына каня павёў,*
*У каня праўду запытаў:*
*– Коню, мой коню вараны,*
*Ці надзеешся на сілу,*
*Ці давязеш маю дружыну?*
*Мая дружына невялічка,*
*Сем коней вараных прыстала,*
*Сінюю карэту зламала* (в. Дзербічы).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У хаце маладой чакалі прыезду жаніха, “з абеду пачыналі збірацца госці – яе радзіначка”. Дзяўчаты імкнуліся схаваць нявесту ад жаніха дзе-небудзь у суседзяў. Як паведамілі ў вёсцы Іванаўка, да выбару такога месца існавалі пэўныя патрабаванні: “чэраз вуліцу маладую не пераводзілі, нельга, а вялі ў хату, якая стаяла па тым баку вуліцы, дзе жыве нявеста, і дайжа еслі жаніх будзе ехаць з якога боку, дык туды на сустрэчу не вядзі, а вядзі наадварот ад жаніха, у другую старану, а яшчэ нельга было пераапранаць нявесту ў хаце ўдавы або ўдаўца”.

Прыезд дружыны жаніха па нявесту звязаны з рытуалам яе выкупу, які адбываецца ў цікавай гульнёва-тэатралізаванай форме і суправаджаецца выкананнем кароценькіх песень:

*Куды вы нашу маладзіцу дзелі?*
*Хоць бы мы на яе паглядзелі,*
*Новую кашулю ей надзелі.*

*Наша маладзіца ў клеці сядзіць,*
*У клеці сядзіць ды каралечкі ніжа,*
*Не чорненькія, а чырвоненькія* (в. Кашалёў).

Старажытным момантам з’яўляецца такая дэталь, як зліццё гарэлкі з боку жаніха і нявесты ў адзін посуд, а затым яе наліванне з міскі лыжкай у чарку, “якая абыходзіць усіх кругам”. Пры гэтым прыгаворвалі: “Божа, гадзі, радзі жыта, пару дзяцей благаславі, каб былі багаты, не былі пыхаты, каб шанавалі Бога на небе, людзей на зямлі, свае маладосці і нашае старасці”.

Водгукі старажытных міфалагічных уяўленняў даносіць да нас тэкст вясельнай песні, якой суправаджаўся прыезд дружыны жаніха да маладой у вёсцы Балсуны. У цэнтры песеннага сюжэта міфалагічны персанаж – заяц, сімволіка якога мае любоўна-шлюбны характар, а яе сустрэча вясельнай дружыны з зайцам асэнсоўвалася ў народнай міфалогіі як з’ява небяспечная:

*Сядзіць заінька пад ёлачкай,*
*Вочкі трэ.*
*Едзе Мішачка жаніціся,*
*Зайку б’е.*
*– За што, за што, малады Мішачка,*
*Мяне б’еш?*
*Ці я твае вараныя конікі папудзіў,*
*Ці тваю маладу Анечку адгудзіў?*
*А спудзілі тваіх конікаў мядзведзі,*
*Адгаварылі тваю Анечку суседзі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*А спудзілі тваіх конікаў лісіцы,*
*Адгаварылі тваю Анечку сястрыцы* (в. Балсуны).

Паводле народных павер'яў, маладым забаранялася піць, бо яны ехалі ў царкву вянчацца.

Матывам пажадання долі прасякнуты песенныя радкі, адрасаваныя маладым падчас іх ад'езду ў царкву:

*Паедзем, Галенька, да Божага дому,*
*Не станавіся ў царкве пры сцяне.*
*Стань, малодзенька, пасярод царквы.*
*Анёлы абяцаюць ды долю дадуць.*
*А як пытаюць, што за долю даць,*
*Ці хлебавую, ці грашовую.*
*Ой, дай жа, Божа, ды ўсялякую* (в. Кашалёў).

Калі маладыя ўжо абвянчаліся, то сустракалі іх у хаце нявесты яе бацькі, благаслаўляючы "на быт добры, на век доўгі", пры гэтым выконваецца песня:

*Прыехала Галенька з вянца*
*Ды села ў святліцы на лаўцы,*
*Палічыла пярсцёнкі на пальцы,*
*Ды адзін пярсцёнак не такі,*
*Што купіў Іванка малады.*

Калі маладыя вяртаюцца з царквы, то выконваюць і наступную песню:

*Мамачка, мамачка мая родная,*
*Разрышы мне на ручнічок стаць.*
*Разрышы мне, разрышы мне на ручнічок стаці,*
*Васечку павітаці.*
*Васечку, Васечку павітаці,*
*Перснейкі падмяняць.*
*Перснейкі, перснейкі падмяняці,*
*Мужам, жаной назваць.*
*Мужам, жаной, мужам, жаной назваці,*
*Здароўейка пажалаць.*
*Здароўейка, здароўейка пажалаці,*
*Ай да веку да веку, ай да веку да веку,*
*А Васечку – чалавеку.*
*Ішла Манечка з-пад вянца,*
*Сыпала чорны мак з рукаўца:*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*– Зарадзі, Божа, чорны мак,*
*Усе залатыя макаўкі,*
*Чырвоныя лісточкі.*
*Чырван чырванец – Іванечка,*
*Чырвоны лісток – Манечка. (в. Ліпа)*

Вяселле ў хаце нявесты суправаджаецца шматлікімі жартоўнымі песнямі, у якіх адлюстроўваецца народны светапогляд, мараль, майстэрства імправізаваць, ствараць вясёлыя камічныя сітуацыі, незласліва абсмейваць вясельнікаў – сватоў, дружак, шаферак:

*Сваце, сваце,*
*Чыні лад у хаце,*
*А не чыніся ладу,*
*То падлазь пад лаву,*
*Ступаю закаціся,*
*Таўкачом бараніся.*

* * *

*Наш дружка наеўся, напіўся,*
*На ім пояс рассеўся, разваліўся.*
*Мы ж паедзем да Гомеля, Гомеля*
*Абручкі купляць, купляць,*
*На дружку набіваць, набіваць.*

Яскравым сведчаннем трывожнага псіхалагічнага стану маладой у сувязі з яе расстаннем з бацькамі, родным домам з’яўляюцца тэксты вясельных песень, якімі суправаджаўся яе ад’езд да бацькоў жаніха:

*– Куды, куды, млода Манечка, ад’язджаеш?*
*Каму, каму сваю рутачку пакідаеш?*
*– Ой, паеду, паеду, мая мамачка, ад цябе,*
*Пакідаю сваю рутачку я табе.*
*Уставай, мая мамачка, раненька*
*Да палівай маю рутачку часценька.*
*Не палівай маю рутачку слязою,*
*А палівай халоднаю вадою.*
*Ад слёзак мая рутачка завянець,*
*Ад вадзіцы мая рутачка буявець.*
*Ад слёзак мая рутачка сцямнеець,*
*Ад вадзіцы мая рутачка зелянеець.* (в. Гаўлі)

*Як табе, мая матка, жаль не жаль,*
*Як тваё сэрца ні кане,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Што тваё дзіцятка ні згляне*
*Як села ўчора звячора,*
*Сядзіць сягоння да тае пары,*
*Спусціўшы вочкі да зямлі,*
*Палажыўшы ручкі на скам'і:*
*– Беленькія мае ручкі, беленькія,*
*Ці будзеце вы беленькія ў свякроўкі?*
*Як я ў маткі была, то я час мела*
*Беленькія ручкі вымываці.*
*Засталася ў свякроўкі,*
*Стала слёзкамі паліваці* (в. Антонаўка).

У першы дзень вясельнага застолля пачынаецца дзяльба каравая маладой традыцыйнай славеснай формулай: "Запрашаю на каравай, на божы дар. Наш каравай дарагі, спечаны з 7 палёў пшаніцы, з 7 кароў масла, спечаны ў печы і вельмі смачны". Каравайныя пажаданні адрозніваюцца іскрыстым народным гумарам, мудрай назіральнасцю, высокімі маральна-этычнымі прынцыпамі:

*Дарую бочку гуркоў,*
*Каб не любіла чужых мужыкоў;*
*Колькі на бярозе почак,*
*Каб столькі было дочак;*
*Колькі ў лесе пянькоў,*
*Каб столькі было сынкоў;*
*Дарую галіну бярозы,*
*Каб мужык прыходзіў цвярозы;*
*Дарую дугой, каб не хадзіў да другой.*
(в. Кашалёў)

Першы дзень вяселля на Буда-Кашалёўшчыне заканчваецца рытуалам выкупу пасагу нявесты ("яе пасцелі, падушак"). Развітваючыся з дачкой, маці галосіць, "прычытае", гучыць песня:

*Што ты, дачушка, за бяду зрабіла,*
*Што сваю мамачку ды пасіраціла?*
*Чужая сямейка п'е ды гуляе,*
*А твая мамачка слёзкі раняе.*
*Чужая сямейка п'е ды скача,*
*А твая мамачка сільненька плача.*
*На тваё месца няма каму сесці,*
*Тваёю лыжкай няма каму есці,*
*Ды тваё месцейка за сталом гуляе,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*А твая лыжачка ды ляжыць сухая,*
*А твая мамачка слёзы выцірае* (в. Кашалёў).

У вёсцы Сінічына, калі везлі маладую да маладога, спявалі:

*Пара, маці, дай вячэраць,*
*Павячэраўшы, дзяліціся.*
*Табе, маці, што ў хаце,*
*А мне, маці, што ў клеці.*
*Табе, маці, кубел дай каробка,*
*А мне, маці, бурая кароўка.*

Нявеста перад ад’ездам да хаты жаніха ў вёсцы Бацунь спявала:

*Ці я табе, мамка, не дзіцятка,*
*Што мяне процi ночкі шлеш упрочкі?*
*Ці я табе, мамка, кудзелі не прала?*
*Прала, прала кудзёлечку тоненьку,*
*Слала, слала пасцелечку беленьку.*

Абрадавы этап сустрэчы маладой бацькамі жаніха суправаджаўся рытуалам расплятання касы, калі “свякроў знімала вянец, расплятала касу і захіхляла (завязвала хустку) нявестку” (в. Сінічына).

Калі ж пад’язджалі, напрыклад, да хаты жаніха ў вёсцы Кашалёў, то звярталіся да яго маці:

*Выхадзі, свякроўка чубата,*
*Прыехала нявеста багата.*
*Расцялі, мамачка, трубачку,*
*Прывязлі нявесту-любачку.*
У адказ жа гучалі словы маці жаніха:
*Раскаціла б я і бярэмя,*
*Каб ведала, што нядрэнна.*

У тэатралізаваным народным вясельным спектаклі, здаецца, было ўсё прадугледжана і ўлічана. Пакідаючы маладую ў хаце жаніха, яе радня, акрамя развітальнай песні:

*Дадому, госцейкі, дадому,*
*Паелі конікі салому.*
*А саломкі жменька каротка,*
*А сена клачок-пятачок –*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

звярталася з просьбай да радні маладога не крыўдзіць маладую жанчыну, забяспечыць ёй шчаслівае жыццё:

*Да, суседачкі, да, галубачкі, просім вас,*
*Каб не было нашай Галечцы кепска ў вас,*
*Каб не стаяла з цёмнай ночы пад акном,*
*Каб не ўцірала дробных слёзкаў рукавом,*
*Каб не была ды паветачка за хатку,*
*Каб не была суседачка за матку* (в. Кашалёў).

Другі дзень вяселля на Буда-Кашалёўшчыне называўся “пярэзвы жаніховы”, калі госці з боку маладой прыходзілі да жаніха і вяселле працягвалася, гучалі вясельныя песні жартоўнага характару:

*Нашы пчолкі параіліся,*
*Дай ім, Божа, сад добры.*
*Нашы маладыя пажаніліся,*
*Дай ім, Божа, век доўгі,*
*Каб яны пілі, елі*
*Да хораша гаварылі.*
*Ой, Галечкін айцец*
*Ездзіў на кірмаш выбіраць.*
*Ажно выбраў да нягоднага:*
*Як стаў пры парозе –*
*Як пень пры дарозе.*
*Як стаў ён каля ямкі,*
*Пацягаў усе дзялянкі,*
*Стаіць мармыча,*
*А свае Галечкі не кліча* (в. Кашалёў).

Заканчваецца гэты этап вяселля дзяльбой каравая і адорваннем маладой радні жаніха падарункамі.

На трэці дзень вяселля, як паведаміла Ганна Іванаўна Бажанкова з вёскі Кашалёў, “госці нявесты рыхтуюцца ісці “ламаць печ” у жаніха”. Паслявясельная ж частка была вядома пад назвай “адведкі”, захоўваецца гэты вясельны момант і сёння, калі да бацькоў нявесты праз тыдзень прыходзяць блізкія, сваякі жаніха разам з маладымі. Лічылася, што да гэтага дня нявеста не мела права наведваць сваіх бацькоў. Як бачым, структура вясельнай абраднасці ў вёсках Буда-Кашалёўскага раёна ўключае, як і традыцыйнае беларускае вяселле, тры часткі – давясельную, уласнавясельную і паслявясельную, вызначаецца ў той жа час мясцовымі адметнасцямі. Кожны вясельны этап суправаджаецца адпаведнымі песнямі-ілюстрацыямі, у якіх праходзіць перад намі жыццё чалавека ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

надзвычай адказны яго момант, калі нараджаецца сям’я, працягваецца яго род, у рэшце рэшт захоўваецца само жыццё на зямлі. Адсюль такая багатая гама пачуццяў і перажыванняў, увасобленых у вясельных песнях з дапамогай трапнага паэтычнага народнага слова, адсюль і такая строгая абавязковасць неабходных магічных дзеянняў, рытуалаў на кожным з вясельных этапаў. А якая чароўная мелодыя вясельных песень, у іх сапраўды адлюстравалася душа народа!

Вясельныя абрады і звычаі **Веткаўшчыны** хоць і маюць агульнанацыянальную аснову, вылучаюцца таксама сваімі мясцовымі адметнасцямі, якія характэрны для асобных структурных частак вяселля, рутуалаў, песеннага рэпертуару, прыкмет і павер’яў. Зборам звестак па вясельнай абраднасці былі ахоплены такія вёскі Веткаўскага раёна, як Раманаў Лес, Перадавец, Неглюбка, Казацкія Балсуны, Шарсцін, Вялікія Нямкі, Прысно, Хальч, Акшынка, Стаўбун. Запісы вясельных традыцый былі зроблены і ад перасяленцаў з вёсак Данілавічы, Рэчкі, Барталамееўка.

Ва ўсіх вышэйадзначаных вёсках абавязковым абрадавым этапам у сістэме вясельнай абраднасці было сватанне, якое суправаджалася агульнапрынятым рытуальным дыялогам.

Па-мясцоваму адметнай з’яўляецца прысутнасць у вясельных традыцыях в. Перадавец рытуалаў падрыхтоўкі ёлкі з боку маладога (“некалькі свяцілак са стараны маладога дзелалі елец”) і выкупу яе дружкамі маладой.

Абрадавы момант “пасад” ажыццяўлялі, калі рыхтаваліся ў хаце маладой да яе “выпраўлення к жаніху”. Цікава адзначыць, што абодвух маладых, перад тым як вывесці на вуліцу, перавязвалі ручніком, якім быў “перавязаны сват”. Здзяйснялі ў в. Перадавец і рытуал выкупу “пасцелі маладой”. Падзел каравая меў месца як з боку маладой, так і з боку маладога. Паслявясельную частку называлі “драць курыцу”, падчас якой адбывалася імітацыя сапраўднага вяселля.

У вёсцы Неглюбка “ўпрыгожванне ёлкі” ў структуры вясельнай абраднасці таксама мела месца. Пачыналася ж вяселле з заручын. Мясцовай адметнасцю з’яўляецца той факт, што “дружок поясам бярэ маладую”, “увозяць якую да свякрухі на пярыне”. Паслявясельную частку ў гэтай вёсцы называлі “банкетам” (“дралі курыцу, кнутом зацэпяць яе і вядуць ад свата да свацці, а патом – да маладога”, в. Неглюбка).

Не вылучаліся асобнымі этапамі сватанне і заручыны ў в. Казацкія Балсуны. Мясцовымі элементамі ў вясельнай традыцыі з’яўляліся такія, як наведванне хаты маладой яе родзічамі пасля вяселля і наадварот – хаты маладога яго раднёй, а затым “яны мяняюцца”. Паслявясельная частка ў в. Казацкія Балсуны мела назву “Пята” (“яна была па дамоўленасці ў каго-небудзь, там рэзалі курэй – курыцу – маладой, петуха – маладому, суп варылі”) і праводзілася яна пасля “банкетаў”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У вёсцы Шарсцін вылучаліся толькі “банкеты” (“гуляюць банкеты па розных хатах”). На заручынах у в. Неглюбка абменьваліся хлебам свякруха з нявесткай (“свякруха прыносіла свой хлеб у палаценцэ замотаны і мянялася з нявесткай хлебам”).

У в. Вялікія Нямкі адзначым такія мясцовыя рытуалы ў структуры вяселля як “багамаленне” ў час сватання, падрыхтоўка ёлкі, “баня” (“перад свадзьбай у пятніцу бацькі маладой топяць баню” і нявеста мыецца.

У в. Акшынка вылучаліся такія абрадавыя этапы, як “заручыны”, “дзявочнік”, “свадзьба”.

У вёсцы Барталамееўка абрадавы этап “ёлка” меў свае мясцовыя асаблівасці: “пасля абеду прыходзяць дзеўкі да нявесты, збіраюць яе і з песнямі ідуць у лес за ёлкай”. На дзявочніку ўпрыгожваюць ёлку і затым адносяць яе “ў чулан да васкрэсення”. Менавіта з гэтым вясельным атрыбутам звязаны міфалагічныя прыкметы і павер’і: напрыклад, з вярхушкай ёлкі асацыіруюцца ў мясцовым народным этыкеце дабрыня і прыгажосць дзяўчыны, таму дзяўчаты імкнуцца да яе не падпускаць блізка дружак з боку маладога.

У вёсцы Раманаў Лес у якасці ёлкі зразаюць галінку бярозы, якую ўпрыгожваюць і ставяць у падушку з зернем. У вёсцы Данілавічы здзяйснялі варажбу, звязаную з “верхавенствам” маладога ці маладой у сямейным жыцці: пасля выкупу малады з маладою стараюцца ў ёлкі зламаць вярхушку. Хто першы зламае, той будзе гаспадаром у хаце. Паслявясельная частка ў гэтай мясцовасці мела назвы “Банкет” і “Карэнне” Калі падчас “банкету” абыходзілі хаты хросных і ўсіх гасцей, то “на карэнне” збіраліся на падвор’і маладой і імітавалі жартоўнае вяселле, “перапранаючыся ў звяроў, жабракоў, у маладога і маладую”.

У структуры вясельнай абраднасці вёскі Стаўбун можна вылучыць такія этапы, як “Заказы”, “Заручыны”, “Першы дзень вяселля”, “Пята”. На вяселлі меў месца таксама рытуал “Хрэст віць” (“у суботу сабіраюцца дзеўкі віць нявесце хрэст, наразалі бумагі і красілі ў сіні, зялёны, красны, жоўты колеры”). Цікава, што хрэст з ёлкі павінен стаяць цэлы год у хаце маладога.

Важным абрадавым момантам вяселля на Веткаўшчыне з’яўляецца “ёлачка”, калі дзяўчаты збіраюцца ў хаце маладой і ўпрыгожваюць галінку ёлкі, робяць “на ёлцы такі ужо ўсякі красівы крыж, кругом садзяцца, каля ёлкі спяваюць” (в. Стаўбун). Рытуал выкупу ёлкі, якая сімвалізавала цнатлівасць маладой, яе дзявочую прыгажосць, пераўтвараўся ў своеасаблівы спектакль з элементамі сапраўднай “барацьбы-паядынку”. Дзеўкі сцерагуць упрыгожаную ёлку, пад якой сядзіць маладая і плача. Верх ёлкі дзяўчаты хаваюць і просяць выкуп. Па прыезду маладога хтосьці з дружак яго “ўхваціць верх ёлкі, тады ўжо дзеўкі прапалі. Госці ламаюць ёлку, лупяць дзевак, крычаць на іх і гоняць прэч”. Пры гэтым спяваюць:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Далоў, шкуркі, дуркі,*
*Ідзіце, не крычыце,*
*Ідзіце тчыце да прадзіце,*
*І на нас не глядзіце.*

А дзяўчаты адказваюць:

*Сваточкі-галышкі,*
*А чаго ж вас бярэ за кішкі.*
*А ці не даць вам расолу,*
*Каб праняло вас да долу.*

Каб засцерагчы маладую "ад дурнога зглазу і каб не баялася ўрокаў", хтосьці з бацькоў маладой, калі ўжо выпраўляюць вясельнікаў да маладога, імкнецца ўкалоць дачку іголкай, а потым закінуць яе на печ (в. Барталамееўка Веткаўскага раёна).

Прыведзеныя звесткі пра вясельныя традыцыі Веткаўшчыны дэманструюць наяўнасць самабытных мясцовых адметнасцей не толькі ў структуры шлюбных абрадаў, але і ў песенным іх суправаджэнні, а таксама у звязанай з асобнымі рытуаламі народнай міфалогіі.

Вясельная абраднасць Кармянскага раёна складаецца з такіх этапаў, як сватанне, заручыны, зборная субота ("завіванне ёлкі"), пасад, першы дзень вяселля, вянчанне ў царкве, дзяльба каравая, ад'езд нявесты ў дом жаніха, другі дзень вяселля ("браць банкеты"), трэці дзень вяселля ("разгуліны"). Абавязковым першапачатковым абрадавым момантам з'яўлялася сватанне, якое суправаджалася іншасказальнымі дыялогамі і адпаведнымі песнямі, celebratingрознымі па тэматычнай накіраванасці, эмацыянальнай афарбоўцы, маральна-этнічнай праблематыцы. У адной з такіх вясельных песень, якія гучалі на сватанні, адлюстравалася такая рыса беларусаў, як працавітасць і дбайнасць. На просьбу дзяўчыны да маці падрыхтаваць ёй пасаг апошняя адказвае: "Едзь, мая дачушка, без кубла. / Чаму кудзелькі не скубла (в. Акцяброва).

У сваты звычайна прыходзілі ўвечары ў суботу бацька маладога, хросны бацька, дзядзька, брат і прыносілі з сабой сала, хлеб, гарэлку. Калі бацькі дзяўчыны згодны былі аддаць яе замуж, то запрашалі сватоў за стол і "першую чарку налівалі з гарэлкі жаніха" (в. Багданавічы). На заручынах бацькі маладых дамаўляліся аб вяселлі. Спачатку пілі гарэлку з боку жаніха, а потым гарэлку з боку маладой. "У гэты час дзяўчына павінна была назваць свякроўку мамай" (в. Акцяброва). На гэтым вясельным этапе нявеста адорвала сватоў і бацькоў жаніха падарункамі. Заручыны ў в. Ворнаўка называлі "суглядамі".



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Існуе тэрміналагічная блытаніна паняццяў “запоіны” і “заручыны”. У в. Ліцвінавічы заручалі маладых людзей на запоінах. Як адзначыла К. Ігнаценка, “пасля запоін нельга было адмовіцца ад свадьбы”.

На **Кармяншчыне** вечар, калі збіраліся сяброўкі ў маладой, называлі “зборная субота”, “ёлка”, “дзявічнік”, “завіванне ёлачкі”. Паводле ўспамінаў С. Караедавай, “вечарам перад самай свадзьбай прыходзілі дружкі жаніха і нявесты, ёлку маленькую прыносілі з лесу, ставілі ў булку хлеба, упрыгожвалі цвятамі” (в. Ліцвінавічы). Добра памятаюць жанчыны і вясельныя песні, якімі суправаджалася “завіванне ёлачкі”:

*Зборніца-субота, зборніца,*
*Збарней усяго Ганначка,*
*Сабрала сабор у таткаў двор,*
*Пасадзіла дружачак усіх за стол,*
*А сама села вышэ ўсех* (в. Акцяброва).

У адрозненне ад іншых раёнаў Гомельскай вобласці, вясельная традыцыя Кармянскага раёна не вылучалася багаццем і разгорнутасцю каравайнага абраду. Цікавасць уяўляе такі абрадавы момант, як дзяльба каравая. Гэта так званая “сярэбшчына”, калі “жаніх ехаў па нявесту з гасцямі, выкуплівалі нявесту, і садзяцца за стол дзяліць каравай. Пры гэтым дараць падаркі і выказваюць пажаданні” (в. Акцяброва).

Каравайныя пажаданні – сведчанне глыбокай народнай мудрасці нашых продкаў, філасофскага характару іх этнапедагагічнай накіраванасці. У лаканічных, іншы раз рыфмаваных радках гучаць спаконвечныя народныя ўстаноўкі, якія датычаць шчаслівага сямейнага жыцця. Невыпадкова заклікалі ў пажаданнях шанаваць бацькоў, паважаць адзін аднаго, клапаціцца аб прадаўжэнні роду.

Адметнасцю вяселля на Кармяншчыне з’яўляецца паслявясельная частка, якая вядома пад назвамі “пярэзвы” – першы тыдзень вяселля, калі радня маладых хадзіла адзін да другога ў госці, “банкет”, “разгуліны”. На другі дзень вяселле “спраўлялі ў хаце хроснай маткі нявесты і хроснага бацькі жаніха. Гэта называлася “браць банкеты”, на якіх гучалі песні, напрыклад:

*Да й каціласа ды зорачка з неба,*
*Да й упала за дол.*
*Журылася красная дзяўчонка,*
*Хто й завядзе дамоў.*
*– Ой, не журыся, красная дзяўчына,*
*Я завяду дадому* (в. Багданавічы)

Трэці дзень вяселля ў вёсцы Багданавічы называўся “разгуліны” і вызначаўся тым, што “госці маладой прыходзілі да яе дому, а госці маладога да яго”.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Міфалагічныя ўяўленні і павер'і, звязаныя з вясельнай абраднасцю, яскрава адлюстравалі асаблівасці творчага мыслення нашых продкаў, якія імкнуліся прадказаць, прадбачыць шчасце і заможнасць сямейнага жыцця, прадухіліць няшчасці, засцерагчы маладых ад розных шкодных сіл. Звычайна маладых хвалявала пытанне, хто будзе верхаводзіць у сям'і – муж ці жонка. У сувязі з гэтым народная фантазія нарадзіла павер'е, згодна з якім трэба маладой, калі яе ўпершыню маці жаніха заводзіць у хату, зірнуць у гэты час на 4 куты і сказаць: "Цішы, мышы, я ваш кот". Гэта абазначала, што маладая ў такім выпадку будзе гаспадыняй у доме (в. Акцяброва). Падчас сустрэчы маладых свякруха павінна быць у пары (з мужам ці з хросным бацькам), што сімвалізавала, што маладыя ў пары пражывуць шмат гадоў (в. Ворнаўка).

Каб шлюб маладых быў моцны, каб яны жылі дружна, не дазвалялася "станавіцца на той палавік, па якому павінны ііцць маладыя" (в. Задуб'е). У час вясельных гульняў "садзілі маладых на лаўку, і калі жаніх спіхне нявесту, то ён будзе галоўны ў доме" (в. Ліцвінавічы). Жанчыны, у якіх былі маленькія дзеці, імкнуліся сарваць кветкі, якімі ўпрыгожвалі дугу перад тым, як ехаць па маладую" (в. Сямёнаўка).

Вясельны абрадавы комплекс на **Жлобіншчыне** вызначаецца адметным каравайным абрадам, рытуалы якога прасякнуты цікавымі міфалагічнымі прыкметамі і павер'ямі. У вёсцы Саланое, калі ўносілі ў хату дзяжу, то абавязкова ставілі яе на кажух, бо, паводле народных уяўленняў, "поўсць павінна была адпужваць нячысцікаў, якіх уяўляў чалавек". Паколькі з выпечкай каравая звязвалі дабрабыт, заможнасць маладых, то вельмі адказна і сур'ёзна адносіліся каравайніцы да пачэснай працы "замясіць хлеб на шчасце". Гэтым матывам былі прасякнуты і радкі каравайнай песні:

*А хто ж гэты каравай задумаў?*
*А задумаў яго ды Іванька,*
*Недзе ў полі аручы,*
*Пшанічаньку сеючы.*
*А зарадзі, Божа* (в. Саланое).

Вясельны абрад у в. Касакоўка Жлобінскага р-на, паводле фальклорна-этнаграфічных звестак, мае наступную структуру: сваты, зборная субота, пасад, выкуп, вянчанне, каравай, вяселле ў хаце маладой, вяселле ў хаце маладога, закасяне і цыганы. Паслявясельная частка ў в. Малевічы Жлобінскага р-на мела назву "Крошкі": маладая гаспадыня павінна была пачаставаць гасцей. Мясцовай адметнасцю вяселля ў в. Чырвоны Бераг Жлобінскага р-на з'яўлялася ўпрыгожванне ёлкі (цікава, што рыхтуюць ёлку і ў маладой, і ў маладога). Калі ідуць баяры з ёлкай да маладой, то закідваюць яе на страху хаты з мэтай дасягнення дабрабыту ў сям'і. Цікава

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адбываецца ў гэтай вёсцы і завіванне маладой, здзяйсняюць гэты рытуал дзве жанчыны з боку маладой і дзве жанчыны з боку маладога: “завівальнай хусткай махаюць тры разы, потым тры разы стукаюць галовамі маладых і абсыпаюць іх жытам”. Паслявясельная частка мае назву “Пятухі”: “В еты дзень гарэлку людзі прыносяць самі, а пішча – етыя пятухі, якіх скубуць, вараць, жараць, тут ужэ падстаўляюць другіх маладых з жанатых пар і прадаўжаецца такое вяселле”.

У сістэме вясельнай абраднасці **Петрыкаўскага** раёна можна вылучыць такія этапы, як сватанне, каравай, вянкі, пасад, сустрэча маладых, дзяльба каравая, другі, трэці дні вяселля. Сярод вясельных рытуалаў можна назваць такія: выкуп вянка дружынай жаніха, абвязванне сватоў ручнікамі, “распрананне маладой” (свякруха здымае вянок, расплятае касу і завязвае хустку), выкуп “прыданага” маладой, абвязванне маладых падчас дзяльбы каравая саматканым поясам і інш. Сярод цікавых вясельных міфалагічных прыкмет варта адзначыць наступныя: “маладая прывязвала кацёлку нітак да возу, каб яе дружкі хутчэй замуж павыходзілі” (в. Ванюжычы Петрыкаўскага раёна), “маладая не можа цэлую нядзелю прыходзіць дадому, каб хутка не вярнуцца дадому ўдавою” (в. Ванюжычы Петрыкаўскага раёна).

У в. Ляскавічы Петрыкаўскага раёна падчас сватання адбываліся сімвалічныя дзеянні з лапцямі: хлопец адкрываў дзверы сенцаў і кідаў лапці, прыгаворваючы: “Шуры-буры, лапці ў хату!” Калі дзяўчына была згодна выйсці замуж, то паднімала лапці і запрашала сватоў у хату. Паслявясельная частка ў в. Ляскавічы вядома як “хвост”, які “рабілі звычайна ў панядзелак блізкія і родныя”.

Вясельныя традыцыі **Нараўлянскага** р-на таксама маюць адметную мясцовую спецыфіку. Напрыклад, запоіны і сватанне ў в. Галоўчыцы Нараўлянскага р-на не адрозніваліся тэрміналагічна. Выпітая чарка гарэлкі найперш маладымі з’яўлялася сімвалам згоды на шлюб. Важнае месца ў сістэме вясельнай абраднасці займае такі абрадавы этап, як продаж ёлкі. У песні гучыць адказ на пытанне, чаму дзявочая ёлка так дарага каштуе:

*Мы па ёлку хадзілі,*
*Мы па ёлку хадзілі,*
*Свае ногі таптали,*
*Пока ёлку спадабалі,*
*Пока ёлку спадабалі,*
*Чаравікі патаптали* (в. Галоўчыцы).

Цікава праходзіў у в. Галоўчыцы і абрад завівання маладой. Здзяйснялі гэты рытуал на ўслонах жанчыны з боку маладой і з боку маладога. Міфалагічнае павер’е наконт першынства аднаго з маладых у сям’і выражалася ў наступным: “Пацалуюцца жанчыны і пераменіваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

месцамі, спрыгваюць на падлогу. Якая папярод спрыгне, таго будзе большы верх (больш дома будзе верхаводзіць)".

Вылучаецца як асобны вясельны момант і абрад сукання свечак, які ілюструецца адпаведным песенным тэкстам:

*Падляці, падляці, пчолка,*
*Пад нову камору,*
*К высокаму бору,*
*Прынясі вашчэчку*
*Вані на свечэчку.*
…………………….
*Усе дзяла зрабілі,*
*Усе дзяла зрабілі,*
*Каравай усадзілі,*
*Свечачку ўсукалі,*
*Утраіх зелле рвалі*
*І розныя кветкі,*
*Каб любіліся дзеткі* (в. Галоўчыцы).

Звычаем "туляць куру" завяршалася вяселле у в. Галоўчыцы Нараўлянскага р-на.

Свае лакальныя адметнасці мае вяселле ў **Калінкавіцкім** раёне. Напрыклад, у в. Агароднікі сімвалам згоды на шлюб з боку нявесты з'яўляліся падарункі, якія "падае маладая бацькам, калі дае згоду (ручнік для бацькі, хустку для маці)". Адметнасцю мясцовага вяселля з'яўляецца рытуал "звядзення свечак свахамі з абодвух бакоў", які суправаджаецца адпаведнай песняй:

*– У цябе свяча і ў мяне,*
*У цябе дзіця і ў мяне.*
*Дык звядом свечкі да ручкі,*
*Дык звядом дзетак да паркі.*
*Мір з мірам міраваліся,*
*Сваха з свахаю цалаваліся.*

Асноўныя вясельныя рытуалы, характэрныя для тэрыторыі Калінкавіцкага раёна, наступныя: рытуал пасыпання бацькамі жаніха зернем свайго падвор'я, "каб добра жылося і каб выгнаць нячыстую сілу", рытуал продажу маладой яе братам, рытуал завівання маладой, рытуал "абування цёшчы ў лапці".

Асноўнымі этапамі вяселля ў в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна з'яўляюцца сватанне-заручыны, агледзіны, дзявочнік, каравай, першы дзень вяселля і другі дзень вяселля. Адметным з'яўляецца абрадавы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

момант агледзін, калі “маладая з бацькам і маці ідуць да маладога пагля-дзець, як жыве малады”. Сярод рытуалаў першага дня вяселля адзначым такія: звязванне рук маладых, абыход маладымі вакол стала (тройчы), абсыпанне маладых зернем, дзяльба каравая, “уводзіны маладой у жаноцкі стан” (знятце вянка, завязванне хусткі).

У в. Есіпава Рудня Калінкавіцкага раёна вылучаліся і сватанне, і запоіны. На апошніх маладыя абменьваліся пярсцёнкамі, маці жаніха адорвала маладую падарункамі, сваты абменьваліся хлебам. Зборную суботу асобна адзначалі і дружына жаніха, і дружына нявесты. Падчас “дзявічніку” ў мясцовай вясельнай традыцыі адбываўся пасад маладой, які суправаджаўся выкананнем адпаведных песень, а таксама рытуаламі расплятання касы і падрыхтоўкі вяночка. Паслявясельную частку ў мясцовай вясельнай традыцыі называлі “цыганамі”.

У **Светлагорскім** раёне вясельная абраднасць і паэзія вызначаецца сваімі адметнасцямі. Структуру вяселля, напрыклад, у в. Чыркавічы Светлагорскага раёна складаюць такія абрадавыя моманты, як сватанне, змовіны, зборная субота, каравай, ад’езд дружыны жаніха да маладога, госці.

Сімвалам згоды на шлюб з’яўлялася такое сімвалічнае дзеянне, як “разразанне пірага нявестай”. Сватанне суправаджалася песняй “З-пад белага ды бярэзнічку”, у якой адлюстраваліся водгукі старадаўніх звычаяў і абрадаў, калі жаніх ехаў у сваты да цесця, як на вайну:

*З-пад белага ды бярэзнічку*
*Выбягае белы конічак.* 2р.
*Ды не сам жа конічак бяжыць,*
*На ём хлопец удаленькі сядзіць.* 2р.
*Ён коніка паганяе*
*І з конікам размаўляе:* 2р.
*– Ой, ты, коню, ты мой коню,*
*Ты выхваліва́йся мною,* 2р.
*Ты выхвалівайся мною*
*І маёю ты жаною.*
*Пераскоч ты варацечка,*
*Не зачапі ты капыцечка,*
*Да не выбі, коню, брамачкі,*
*Не зрабі, коню, няславачкі,*
*Не дай, коню, цесцю знаці,*
*Што мы будзем ваяваці*
*І камору мы зрабуем,*
*І ўвесь двор мы адваюем,*
*Каморачку ды навенькую,*
*Дзяўчоначку маладзенькую.*

Асноўныя рытуалы змовін – гэта завязванне ручнікоў сватам, адорванне падарункамі.

Зборная субота як абрадавы этап асабліва нічым адметным не вызначалася.

Для падрыхтоўкі каравая выбіраюць жанчын замужніх, каб “былі не ўдовы і жылі не за ўдаўцом, каб красіва за мужам жылі”:

*А ніхто не ўвазнае,*
*Што ў нашым караваі:*
*Сямі дзежак мучыца,*
*Сямі крынічак вадзіца.*
Абавязковым было частаванне каравайніц:
*А мы былі на караваі,*
*Нас там частавалі*
*Віном зеляненькім,*
*Мёдзікам саладзенькім.*

У вясельных песнях, якімі суправаджаўся этап ад’езду дружыны маладога з маладой дадому, гучалі сумныя матывы развітання з бацькоўскім домам, матывы падзякі бацькам за “хлеб-соль”:

*Дзякуй, мамачка, за хлеб-соль, за хлеб-соль,*
*Больш цяпер я не пайду за твой стол, за твой стол,*
*Хоця жа я к табе прыйду ў гасціну, у гасціну,*
*Калі дасі паабедаць – спасіба, спасіба,*
*Калі ж не дасі абедаць – так пайду, так пайду,*
*Ой, ці ж я сабе хлеб-соль не знайду?..*

Паслявясельную частку ў в. Чыркавічы Светлагорскага раёна называлі “госці”: праз тыдзень нявестка клікала да сябе ў госці сватоў, свякруху, свёкра.

Вясельная абраднасць у в. Хутар Светлагорскага раёна захоўвае тыя ж абрадавыя моманты, што і ў в. Чыркавічы. Сярод асноўных звычаяў варта вылучыць такія, як рытуал выкупу маладой бацькамі маладога, абрад вянчання ў царкве, “гасцяванне” ў доме маладога, дзяльба каравая, каравайныя пажаданні.

Вясельная традыцыя ў **Акцябрскім** р-не вылучаецца таксама сваімі лакальнымі элементамі. Напрыклад, сватанне і запоіны як тэрміны і этапы не адрозніваліся. На заручынах маладая адорвае радню маладога падарункамі, а таксама запрашае гасцей. Сярод традыцыйных рытуалаў можна назваць такія, як рытуальны дыялог куплі-продажу падчас сватання; прынясце маладой хлеба-солі ад сватоў маладога, калі яна згодна на шлюб;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

выкуп маладой сватамі маладога ў першы дзень вяселля; рытуал “пераводу” маладой у жаноцкі стан (“свякруха здымае вянок і гаворыць: “Была ты дзявіцаю, станеш маладзіцаю”). Паслявясельную частку на Акцябршчыне называюць “па бяседах”.

Вяселле на тэрыторыі **Рагачоўскага** р-на мела свае адметнасці: у в. Слапішча, напрыклад, падчас сватання, калі маладая была згодна на шлюб, то, узяўшы свечку ў рукі, пераразала пірог папалам. Падчас вянчання маладыя імкнуліся пацягнуць за сабой ручнік, каб дрэннае ўсё замяталася, а ў далейшым жыцці яны жылі добра.

Вясельная абраднасць **Гомельскага** раёна ўключае такія этапы, як сватанне, змовіны, зборная субота, першы дзень вяселля, пасад, падрыхтоўка каравая, вянчанне ў царкве, дзяльба каравая, ад’езд нявесты ў дом жаніха, другі дзень вяселля ці пярэзвы. Звернемся да характарыстыкі асноўных вясельных абрадавых момантаў.

Сватанне адбывалася ў жартаўлівай форме, суправаджалася іншасказальнымі дыялогамі і ставіла на мэце дамовіцца аб шлюбе. У сваты, напрыклад, у в. Чкалава звычайна выпраўлялася чалавек 5-7, сярод якіх былі бацька, хросныя, дзядзькі, цёткі. Увайшоўшы ў двор, сваты падыходзілі да акна нявесцінага дома, стукалі ў шыбы і гаварылі: “Добры вечар! Ці не пусціце нанач? Мы – з далёкага краю, прытаміліся”. Гаспадар звычайна адказвае: “Добрае здароўе! Калі вы з добрымі намерамі, то заходзьце ў хату, а калі не, то ідзіце, адкуль прыйшлі”. Сваты ў адказ: “Мы – людзі добрыя і з добрымі намерамі”. Гаспадары запрашаюць: “Калі добрыя, то заходзьце ў хату”. Далей ужо ў хаце дыялог працягваецца.

– Мы чулі, што ў вас цялушка ёсць, ці не прадасце вы яе нам?

– Няма ў нас цялушкі, на мінулым тыдні прадалі.

– Не, нам не цялушка патрэбна. У вас дачка ёсць. Гавораць, што яна і прыгожая, і добрая гаспадыня, і да работы скорая. У вашым двары – красна дзявіца, у нашым двары – малады купец. Як сойдземся ў цане, дык яе купім”.

Пры размове сватоў дзяўчына не павінна была прысутнічаць. Калі ж яны прасілі паказаць ім нявесту, то падводзілі ці бабулю, ці пераапранутага ў дзяўчыну хлопца.

У знак згоды на шлюб падчас сватання дзяўчына дарыць бацьку сарочку, а маці – хустку, ручнік, матэрыю на сукенку. Астатніх сватоў перавязваюць ручнікамі цераз плячо. Паводле этнаграфічных звестак, запісаных у в. Бабовічы, сваты, калі заходзяць у хату, спяваюць:

*Наш хлеб, ваша вадзіца,*
*Наш хлопец, ваша дзевіца,*
*Наш хлопец не ўмее лапці плесці,*
*Наша дзевіца не ўмее хату месці,*
*Трэба іх да кучкі звесці.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Або:

*Прыбілася рыбка к гату,*
*Пусці, сват, у хату,*
*Мы цябе не згубілі.*
*Возьмемо, што злюбім,*
*Вып'емо па кубачку,*
*Схопімо галубачку.*
*Вып'емо, падскочымо,*
*Возьмемо, што скочыло.*

Калі ўжо засваталі нявесту, то адбываюцца змовіны. Як паведаміла інфарматар з в. Чкалава У.І. Сухоцкая, змовіны адбываюцца ў гэты ж дзень, што і сватанне. Сваты выстаўляюць на стол гарэлку, кладуць хлеб, а бацькі нявесты гатуюць закуску. У гэты ж час нявеста ідзе запрашаць сваіх бліжэйшых сваякоў, сяброўак і суседзяў на змовіны. Калі ўсе збіраюцца, то пачынаецца частаванне, скокі, песні. Гучаць жартаўлівыя прыпеўкі пра сватоў жаніха:

*Нашы сваты дурні,*
*Заехалі ў гумны,*
*У гумне начавалі,*
*Мышы вушы паад'ядалі.*
У адказ жа сваты жаніха спяваюць:
*У нашага свата*
*Дзіравая хата,*
*Дроў ні палена,*
*Світка па калена.*

За сталом у гэты час вядуцца размовы аб пасагу і дні вяселля: "Ну, што ж, сват, я за сваю дачку дам тое, што і людзі даюць: карову, авечку і парася".

Затым недзе ў тры гадзіны раніцы ўсе госці збіраюцца і з песнямі, жартамі ідуць да хаты жаніха "мазаць печ". Калі прыходзяць у хату, то малююць на печы вуглём, каму што ўздумаецца: кветкі, кружочкі, "хрэшчыкі" і г.д. Маці жаніха запрашае за стол гасцей і частуе іх. Падчас змовін у в. Бабовічы спявалі песні, а бацькі засватанай дзяўчыны звярталіся да гасцей са словамі:

*Піце, сваты, гарэлку,*
*Запівайце дзеўку.*
*Няхай гэта дзявіца*
*З касою не ходзіць,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Хлопцаў не зводзіць,*
*Няхай тыя кавалеры*
*Платоў не ломяць.*

На змовінах вырашалася, што вяселле можна прызначыць праз 3-4 тыдні.

Зборную суботу ў в. Чкалава Гомельскага раёна называюць “разборнай кашай”, праводзіцца яна ў суботу. У гэты дзень нявеста запрашае да сябе ўсіх сваіх сябровак, якія рыхтуюць вянок:

*Прыйшлі дзевачкі ў хатку,*
*Яны не знаЛі парадку.*
*Нясі, Надзечка, што рабіць,*
*Нясі рутачку вянок шыць,*
*Нясі рутачку і іголку,*
*Нясі нітачак і іголку.*

Маладая і першая шаферка прыносяць вэлюм, ніткі, іголку, астатнія сяброўкі робяць кветкі для жаніха і шафераў. Пры гэтым спяваюць песню:

*Саборная суботачка настала,*
*Наша Надзечка ўсіх дзевачак сабрала,*
*А сабраўшы, па-за століку саджала,*
*Сама села на крэсельца вышэй усіх,*
*А скланіла галовачку ніжэй усіх,*
*Стаіць рутачка ля варот,*
*Ідзі, татачка, з касою,*
*Насі рутачку з расою.*
*Ідзі, мамачка, з сярпочкам,*
*Сажні рутачку з цвяточкам,*
*Бо мне ўжо дзеўкай не быці,*
*З руты вяночкаў не віці,*
*Бо я ўжо дзеўкай адбыла,*
*З руты вяночкаў адвіла.*

Выконваецца і песня, у якой гучыць матыў будучага сямейнага жыцця нявесты ў хаце свякрухі, выражаны ў форме паралелізму:

*Чаго, зязюля, чаго, шэрая,*
*Да зямлі прылягаеш?*
*Чаго зязюля, чаго шэрая,*
*Да зямлі прылягаеш?*
*Ці ты, зязюля, ці ты, шэрая,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Цяжкую зіму чуеш?*
*Ці ты, зязюля, ці ты, шэрая,*
*Цяжкую зіму чуеш?*
*А ці цяжкую, ці не цяжку.,*
*Зімачка не лецечка.*
*А ці цяжку, ці не цяжкую,*
*Зімачка не лецечка.*
*Летам паляжу, ягадку знайду,*
*А зімой нічога.*
*Летам паляжу, ягадку знайду,*
*А зімой нічога.*
*Чаго, Надзечка, маладзенькая,*
*Так жалосненька плачаш?*
*Чаго, Надзечка, маладзенькая,*
*Так жалосненька плачаш?*
*Ці ты, Надзечка, маладзенькая,*
*Ліхую свякруху чуеш?*
*А ці ліхую, ці не ліхую,*
*Свякроўка не мамачка.*
*А ці ліхую, ці не ліхую,*
*Свякроўка не мамачка.*
*У мамачкі жыла, позненька спала,*
*А ў свякрухі не буду.*

Затым, калі ўжо гатовы вянок, то яго прымяраюць на замужнюю жанчыну ці "старую" дзеўку, бо, па народных уяўленнях, калі дзяўчына да замужжа прымярае вянок, то хоць і пойдзе замуж, але вясельнага вянка не прыйдзецца ёй надзець. Пасля гэтага нявеста і першая шаферка адносяць вянок у другі пакой, а маці маладой запрашае ўсіх на частаванне, абавязковай стравай якога з'яўляецца каша. Малады выкупляе яе і разбівае гаршчок, дзеліць кашу на ўсіх прысутных. Па народным павер'і, трэба ўсё выпіць і з'есці, што стаіць на стале, тады дзяўчаты замуж выйдуць у сваю вёску. Яшчэ адна цікавая прыкмета была звязана са зборнай суботай. Звычайна дзяўчаты ў гэты час п'юць, ядуць, жартуюць, а хлопцы стаяць у парозе і імкнуцца перахапіць у дзяўчат абрус і ўскінуць яго на страху. Дзяўчаты ж стараюцца вынесці яго і пакласці на вароты, што абазначае, што ўсе яны выйдуць замуж.

Абрад падрыхтоўкі і выпечкі каравая не адрозніваўся асаблівым багаццем рытуалаў, але тым не менш у в. Каравышань Гомельскага раёна давялося запісаць звесткі пра гэты важны этап вясельнай абраднасці. Па ўспамінах Старавойтавай Г.М., 1915 г.н., запрашалі "каравайніц", жанчын, якія добра пяклі, спявалі і танцавалі. Калі "каравайніца" пачынала замешваць цеста, то жанчыны гаварылі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Благаславі, Божа,*
*Блізкія людзі,*
*Гэтай жанчыне*
*Каравай замясіці.*

Жанчыны-каравайніцы замешваюць цеста, а скончыўшы, спяваюць:

*Дзякуй табе, Божа,*
*Што мы справу ўжо зрабілі,*
*Каравай ужо замясілі,*
*Нашымі ручкамі беленькімі,*
*Пярсцёначкамі залаценькімі.*

Гаспадар запрашае жанчын за стол і частуе. Каравай выпякалі ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты, упрыгожвалі фігуркамі ў выглядзе нябесных свяціл – сонца і месяца.

У першы дзень вяселля адбываўся прыезд дружыны жаніха па нявесту. Гэты абрадавы момант захаваў шмат элементаў старажытнага вяселля, адным з якіх з’яўляўся рытуал выкупу маладой. Калі малады прыязджае да нявесты, то яго не пускаюць адразу ў двор, а зачыняюць вароты. Калі дружына маладой атрымлівае выкуп, то адчыняюць іх. Торг працягваецца і ў хаце нявесты, калі да жаніха падводзяць то бабулю, то іншую дзяўчыну замест нявесты, патрабуючы таксама выкуп.

Абрадавы момант вяселля пасад адбываўся перад ад’ездам маладых у царкву. Па словах жыхаркі в. Краўцоўка В.П. Анохавай, 1925 г.н., на пасад садзілі спачатку жаніха, засцілалі для гэтага лаву за сталом кажухом, маладую ж заводзіў на пасад брат, прычым ішлі па лаўках. Як паведамілі ў в. Чкалава, перад тым, як сесці на пасад, бацька і маці благаслаўлялі маладых крыжам, жадаючы ім добрага жыцця і шчасця. На пасад маладыя мелі права сесці толькі ў выпадку захавання імі цнатлівасці. Паводле звестак, атрыманых ад інфарматараў в. Маркавічы, перад пасадам дзяўчаты выконвалі песню “Благаславі, Божа”, пасля чаго хорам крычалі: “Скідайце ложкі, тарэлкі, што не нясуць гарэлкі”, пры гэтым яны ўсё скідалі са стала. Ім выносілі чарку, пасля гэтага садзілі маладую на пасад: ставілі ўслоны і абводзілі маладую паўз іх, гаворачы: “Карыся, Танечка, матцы і бацьку”. Сярод павер’яў, звязаных з пасадам, адзначым наступныя: калі дзяўчына, якая выходзіла замуж, была першай сярод сваіх сяброваак, то дзяўчаты крычалі ёй: “Таня, дзе ключы?” Яна адказвала: “Ключы ў аўсе, ідзіце за мной усе”, што абазначала хуткае замужжа яе сяброваак. Каб хутчэй выйсці замуж, адна з дзяўчат у час вяселля брала зубамі настольнік са стала, несла ў зубах і кідала на парозе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Як паведаміла жыхарка в. Касцюкоўка С.Р. Малык, 1922 г.н., на пасадзе адбываліся наступныя магічныя дзеянні: бацькі маладой тройчы абводзілі свечкай вакол галавы нявесты, а затым свацця брала ў іх свечку і рабіла застрыжыны. Яна брала ў маладой шлюбны пярсцёнак і праз яго ў трох месцах трохі прыпальвала валасы на галаве ў маладой, а затым бацькі маладой “бралі платок і за сталом злучалі паміж сабой маладых”. Песні, якія суправаджалі гэты вясельны этап, адрозніваліся глыбокім псіхалагізмам, эмацыянальнасцю:

*Станавіся, уся радзіначка, у рад,*
*Будуць весці Манечку на пасад,*
*Усю сваю радзіначку абышла,*
*Сваёй роднай мамачкі не найшла* (пас. Мураўшы).

Пасад перад ад’ездам маладых да вянца адлюстраваў рэшткі старажытнай рэлігіі славян, якія адухаўлялі з’явы і прадметы навакольнага свету. Шмат міфалагічных павер’яў выўляецца і ў абрадзе вянчання ў царкве. Напрыклад, нявеста імкнецца “пацягнуць за сабой падножнік, каб яе сяброўкі хутчэй выходзілі замуж”, ці назіралі за тым, як гараць свечкі: чыя свечка хутчэй згарыць, той першы памрэ (в. Чкалава); калі ў аднаго з маладых свечка патухне, то ён рана аўдавее, калі ж свяча “смаліць”, то доўгага сумеснага жыцця не будзе (в. Прыбар).

Калі прыязджаюць маладыя ад вянца, то іх сустракаюць бацька і маці нявесты з іконай і хлебам-соллю. Як толькі маладыя заходзяць у двор, спяваюць:

*Выходзь, мамачка, з свячамі,*
*Твайго дзіцятку звянчалі*
*З тым панічом, што ўчора быў,*
*Твайго дзіцятку спалюбіў.*

Калі ж маладыя падыходзяць да бацькоў, выконваюць наступныя песенныя радкі:

*Карысь, Надзечка, карыся,*
*Нізка ў ножкі кланяйся,*
*Коскамі зямельку ўсцялі,*
*Слёзкамі ножкі абаллі.*

Кульмінацыйным момантам вяселля з’яўляецца дзяльба каравая як сімвалічны момант замацавання шлюбу маладых, пажадання ім шчасця, багацця. Адзначым шырокі імправізацыйны характар вясельных пажаданняў, кожнае з якіх вызначалася і канкрэтна-прадметным зместам, і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

філасофскай скіраванасцю, і жыццёвай народнай мудрасцю і сведчыла аб вялікай веры людзей у магічную сілу слова, ад якога таксама залежалі дабрабыт і добрае сямейнае жыццё маладых.

*Колькі ў лесе пянькоў,*
*Столькі вам сынкоў.* (в. Чкалава)

*Дарую загон жыта,*
*Хочаце жніце, хочаце – не жніце,*
*А мяне за бабку вазьміце.* (в. Прыбар)

*Дарую капейку на шчаслівую сямейку,*
*Дарую дзве, каб жылі з умом у галаве,*
*А руб серабром, штоб жылі з дабром,*
*Дару пятак, штоб проста так,*
*Кладу астальныя,*
*Штоб былі нервы стальныя* (в. Прыбар).

Падчас ад’езду нявесты з дому жаніха адбываецца рытуал расплятання касы, калі брат маладой (нежанаты) здымае з галавы вянок і расплятае касу. Прычым маладую садзяць, па ўспамінах У.І. Сухоцкай з в. Чкалава, пад “ёлачку” – упрыгожаную галінку хвоі. “Ёлачка” – гэта ўвогуле важны рытуал напярэдадні вяселля на Гомельшчыне, які сімвалізуе цнатлівасць і прыгажосць маладой. Калі брат расплятае касу, то дзяўчаты спяваюць:

*Ой, жаль, жаль, будзе Надзечцы касы,*
*Ой, не так касы, як дзявоцкае красы.*

Цікава, што калі маладая ў гэты момант не плача, то гучыць песня:

*Камяная да ты печачка,*
*Гарыш вечар да не выгарыш.*
*Маладая ж да ты, Надзечка,*
*Вечар сядзіш да не заплачыш.*
*Сваёй мамачкі не разжаліш,*
*Ой, дайце ж ёй памочы,*
*Горкія цыбулі пад вочы.*

Іншы раз, калі плача нявеста, то гэты момант ілюструецца ў песенных радках, напоўненых смуткам, душэўнымі перажываннямі маладой у сувязі з расстаннем з бацькоўскім домам:

*Расплёў брат косачку,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Разліў ёй слёзачку.*
*Каса мая да русанькая,*
*Сляза мая гарачанькая. (в. Чкалава)*

*– Ой, мая мамка, ці я табе надаела,*
*Ці я табе хлеба-солі паела,*
*Ці я табе, мая мамка, вады не насіла,*
*Аддаеш ты мяне замуж, каб я галасіла* (в. Бабовічы).

Пасля гэтага адбываецца выкуп нявесты жаніхом, а таксама рытуал выкупу яе пасагу.

Калі вясельны поезд пад’язджае да двара маладога, то спяваюць:

*Выдзі, мамачка, паглядзі,*
*Што табе баяры прывезлі,*
*Скрыню і пярыну,*
*Дзеўку-балярыну* (в. Чкалава).

У хаце маладога адбываюцца вясельнае застолле, таксама дзяльба каравая, рытуал адорвання нявестай радні маладога, рытуал падрыхтоўкі для маладых “пасцелі”, якую раніцай свякруха з “свашкамі” аглядалі. Калі маладая захавала цнатлівасць, то малады ішоў да цёшчы з бутэлькай віна, абвязанай чырвонай лентай (пас. Мураўчы, в. Чкалава), ці ехаў з “красным флагам” (в. Бабовічы), у адваротным выпадку на галаву маці нявесты адзявалі хамут (в. Краўцоўка) ці ставілі перад маці нявесты “дзіравыя гліняныя міскі” (пас. Мураўчы), ці жаніх ішоў да цёшчы з бутэлькай гарэлкі, але не кланяўся і не частаваўся там (в. Чкалава), давалі маці нявесты выпіць бруднай вады (в. Бабовічы). Апісаныя дзеянні сваімі каранямі ўзыходзяць да старажытных часоў і сведчаць аб высокай народнай маралі.

Здаўна існавала народнае павер’е, што ў выпадку захавання цнатлівасці маладую сям’ю чакае божае благаслаўленне, нецнатлівасць жа асацыіравалася з разладам у сям’і, спусташэннем.

Паслявясельную частку ў вёсках Гомельскага раёна называлі пярэзвамі, калі радня маладой збіралася ў госці да маладога. Гэты вясельны момант звязаны з рытуалам пераапранання жанчын у мужчынскае адзенне, а мужчын – у жаночае, што выклікала смех. Сярод удзельнікаў вясельнай світы – цыган, цыганка, доктар, “фальшывыя” жаніх і нявеста. Прыйшоўшы ў двор жаніха, госці маладой патрабуюць курыцу (калі нявеста захавала цнатлівасць). А ў в. Каравышань, па словах жыхаркі Старавойтавай Г.М., 1915 г.н., “госці на другі дзень вяселля лавілі ў суседзяў курыцу, натырквалі яе на палку і пранасілі праз усю вёску, ішлі з прыпеўкамі і песнямі, прыйшоўшы, абдзіралі курыцу і варылі булён, а

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

несапраўдныя “жаніх” і “нявеста” паводзілі сябе як маладыя”. Злавіўшы курыцу, раскладваюць пасярод вуліцы вогнішча і смаляць яе, скубуць пер’е, а падсмаліўшы, разрываюць яе на кавалкі і ядуць, нават “сырую грызуць”, прамаўляючы:

*Ці не заляцела наша шчырачка*
*Сюда к вам,*
*Хоць заляцела – не заляцела,*
*Насыпце круп,*
*Прывучыце тут, няхай вам* (пас. Мураўчы).

Вясельная абраднасць Гомельскага раёна – цікавая і арганічная частка вясельнага фальклору Беларусі, але адметная сваімі рытуаламі і песнямі, якія захавалі шмат архаічных элементаў і адрозніваюцца высокамастацкімі якасцямі. Сёння многія вясельныя моманты страцілі сваю рэлігійна-магічную аснову, набылі характар гульні, але выконваюцца надзвычай сур’ёзна, даносячы да нас далёкі подых старажытнасці традыцый нашых продкаў.

У вясельнай абраднасці **Хойніцкага** раёна можна вылучыць такія этапы, як сватанне, пасад, каравай, вяселле ў хаце маладой, вяселле ў хаце маладога, паслявясельная частка “гуляць зайца”. У вясельнай абраднасці в. Алексічы Хойніцкага раёна, як і ў в. Агароднікі Калінкавіцкага раёна, важнае месца рытуалу “звядзення свечак” свахамі маладой і маладога.

Сімвалам згоды на шлюб у мясцовай вясельнай традыцыі в. Тульгавічы з’яўляліся прынятыя нявестай ад сватоў “пляшка гарэлкі, перавязаная краснай лентаю і бохан хлеба ў рушніку”. Абавязковым было, калі нявеста згодна была выйсці замуж, выпіць чарку гарэлкі, якую “п’е да дзеўкі хлопец”, прычым папярэдне “кідае ў чарку з гарэлкай капейкі”.

Вядомы быў у лакальнай вясельнай традыцыі і рытуал “расчэсвання касы” (“расчэсваюць косы, знімаюць вянок, завязваюць хустку”).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## 4 Міфалагічныя ўяўленні ў вясельнай абраднасці і паэзіі

Сучасны вясельны абрад – гэта складаны сацыякультурны комплекс, які рэгулюе святочна-абрадавае жыццё чалавека і грамадства. Палескае вяселле адрозніваецца не толькі ўстойлівасцю захавання, але і багаццем абрадавых дзеянняў, песенных форм, міфалагічных прыкмет і павер'яў. Надзвычай цікавай і недастаткова вывучанай з'яўляецца праблема даследавання і міфалагічнай асновы вясельнай абраднасці і паэзіі. Асаблівасці міфалагічнага светапогляду беларусаў, яскрава адлюстраваныя ў вясельныя фальклоры, істотна паўплывалі на фарміраванне яго паэтычнай сістэмы. Засяродзім найперш увагу на вывучэнні міфалагічнага субстрату ў вясельнай абраднасці і паэзіі Гомельшчыны.

У вясельнай абраднасці і паэзіі цесна знітаваны элементы і вербальнага, і акцыянальнага кодаў. Галоўны сэнс вяселля – ідэя працягу рода, захавання жыцця. Невыпадковай у сувязі з гэтым была прасякнутасць вясельных этапаў магіяй – прадуцыравальнай, апатрапеічнай. Апошні від магіі выяўляецца ў сістэме шматлікіх забарон, скіраваных на засцярогу маладых ад усяго дрэннага. Звернем спачатку ўвагу на некаторыя з іх, адлюстраваныя ў прыкметах і павер'ях (самастойных фальклорных жанрах), дзякуючы якім імкнуліся забяспечыць дабрабыт маладых, умацаваць іх шлюб.

Як і ў каляндарна-абрадавай паэзіі, спрадвеку ў сямейна-абрадавых цыклах важнае месца займалі і не страцілі актуальнасці сёння народныя прыкметы, павер'і, вераванні. Па сутнасці, іх можна называць асобнымі жанравымі формамі фальклору. На думку У.А. Васілевіча, у энцыклапедыі народнага жыцця яны былі вызначальнымі, бо ў "штодзённым жыцці чалавека яны неслі і дарадчую, і перасцерагальную, і нават забаронную функцыю, у значнай меры кіруючы паводзінамі чалавека" [26, с. 6].

Увогуле найменш даследаванай з'яўляецца сямейная бытавая культура, асабліва калі разглядаць яе праз прызму міфалагічных уяўленняў. "Фальклорны тэкст па самой сваёй прыродзе акумулюе, фармалізуе, сюжэтна афармляе міфалагічныя ўяўленні, якія складваюцца ў "карціну свету" ў рамках пэўнай культуры" [27, с. 8-9].

Кожны з этапаў розных лакальных варыянтаў вяселля суправаджаўся цікавымі прыкметамі і павер'ямі, якія вылучаліся мясцовым каларытам. Напрыклад, сімвалам згоды на шлюб у в. Чырвоная Слабада Акцябрскага р-на з'яўляўся надзеты хлопцам вяночак на галаву дзяўчыны: "Калі дзяўчына не супраць, то яна не знімае з галавы вяночак, які ёй надзеў малады хлопец" (Запісана ад Луцковіч Марыі Іванаўны) [28, с. 9].

Вясельны вянок – адзін з галоўных прадметных кампанентаў у вясельнай абраднасці, "з'яўляецца сімвалам шлюбу, ... шлюбная сімволіка вянка адлюстравана ў любоўнай магіі і дзявочых варожбах пра замужаства,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у звычаі даваць дзяўчыне вянок у якасці сімвала сватання, у абрадавым выкарыстанні вянкоў на вяселлі” [29, с. 79]. Нават ужо па матэрыялах аднаго з вясельных этапаў, напрыклад, сватання, можна меркаваць, наколькі важнае месца ў светапогляднай сістэме нашых продкаў займалі традыцыйныя прыкметы, павер’і, вераванні. У гэтай сувязі слушнай з’яўляецца заўвага У.А. Васілевіча наконт семантычнай іх скіраванасці: “Сімволіка ніколі не ішла за этапнасцю абраду, яна магла паўтарацца на розных яго стадыях, раскрываючы шматзначнасць свайго ўнутранага сэнсу” [30, с. 9].

Паводле мясцовых апісанняў вясельнага этапа сватання, напрыклад, на Гомельшчыне, згоду на шлюб сімвалізавалі і наступныя дзеянні: забіранне нявестай торбы з хлебам, прынесенай сватамі (в. Дуброва Акцябрскага р-на) [28, с. 27] і разразанне маладой хлеба, прывезенага жаніхом (вв. Лубенікі, Малажын, Міхнаўка, Шкураты, Залессе, Вязок Брагінскага р-на) [28, сс. 28, 32, 34 39, 44, 56]. Падкрэсленыя рэгіянальныя адметнасці брагінскага вяселля вылучаюцца адметнымі прыкметамі і павер’ямі: напрыклад, гэта падкідванне маладой адной палавіны разрэзанага хлеба ўверх, што было звязана з імкненнем паспрыяць хутчэйшаму шлюбу, сямейнай уладкаванасці каго-небудзь з сяброўак: хто першы зловіць гэты хлеб, той наступны пойдзе замуж (в. Міхнаўка) [28, с. 39].

Своеасаблівым прагнозам шчаслівага сямейнага жыцця з’яўлялася павер’е, звязанае з хуткім разразаннем хлеба: “Як разрэжа ізразу, ужэ добра жыць будуці, і любіці яна яго, а калі там рэжа ды яшчэ трохі падумае, да ізноў і другі, і трэці, то ўжэ кажуці, што пагана будуць жыці” (в. Шкураты) [28, с. 44].

Што датычыць давясельнай часткі на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага р-на, то нявеста падчас сватання таксама павінна была разрэзаць бохан хлеба папалам. У в. Елянец такім сімвалам з’яўлялася перавязванне ручнікамі сватоў-мужчын і адорванне жанчын падарункамі. У вёсках Рудзянец і Чырвоны Сцяг, калі дасягалася згода на шлюб, адбываўся рытуал абмену паміж сватамі “ласінай” (“кусок сала, хлеб, соль”) [28, с. 68]. У в. Кашалёў, калі сваты ўжо дамовіліся аб тэрмінах вяселля, нявеста кланялася сватам і ставіла посуд на стол, а “гаспадыня – закуску, сват – гарэлку і пірог” [28, с. 73]. У в. Бацунь звычайнае запрашэнне за стол сімвалізавала згоду на шлюб. У в. Пянчын жаданне нявесты выйсці замуж пацвярджалася падараваным ёю ручніком для бацькі жаніха і хусткай для яго маці. Падчас заручын у в. Патапаўка згода на шлюб падмацоўвалася формулай прывітання нявестай усіх удзельнікаў сватання. У в. Лугінічы, як і ў некаторых іншых вёсках Буда-Кашалёўскага р-на, калі маладая, папярэдне схаваўшыся, раптам з’яўлялася, калі прыходзілі сваты, гэта абазначала, што яна згаджалася выйсці замуж, і “мама дзеўкі ўстрачае сватоў хлебам-соллю і просіць садзіцца за стол” [28, с. 94].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У в. Валаўск Ельскага р-на адбываліся наступныя сімвалічныя дзеянні, звязаныя са згодай на шлюб: "Молоды бярэ стакан у платочок, налівае румку і кідае ў гэтую водку капейку. Еслі молода согласна ісці за его замуж, дык яна выпівае гэту водку, і садзяцца за стол" [28, с. 184]. Даследчык К.В. Чыстоў, характаразуючы сямейныя абрады і абрадавы фальклор усходніх славян, адзначыў тыповыя рысы вяселля у традыцыях рускіх, украінцаў і беларусаў, пры гэтым аўтар падкрэсліў, што ў выпадку згоды на шлюб гасцей запрашалі за стол, выносілі ручнік, частавалі вінoм, запальвалі свечкі; нявеста ў некаторых украінскіх раёнах, калі пагаджалася, калупала печку [31, с. 405]. Заўважым, што "печ выконвае сімвалічную ролю ва ўнутранай прасторы хаты, сумяшчаючы ў сабе рысы цэнтра і мяжы" [29, с. 310]. Невыпадковасць гэтага аб'екта ў прыведзеным абрадавым кантэксце звязана з яе семантыкай: "... увасабляе сабой ідэю дома ў аспекце яго паўнаты і дабрабыту і ў гэтых адносінах суаднесена са сталом" [29, с. 310].

У сувязі з названым сімвалічным дзеяннем варта нагадаць, што і ў беларускім апісанні вяселля сустракаецца гэты вышэйзгаданы факт "калупання" пры ўмове згоды на шлюб. У адным з лакальных вясельных варыянтаў гэты матыў звязаны з іншым аб'ектам – не з печчу, а са сцяной: калі нявеста давала згоду выйсці замуж, то "збянтэжана калупала сухі мох паміж бярвеннямі ў сцяне" (в. Любавічы Жыткавіцкага р-на) [28, с. 220]. У в. Маркоўскае Лельчыцкага р-на сэнс гэтага звычаю, які таксама захаваўся, але ўжо не мае такой выразнай сувязі з умовай згоды на шлюб: "Прыходзяць у хату да маладой, тая стаіць ля прыпечку, калупае яго, робіць выгляд, што не хоча ісці" [28, с. 315]. Семантычны прыярытэт у мясцовай традыцыі сватання, калі вырашалася пытанне аб шлюбе, аддадзены быў рытуалу выпівання чаркі гарэлкі: "калі маладая згодна, то п'е чарку і ўжэ засватаная" [28, с. 315].

У мясцовай вясельнай традыцыі в. Сяменча Жыткавіцкага р-на прыняць дзяўчынай "пірог і горэлку" абазначала згоду выйсці замуж. Падарункі для бацькоў жаніха з боку нявесты – сімвал згоды на шлюб у в. Агароднікі Калінкавіцкага р-на. Нельга не адзначыць, што гэта адметная рыса сватання на Гомельшчыне.

Каб атрымаць згоду на шлюб, малады ў в. Дуброва Лельчыцкага р-на "падносіць чарку маладой і обязацельно на белам платку, калі малада сагласна ісці замуж, то прыгублівае гарэлку" [28, с. 294]. У в. Баравое прыняцце маладой чаркі гарэлкі, налітай жаніхом, асэнсоўваецца як важная ўмова паспяховага вырашэння пытання аб шлюбе, прычым "спачатку бацька прыгубляе, потым ужо маці. Калі пап'юць гарэлку нявесты, то п'юць жаніхову гарэлку" [28, с. 301. Адметнасцю сватання ў в. Грабяні Лельчыцкага р-на з'яўляліся пэўныя славесныя прывітальныя клішэ, якімі абменьваліся малады з маладой: "Малады падыходзіць з гэтай гарэлкай да маладой і кажа: "Будзь здарова!" – На здароўе!" – адказвае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

маладая, калі згодна выйсці за яго, а калі не, то выкочвае жаніху гарбузу” [28, с. 308].

Перавязванне ручнікамі маладых, калі дасягалася згода на шлюб, – лакальная асаблівасць вясельнай традыцыі сватання ў в. Страдубка Лоеўскага р-на.

У в. Малыя Зімовішчы Мазырскага р-на, кіруючыся прынцыпам народнай этыкі, жаніх, перш чым стварaць сям’ю, павінен быў пераканацца ў тым, што яго будучая жонка – не толькі фізічна вынослівая жанчына, але і добрая гаспадыня. Згодна з мясцовым вераваннем, калі дзяўчына, прыйшоўшы дахаты з рэчкі, дзе яна мыла бялізну (“да шчэ колісь пойдуць, колісь жа морозы булі вялікія”), “да не полезе на печ, значыць, добра хазяйка будзе, яе замуж бярэ, а як каторая прыйдзе з рэчкі да на печ полезе, абмерзла, – усё, к другой ідзе [28, с. 325]. Першая чарка гарэлкі, выпітая сумесна маладымі, – сімвал згоды на шлюб у в. Галоўчыцы Нараўлянскага р-на. У в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на падчас сватання выкарыстоўвалі лапці, сімвалічныя дзеянні з якімі абумоўлівалі згоду або нязгоду на шлюб: “Сваты прыходзілі да хаты маладой, хлопец падыходзіў к дзвярам сенцаў, адкрываў іх і кідаў лапці, прыгаворваючы: “Шуры-буры, лапці ў хату!” І сам быстра бег пад акно паглядзець, што будзе рабіць дзеўка з тымі лапцямі. Еслі она не согласна ісці замуж, то выбрасывала лапці на двор з прыгаворам: “Не шурай, не бурай – свае лапці забірай!”. А еслі она была согласна на замужэство, то падымала іх, прыоткрывала дзверы і запрашала ў хату сватоў” [28, с. 359].

У в. Зашчоб’е Рэчыцкага р-на, калі дзяўчына развязвала чырвоную ленту, якой была абвязана бутэлька з гарэлкай, прывезеная бацькамі жаніха, значыць, яна згодна выйсці замуж.

Такой жа разгорнутай сістэмай прыкмет і павер’яў, вераванняў адрозніваецца сватанне і ў такім аспекце, як адмова нявесты ад шлюбу. Нежаданне выходзіць замуж асацыіруецца з наступнымі сімвалічнымі дзеяннямі, якія вылучаюцца таксама разнастайным вар’іраваннем у межах мясцовых традыцый: “Калі малады не падабаецца, то дзеўка хлеб іхны аддае назад” (в. Лескі Акцябрскага р-на), калі дзяўчына не давала згоды на шлюб, то “тайком выбягала ў сарай і прыносіла гарбуз, тайком лажыла яго на лаву і ўбягала” (в. Дуброва Акцябрскага р-на), “Колісь бывало, што і адмаўляла. Калі чаркі з гарэлкай не брала і до яго той хлеб, што жаніх прывёз, і выносіць ім гарбуза” (в. Бацунь Буда-Кашалёўскага р-на), “Калі не жадае нявеста выходзіць замуж, яе бацька, каб не пакрыўдзіць сватоў, гавора, што дачка яго яшчэ зусім маладая” (в. Кругавец Добрушскага р-на, вв. Лубавічы, Сямурадцы Жыткавіцкага р-на), “Еслі отказ, то всё, молодая не бярэ румку ў рукі і дае гарбуз” (в. Валаўск Ельскага р-на), “Калі ж нявеста не згодна, то сватам даюць гарбуз” (в. Касакоўка Жлобінскага р-на), калі дзяўчына не давала згоды на шлюб, то не прымала “пірог і гарэлку” сватоў (в. Сяменча Жыткавіцкага р-на), “Калі дзеўка не хацела

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ісці за гэтага хлопца замуж, то яна лажыла яму ў воз вараны гарбуз" (в. Востранка Жыткавіцкага р-на), "калі не згодна, то выкочвае жаніху гарбузу" (в. Грабяні Лельчыцкага р-на), калі не згодна выходзіць замуж, то "не п'е чарку і сватам даюць "вялікую гарбузу" (в. Маркоўскае Лельчыцкага р-на), "калі ж дзяўчына вымятала мусар з ізбы, гэты значыла, што яна не згодна і малады з дружынай пакідалі хату" (в. Страдубка Лоеўскага р-на), "Калі маладая перадумала, то вязе гарэлку, хлеб, соль і ручнік, якія прывозіў жаніх, і вяртае яму" (в. Гажын Нараўлянскага р-на), калі дзяўчына не згодна на шлюб, то "чаркі не бярэ" (в. Белая Сарока Нараўлянскага р-на) і інш.

Ідэя прадаўжэння роду, захавання жыцця знайшла адлюстраванне ў павер'і, паводле якога нявеста павінна была кінуць папярэдне ўзятыя ніткі і крыкнуць: "Каціцеся, дзеўкі, усе за мною", што інфарматары тлумачылі: "гэта, каб дружкі ў хуткім часе выйшлі замуж" (в. Параслішча Акцябрскага р-на). Выкарыстанне нітак можна лічыць невыпадковым, бо яны сімвалізуюць "бесперапыннасць у часе і ў прасторы, сувязь, лёс" [32, с. 238]. У прыведзеным кантэксце павер'я дзеянні маладой з ніткамі адлюстроўваюць высокія маральныя прынцыпы, з якімі ў народзе звязваюць працяг жыцця, пераемнасць пакаленняў. У гэтай жа вёсцы для таго, каб паспяхова прайшло сватанне, каб заможным і шчаслівым было сямейнае жыццё, у хаце "у вугал клалі салому, на салому – яйкі, грошы, гарэлку, і абавязкова ўсё накрывалі кажухом. Паводле народнай матывацыі, гэта неабходна было, каб у хаце "былі дзеткі, кветкі, капейкі і ласка" (в. Параслішча Акцябрскага р-на).

Семантыка вышэйназваных прадметных атрыбутаў, якія выкарыстоўвалі ў гэтай абрадавай сітуацыі, мела логіку. Напрыклад, непывадковасць яйка як сімвала з прадуцыравальнай семантыкай відавочная. "Яйка ў міфапаэтычнай традыцыі славян асэнсоўвалася як пачатак усіх пачаткаў, як сімвал адраджэння і абнаўлення, пладавітасці і жыццёвай сілы" [29, с. 397]. Што датычыць грошай, то гэта таксама сімвал багацця: "Грошы ўвасабляюць багацце, таму вельмі шмат вераванняў і рытуалаў, якія адносяцца да набыцця грошай і іх памнажэння" [33, с. 58].

Звычайна, калі адбывалася сватанне, засцілалі стол белым абрусам: "Усё гэта значыла, што дзеўка чыстая, нявінная" (в. Смычок Буда-Кашалёўскага р-на). Такая асацыяцыя белага колеру з цнатлівасцю дзяўчыны звязана з яго семантыкай як універсальнага сімвала бездакорнасці ў абрадах і рытуалах, якія сімвалізавалі пераход ў іншы стан. Белы колер – гэта "абсалютны колер святла і таму – сімвал чысціні, ісціны і ахвярнасці або боскасці" [32, с. 23].

Спектр міфалагічных уяўленняў, звязаных з караваем, надзвычай шырокі. Падкрэслім, што каравайны абрад – спецыфічная адметнасць вяселля Гомельшчыны. Павышаная ўвага да рытуалаў падрыхтоўкі і выпечкі каравая была прадыктавана сімволікай хлеба як святыні, багацця,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шчасця. “Каравай – не проста хлеб, а ўвасабленне ў ім язычніцкіх бостваў, якія такім ці іншым спосабам робяць уплыў на жыццё чалавека” [34, с. 107].

Напрыклад, у в. Лескі Акцябрскага р-на, калі каравайніца “пасадзіла каравай у печ, то лапатай па галаве ўсім мужчынам стукала”, а дзяўчаты імкнуліся як мага хутчэй схапіць дзяжу і вынесці яе ў камору. Магічны семіятычны код дзяжы быў звязаны са шлюбнымі матывамі: “дзяўкі хватаюць дзяжу: хто першая схопіць, тая уперад замуж пойдзе” (в. Лескі Акцябрскага р-на). Той факт, што каравай рыхтавалі замужнія жанчыны з ліку найбольш паважаных і шчаслівых у сямейным жыцці, сведчыць таксама аб тым вялікім значэнні, якое надавалася вясельнаму хлебу, якасць выпечкі якога, паводле народных уяўленняў, уплывала на лёс маладых, іх дабрабыт: “Каравай учыняюць замужнія жанчыны, паважаныя, шчаслівыя, якія добра жывуць, і гавораці:

*Із сямі крыніц вада,*
*Із сямі пшаніц мука,*
*Загранічнае масла*
*І яец паўтараста”* (в. Савічы Брагінскага р-на).

Каравайніцы вельмі адказна адносіліся да выканання рытуалаў падрыхтоўкі каравая, бо, лічылася, “не дай Бог пасля выпечкі пашкодзіць каравай. Гэта дрэнная прыкмета” (в. Кашалёў Буда-Кашалёўскага р-на). Паводле ўяўленняў жыхароў в. Бацунь Буда-Кашалёўскага р-на, “калі ж каравай у печы хаця б троху прыгарэў, то тады жыцця ў маладых не будзе, доўга разам жыць не будуць”, “Каравай даўжон быць румяным, роўным, бо када ён трэснуты ці каравы, такая і жызня будзе ў сям’і” (в. Чорнае Рэчыцкага р-на). Як растлумачылі інфарматары, упрыгожвалі каравай “дзеля багацця і каб дзеткі ў маладых былі здаровенькія” (в. Бацунь Буда-Кашалёўскага р-на), “каравай упрыгожвалі markdown розными фігуркамі, каб жыццё маладых было добрым і багатым” (г.п. Церахоўка Добрушскага р-на).

Рытуал замешвання цеста на каравай прадугледжваў таксама пэўныя правілы. Паводле народных уяўленняў, запрашалі для выпечкі каравая толькі тых жанчын, якія жывуць ў пары: “Разводку і ўдаву не дапускалі” (в. Багрымавічы Петрыкаўскага р-на). Добрай прыкметай лічылася, калі падрыхтаванае для каравая цеста добра “падышло” і “каравай падымаўся настолькі, што яго нельга было выцягнуць з печы, трэба было вымаць некалькі цаглін” (в. Кругавец Добрушскага р-на).

З мэтай, каб усе дзяўчаты з сям’і выйшлі замуж, бацька браў дзяжу і “прыпадымаў яе ўгару ў чатырох супрацьлеглых месцах. Гэта для таго, каб і яны на месце не сядзелі” (в. Касакоўка Жлобінскага р-на). Важнае месца падчас падрыхтоўкі каравая адводзілася назіраннем за надвор’ем: “Перад тым, як пачаць мясіць, пасылалі дзяўчынак на двор, каб тыя паглядзелі, ці



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

добрае надвор’е. Калі гаварылі, што неба яснае і месяц светлы, то лічылі, што ўсё будзе добра” (в. Саланое Жлобінскага р-на).

Цікавасць уяўляюць тлумачэнні інфарматараў наконт семантыкі “фігурак”, якімі ўпрыгожвалі каравай: “На версе каравая пасадзілі месяц, касічку сплялі. Месяц – каб жылі ўмесце” (в. Ляхавічы Жыткавіцкага р-на).

Магічныя якасці надаваліся і вадзе, у якой мылі рукі пасля падрыхтоўкі каравая: “Вадой, якой мылі рукі, палівалі хлеў, дрэвы ў садзе, каб добра ўсё расло і раджала” (в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага р-на), “Калі каравай ужо быў у печке, жанкі мылі рукі, і тую воду аддавалі маладой. А яна вылівала яе пад вішню, каб вішанькі развіваліся, а маладыя красаваліся” (в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на).

Абрадавыя этапы ўласнавясельнай часткі таксама захавалі рэшткі міфалагічных вераванняў нашых продкаў. Уласна вяселле на Гомельшчыне распачыналася з падрыхтоўкі каравая. Заўважым, што ў в. Лескі Акцябрскага раёна рыхтавалі тры караваі (мясцовая адметнасць): “першы ў відзе месяца, два другіх, як булкі і яшчэ маленькія птушачкі-каравайчыкі”.

Растлумачым семантычнае поле наступных дзеянняў, звязаных з караваем: “Як пасадзіла каравайніца каравай у печ, то лапатай па галаве ўсім мужчынам стукала” (в. Лескі Акцябрскага раёна, ад Жулега Ганны Іванаўны, 1923 г.н.).

Дзеянні з хлебнай лапатай (у дадзеным выпадку “біццё” ёю па галовах прысутных мужчын) сведчаць аб “рэалізацыі ідэі ўрадлівасці. “Сакральная характарыстыка гэтай прылады (лапаты – В.Н.) у сістэме вяселля найперш уласцівая для каравайнага рытуалу. Яе бясспрэчная рэальная патрэба для выпякання хлеба не супярэчыць міфалагічнаму падтэксту, калі хлебная лапата фактычна рэпрэзентавала сам каравай” [35, с. 45]. Семантыку дзеянняў з хлебнай лапатай варта асэнсоўваць у сувязі са значэннем дзеяслова “біць”. “Біць, біццё – рытуальнае магічнае дзеянне, якое мае пераважна прадуцыравальную і “адгонную” функцыі. Правакуе нараджальнасць (з’яўленне дзяцей, прыплод жывёлы), урадлівасць (выклікаенне дажджу, забеспячэнне ўраджаю), рост, здароўе і дабрабыт” [36, с. 177]. Напрыклад, на тэрыторыі валынскага Палесся (Любяшоўскі раён), “пакуль пёкся каравай, старыя жанчыны танцавалі пад музыку з хлебнай лапатай і злёгку білі ёю адна адну” [36, с. 177]. З семантыкай хлебнай лапаты звязвалі імкненне бацькоў выдаць замуж іншых незамужніх дачок: “Калі ў бацькі былі яшчэ незамужнія дочкі, лапатай, якой ставілі каравай у печ, дакраналіся да іх галоў” (в. Данілавічы Веткаўскага раёна, ад Дзмітрачковай Т.І., 1913 г.н.). Калі вымаюць каравай з печы, то “стукаюць тры разы лапатай аб столь, потым першая шаферка выскаквае з гэтай драўлянай лапатай на вуліцу. Калі сустрэне мужчыну, то скора выйдзе замуж, калі ж жанчыну – у гэтым годзе нельга спадзявацца на шлюб” (в. Гажын Нараўлянскага раёна, ад Лаворанка Яўгеніі Антонаўны, 1941 г.н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Паколькі з вясельным караваем, у якім увасобіліся і жаночы (суаднясенне этымалогіі слова з каровай, сімвалізацыя нявесты), і мужчынскі (увасабленне быка-жаніха) пачаткі, звязвалася ідэя пажадання багацця, шчасця, дабрабыту, вельмі асцярожна адносіліся да яго падрыхтоўкі: “Не дай Бог пасля выпечкі пашкодзіць каравай. Гэта дрэнная прыкмета” (в. Кашалёў Буда-Кашалёўскага раёна, ад Бажанковай Ганны Іванаўны, 1911 г.н.). Каравайніцы сачылі, каб каравай у печы “не прыгарэў: “Калі ж … хаця б троху прыгарэў, то тады жыцця ў маладых не будзе, доўга разам жыць не будуць, так лічылася” (в. Бацунь Буда-Кашалёўскага раёна, ад Іванчыкавай Марыі Антонаўны, 1931 г.н.). Працэс падрыхтоўкі каравая суправаджаецца шматлікімі песнямі-ілюстрацыямі. Напрыклад, “як замешвалі каравай, спявалі:

*Наша печка залівaецца,*
*Наша печка залівaецца,*
*Караваю дожыдаецца.*
*Наша печка рогочэ,*
*Наша печка рогочэ,*

*Караваю хочэ”* (в. Бацунь Буда-Кашалёўскага раёна, ад Іванчыкавай Марыі Антонаўны, 1931 г.н.).

Як бачым, у прыведзеных песенных радках яскрава выражана “мужчынская, перш за ўсё фалічная сімволіка”, гучыць “матыў коітусу” [33, с. 462].

У якасці ўпрыгожванняў былі на караваі фігуркі з цеста, якія з’яўляліся і мужчынскімі, і жаночымі сімваламі: “Ляпілі на караваі лісточкі, шышачкі… Упрыгожванні рабіліся дзеля багацця, і каб дзеткі ў маладых былі здаровенькія” (в. Пянчын, Буда-Кашалёўскага раёна, ад Кізіцкай Марыі Піліпаўны, 1920 г.н.).

Факт суаднесенасці каравая з фалічнай сімволікай пацвярджаецца сведчаннямі інфарматараў: “Калі замуж выходзіла ўдава або жаніўся ўдавец, каравай не пяклі” (в. Данілавічы Веткаўскага раёна, ад Дзмітрачковай Т.І., 1913 г.н.).

Прагназаванне лёсу маладых звязвалі з тым, як замешвалі каравай: “Каравай мясілі далонямі, а не кулакамі, каб малады ніколі не біў маладую” (в. Данілавічы Веткаўскага раёна, ад Дзмітрачковай Т.І., 1913 г.н.).

Пладавітасць дамашняй жывёлы на Веткаўшчыне звязвалі з караваем, таму рэшткі яго “неслі і давалі скаціне, каб вялася добра” (г. Ветка, ад Дзюньдзікавай Праскоўі Еўдакімаўны, 1920 г.н.).

Магічнае значэнне надавалася дзяжы, у якой замешвалі цеста на каравай, якая ў традыцыйнай культуры ўсходніх і заходніх славян надзялялася прадуцыравальнай сімволікай. Невыпадкова з ёю была звязана і шлюбная варажба: “Пасадзілі каравай, дзеўкі хватаюць дзяжу, хто першая

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

схопіць, тая ўперад замуж пойдзе" (в. Лескі Акцябрскага раёна, ад Жулега Ганны Іванаўны, 1923 г.н.).

Дзяжа выконвае важную ролю не толькі падчас падрыхтоўкі каравая, але і з'яўляецца неабходным атрыбутам пасада нявесты або жаніха. "Сімволіка дзяжы расшыфроўваецца з улікам апазіцыі мужчынскі/жаночы. У шматлікіх рытуалах дзяжа ўвасабляе жаночае чэрава, адпаведна рост плоду, дзіцяці атаясамліваецца з падыходам, падыманнем цеста. Таму дзяжа становіцца культурным эквівалентам жанчыны наогул, цяжарнай у прыватнасці, і пачынае выкарыстоўвацца ў абраднасці, накіраванай на магічнае спрыянне нараджэнню. Паўсюль на дзяжу саджалі нявесту і парадзіху ў час цяжкіх родаў…" [16, с. 146-147].

Адметнасцю пасада ў беларусаў з'яўляўся той факт, што ён існаваў у двух відах – пасад жаніха і пасад нявесты. Ёсць сведчанні, што на тэрыторыі "на дзяжу не толькі садзіліся, але і станавіліся, прычым лічылася, што гэта можа зрабіць толькі нявеста, якая захавала цнатлівасць. Згодна з павер'ем, калі "нечестная" нявеста наступіць на дзяжу, то сем гадоў не будзе "радзіць" хлеб, не будзе весціся жывёла, не будуць жыць дзеці ў маладых" [29, с. 157].

У в. Бацунь Буда-Кашалёўскага раёна, калі "прывозілі маладую да маладога, яна з воза не злазіла, пакуль свякруха не вынесе дзежку і ад дзежкі да парогу не расцеле палатно. На дзежку клалі палаценца саматканае. І нявеста на тую дзежку станавілася нагой. Калі яна ўжо страціла сваю дзявоцкасць – то на дзежку не станавілася, бо хлеб не будзе ўдавацца" (Запісана ад Іванчыкавай Марыі Антонаўны, 1931 г.н.).

Як бачым, з цнатлівасцю нявесты ў народных павер'ях звязвалася якасць каравайнага хлеба. Паводле ўяўленняў беларусаў Гродзеншчыны, "перад ад'ездам да маладога сват клаў на зямлю века дзяжы, засцілаў яго абрусам, пасыпаў жытам; калі маладая захавала дзявоцкасць, то яна станавілася на гэта века і ў прысутнасці ўсіх надзявала новую бялізну і чыстае адзенне" [29, с. 157-158].

Калі сустракалі маладых пасля вянчання, то падносілі ім "хлеб-соль" і вызначалі па тым, хто "больш укусіць", той з маладых будзе верхаводзіць у сям'і ("той большую ўласць у сям'і мець будзе" – в. Лугінічы Буда-Кашалёўскага раёна, ад Быхаўцавай Е.І., 1926 г.н.).

Цікавыя міфалагічныя ўяленні звязаны і з адметным абрадавым этапам "Ёлка" ("Вяночкі") у структуры палескага вяселля. Вядома, што семантыка дрэва, назвай якога пазначаны вясельны абрадавы этап, звязана з цнатлівасцю маладой. Звычайна ўпрыгожаную ёлачку (невялікае дрэўца або галінка, вершаліна) уторквалі ў каравай. Сімволіка ёлкі ў вясельнай абраднасці мае значэнне вечнасці, суадносіцца з "ідэяй сувязі светаў і станаў, што ўпісвалася ў больш агульную ідэю пераходу, асноўную і для вясельнага, і для пахавальнага абрадаў" [16, с. 159].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У в. Данілавічы Веткаўскага раёна ёлку, якую "вілі дзеўкі ў зборную суботу, становяць на кут. Маладая стаіць пад ёлкай" (Запісана ад Дзмітрачковай Т.І., 1913 г.н.). Абрад выкупу маладой і ёлкі суправаджаўся наступнымі сімвалічнымі дзеяннямі: "Малады з маладою стараюцца зламаць у ёлкі вярхушку". Лічылі, хто першым з іх зламае вярхушку ёлкі, той будзе гаспадаром у хаце". У гэтай жа вёсцы звычай "віць ёлку" адбываўся ў зборную суботу. Пасля таго, як яе ўжо ўпрыгожылі рознымі кветкамі і стужкамі, ставілі на стол, а "дзеўкі ўсе разам craналі яго з месца, ламалі апаўшыя іголкі, выкідалі за дзверы абрус, якім быў пакрыты стол". Гэтыя дзеянні, паводле міфалагічных уяўленняў, павінны былі паспрыяць хутчэйшаму шлюбу: "Гэта рабілася для таго, каб астатнія дзеўкі хутчэй выйшлі замуж".

У вясельнай традыцыі в. Лугінічы Буда-Кашалёўскага раёна быў звычай ставіць ёлку ў сані маладых, а пад ёлкай знаходзіўся "сундук з пасцеллю". Паводле мясцовых павер'яў, перад тым, як зайсці ў хату, нявеста павінна была зламаць вярхушку вясельнай ёлкі, якую спецыяльна пакідалі ў двары. З гэтымі сімвалічнымі дзеяннямі было звязана імкненне маладой быць добрай гаспадыняй і мець багатую гаспадарку.

Звычай "закідваць зайца" – надзвычай распаўсюджаны момант у вясельнай традыцыі Гомельшчыны, калі дружына маладога ехала забіраць маладую: "На дзярэўні ў некалькіх месцах ім перагараджалі дарогу – "зайца лавілі", то бервяно паложаць, то вяроўку перацянуць". Заяц у народнай міфалогіі – гэта жывёла, якая надзялялася не толькі дэманічнымі ўласцівасцямі, але і эратычный (фалічнай) сімволікай. "Пра дзяўчыну, якая не можа выйсці замуж, гавораць, што яна тады замуж выйдзе, калі ў лесе зайца зловіць" [29, с. 191].

Увогуле выкананне вясельных песень, міфапаэтычныя матывы якіх мелі шлюбны характар, іншы раз з'яўлялася адным з фактараў вызначэння "цнатлівасці" нявесты. "У карагодных гульнях заінька паўстае жаніхом, які выбірае сабе нявесту, яго просяць звіць вянок, пацалаваць дзяўчыну і г.д." [29, с. 190].

Абрад вянчання, як іншыя абрадавыя моманты вяселля, прасякнуты міфалагічнымі ўяўленнямі. Па тым, як гарапь свечкі, вызначалі лёс маладых: "гарапь добра і ярка, то жыццё маладых будзе добрым, зладжаным; калі свечка плача – яны ўсё жыццё будуць плакаць. Калі свечка будзе дрэнна гарэць ці зусім патухне, то маладыя хутка разойдуцца" (г. Мазыр, ад ураджэнкі в. Слапішча Рагачоўскага раёна Кавалеўскай Аляксандры Міхайлаўны, 1923 г.н.).

З сімволікай пазбаўлення ад усяго дрэннага на Рагачоўшчыне звязаны рытуал абыходу маладымі вакол стала, прычым маладыя павінны былі ручнік цягнуць за сабой, каб "усё дрэннае замяталася, а далейшае ўсё жыццё яны жылі добра" (г. Мазыр, ад ураджэнкі в. Слапішча Рагачоўскага раёна Кавалеўскай Аляксандры Міхайлаўны, 1923 г.н.). Апошняе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

міфалагічнае вераванне зафіксавана і ў в. Калініна Гомельскага раёна (“У цэркві давалі ручнікі, клалі кругом стала і кругом стала нада было ручнік абвесці. Гэта прыкмета такая, штоб усе падругі нявесты замуж павыходзілі” (Запісана ад Халяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г.н.)).

Сярод іншых міфалагічных матываў, якія асабліва выразна выражаны ў акцыянальным аспекце ўласнавясельнай часткі, варта прыгадаць наступныя: калі ўжо ехалі маладыя з царквы, то павінны былі пераехаць цераз раскладзены касцёр. Гэтыя дзеянні мелі апатрапеічны характар. Як засведчылі інфарматары, “гэта рабілі, каб адагнаць злыя сілы, каб було шчаслівае жыццё” (в. Насовічы Добрушскага раёна, ад Сімуты П.Д., 1924 г.н.).

Каб засцерагчы маладых “ад суроку”, у в. Гусявіца Буда-Кашалёўскага раёна таксама раскладвалі агонь і пераязджалі цераз яго (Запісана ад Рубанавай Надзеі Міхайлаўны, 1933 г.н.).

Прынцыпамі імітатыўнай магіі абумоўлена мясцовае павер’е аб дружнай (“крэпкай”) сям’і: “Вечарам з маладой знімаюць вянок з фатой і хустку, маці нявесты ўдарае галавой жаніха і нявесту, каб іх сям’я была крапчэй. Чым сільней яны ўдараюцца галавамі, тым сільней будзе ў іх сям’я” (в. Кірава Жлобінскага раёна, ад Скрыпнікавай Ульяны Пятроўны, 1927 г.н.).

Сачылі падчас вяселля і за тым, каб госці сядзелі “адзін да аднаго не спінамі”, бо інакш, лічылі, могуць пасварыцца сем’і маладога і маладой. Прытрымліваліся і пэўнага часу правядзення вяселля, напрыклад, жыхары в. Печышчы Светлагорскага раёна былі перакананы, што нельга ладзіць вясельнае застолле ў час посту, бо “будуць нешчаслівыя маладыя” (Запісана ад Дайнека Дар’і Фядосаўны, 1927 г.н.). “Асноўныя перыяды вяселля прыпадалі на час ад Багача і да Піліпаўкі (“вялікая вясельніца”), ад Вадохрышча і да Масленкі (“мясаедная вясельніца” [16, с. 107].

Захоўваецца і ў сучасным святкаванні вяселля даўнішні звычай сустрэчы бацькамі маладых, прычым, “стракалі маладых тыя бацькі, якія жылі ў пары і лучшай ладзілі, а калі там бацькоў няма ці яны не парныя – то хросныя” (в. Чорнае Рэчыцкага раёна, ад Капашкінай Пелагеі Апанасаўны, 1927 г.н.).

Звычайна, сустракаючы маладых, традыцыйна наліваюць ім па чарцы гарэлкі. Згодна з народнымі павер’ямі, трэба было “крыху адпіць і кінуць румкі чэраз левае плячо”, але пры гэтым забаранялася аглядвацца назад (“толькі нельзя паварочвацца і глядзець, разбіліся румкі ці не, бо ета значыла вярнуцца зноў у халастую жызню” – в. Чорнае Рэчыцкага раёна, ад Капашкінай Пелагеі Апанасаўны, 1927 г.н.). Каб жыццё было заможным і шчаслівым, у г. Хойнікі “мазалі губы маладых мёдам” (Запісана ад Гардзейчык Надзеі Ульянаўны, 1929 г.н.).

Даследаванне міфапаэтычных матываў ва ўласнавясельнай акцыянальнай частцы дазваляе зрабіць высновы, наколькі складаны гэты

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

абрадавы комплекс, наколькі важнае магічнае значэнне надавалася асобным абрадавым сімвалічным дзеянням, якія былі звязаны markdownрознымі рытуаламі, наколькі багаты свет міфалагічных уяўленняў.

Паслявясельная частка, як давясельная і ўласнавясельная, вылучаецца таксама багатай сістэмай міфалагічных вераванняў, прыкмет і павер'яў. Звернемся да запісаў звестак пра рытуалы паслявясельнага перыяду ў розных рэгіёнах Беларусі, у прыватнасці, Гомельшчыны як часткі тэрыторыі Усходняга Палесся.

Напрыклад, паслявясельную частку ў в. Лескі Акцябрскага раёна называлі "вясельныя госці", якія "рабілі ў хаце маладой праз нядзелю (пасля вяселля), а яшчэ праз нядзелю – у хаце маладога" [28, с. 9]. У в. Чырвоная Слабада Акцябрскага раёна інфарматары не даюць назвы гэтай паслявясельнай цырымоніі, але адзначаюць факт пераапранання: "На другі дзень на вяселле могуць прыйсці ражаныя, людзі, якія пераапранаюцца ў маладых. Родныя жаніха крычаць, што іх падманілі, але малады павінен знайсці сярод ражаных сваю жонку" [28, с. 11].

У в. Дуброва Акцябрскага раёна паслявясельны звычай наведвання маці дачкой мае назву "паслявясельныя госці". Паводле народных павер'яў, дачка, калі ўжо выйшла замуж, то "ўсю нядзелю не далжна паяўляцца ў бацькоўскім доме. Паслявясельныя госці – бацькі жаніха – едуць да бацькоў нявесты. Абавязкова ехалі сваты, бо яшчэ не былі ў хаце нявесты" [28, с. 27]. У прыведзенай мясцовай традыцыі было прынята на працягу тыдня ўзаемнае наведванне радні жаніха і нявесты ("У цечэнні нядзелі ўсе ездзяць адзін к другому" [28, с. 27]).

Больш падрабязныя звесткі пра паслявясельны перыяд на Брагіншчыне дазваляюць паразважаць пра семантыку рытуалаў, якімі заканчвалася вяселле. Пад назвай "другі дзень вяселля" ў в. Вязок Брагінскага раёна былі аб'яднаны такія сімвалічныя дзеянні, як пераапрананне "бабы ў мужыка, а мужыка ў баб", пераапрананне ў цыган, якія імітуюць "маладых". Прадметны атрыбут (лялька) – своеасаблівы сімвал маладой, якой быццам бы незадаволены ў новай сям'і і вяртаюць назад бацькам: "Прыходзяць да маці нявесты, даюць ёй ляльку і кажуць: "Бяры сваю дачушку, яна паганая". А маці адказвае: "А хіба ж я вам такую давала, я ж вам давала добрую і прыгожую, мне такой не трэба" [28, с. 31].

Як адзначылі інфарматары, пасля вяселля ў іх мясцовасці едуць "на пірагі". Пры гэтым спяваюць:

*Казалі нам людзі,*  
*Што сваты багатыя,*  
*Ан яны скупаватыя.*  
*Па шляху хадзілі,*  
*Старцаў вадзілі,*  
*Ды капейкі збіралі,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Дружак даравалі.*
*Не гніся, дружа, не гніся,*
*Па чырвонаму складзіся.*

“Бадай, ні адно вясковае вяселле не абыходзіцца без раджаных”. Пераапранаюцца, як і раней, на другі дзень вяселля. “Раджанне” зараз носіць пацешлівы, жартоўны характар, хоць у некаторых выпадках захоўваюцца элементы эротыкі. Па-ранейшаму мужчыны пераапранаюцца ў жаночую сукенку, а жанчыны – у мужчынскае…” [37, с. 225].

У в. Міхнаўка Брагінскага раёна трэці дзень вяселля быў звязаны з наведваннем бацькамі маладой бацькоў маладога: “госці са стараны бацькоў маладой збіраліся, нараджаліся ў “цыганей” і ехалі, або, калі было недалёка, то ішлі пешшу да бацькоў маладога” [28, с. 43].

“Пярэзвы” ж у гэтай мясцовасці адбываліся праз тыдзень пасля вяселля, калі бацькі маладой чакалі ў госці “дачку з зяцем і са сватамі”. А яшчэ праз тыдзень “пярэзвы” ладзілі бацькі маладога. Адметнай была назва паслявясельнай часткі ў в. Савічы Брагінскага раёна – “па бяседах”. Сутнасць назвы, як патлумачылі інфарматары, наведаць пасля вяселля ўсіх, хто ўдзельнічаў у вяселлі: “сколькі двароў у свадзьбы, усе хадзілі ў тыя двары па бяседах” [28, с. 50].

Можна заўважыць, як узнаўляюцца асобныя фрагменты вяселля ў структуры мясцовай паслявясельнай часткі. Праўда, абыгрываюцца яны ў жартоўнай, камічнай форме: маюць месца такія дзеянні, як прыход “цыган” да маладога, іх не пускаюць на падвор’е, адбываецца сімвалічны выкуп гэтага права зайсці (“а патом пусцяць ужэ ў двор, магарыч дадуць” [28, с. 50]), адорванне падарункамі. “У канцы вясельнага абрада яго ўдзельнікі разыгрывалі жартоўнае вяселле з “раджанай” “нявестай”, узнаўляючы ў парадыйным выглядзе ўсе асноўныя абрадавыя цырымоніі” [38, с. 387].

Прысутнасць маладых у паслявясельнай цырымоніі непажаданая (“А маладым нельзя хадзіць, штоб ужэ ўсягда ля двара былі нада” [28, с. 51]).

Па-мясцоваму адметным у паслявясельнай абраднасці в. Калыбань Брагінскага раёна (выселенай вёскі ў сувязі з чарнобыльскай трагедыяй) быў звычай прыбіваць вельца (высечаная з грушы трайчатка) на вільчык (канец страхі). Рытуал абменьвання вельцамі ў маладых адбываўся напярэдадні або ў пачатку вяселля. Што ж датычыць семантыкі старажытнага абраду іх прыбівання, то варта даверыцца словам мясцовых жыхароў: “Можна ўведаць, колькі вяселляў у вёсцы” [28, с. 60].

У в. Залессе Брагінскага раёна, калі вяселле ўжо заканчвалася, то госці маладога гуляюць у маладога, а маладой – у маладой [28, с. 61].

Сярод спецыфічных рытуалаў мясцовай паслявясельнай цырымоніі можна вылучыць “дзяльбу каравая” і “біццё курэй”. “Курыца – увасабленне жыватворнага, пладаноснага жаночага пачатку. Праз вобраз курыцы ў фальклорнай творчасці замяшчаецца маладая на вяселлі і наогул дзяўчына,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

гатовая да шлюбу, нявеста: “Курка-рабушка рогоче, на сідало хоче, // Малода девонька плаче, бо с хатонькі хоче” [16, с. 270].

На Кармяншчыне паслявясельны этап мае назву “брацьбанкеты”. Сутнасць гэтага рытуалу, калі звярнуцца да этнаграфічнага кантэксту, заключалася ў тым, што “на наступны дзень вяселле спраўлялі ў хаце хроснай маткі нявесты і хроснага бацькі жаніха. Гэта называлася “браць банкеты”. Звычайна на “банкетах” спявалі песню:

*Да й каціласядызорачка з неба,*
*Да й упала за дол.*
*Журылася красная дзяўчонка,*
*Хто й завядзе дамоў.*
*Ой, не журыся, красная дзяўчынка,*
*Я завяду дадому”* [39, с. 135].

Цікава адзначыць, што ў гэтай жа мясцовасці, у в. Багданавічы Кармянскага раёна, “на трэці дзень вяселля, гулялі разгуліны”. Паводле тлумачэнняў інфарматара, “госці маладой прыходзілі да яе дому, а госці маладога да яго. Зноў гулялі, спявалі песні, пілі за шчасце маладых” [39]. У в. Сямёнаўка пацвердзілі, што другі дзень вяселля быў звязаны з узаемным наведваннем гасцямі адзін аднаго, і называлася гэта “банкеты”. У асобных вёсках Кармяншчыны (в. Задуб’е) паслявясельны этап вяскоўцы звязвалі з назвай “цыгане”, калі “на другі дзень у маладога, калі прывозілі маладую, тады ўжо назаўтра пераапраналіся ў другую адзежу, хто ў цыган, старухі адзяваліся ў маладую. Пераадзенуцца, пачудзюць” [39].

Зусім іншую мясцовую назву мае паслявясельны этап у вёсках Гомельскага раёна. Напрыклад, у в. Маркавічы трэці дзень вяселля называлі “вадзіць цыганаў”. Сэнс гэтага ўстойлівага словазлучэння патлумачылі самі інфарматары: “… госці маладога і маладой “вадзілі цыганаў” – хадзілі па дварах тых, хто гуляў на вяселлі, з падстаўнымі маладымі і патрабавалі пачастункі. Самі маладыя ў гэтых гульнях не ўдзельнічалі” [40, с. 154]. Назву паслявясельнай часткі “вадзіць цыганаў” звязваюць непасрэдна з пераапрананнем “у цыганей і лекароў” (в. Глыбоцкае), “мужчыны пераапранаюцца ў спадніцы, хусткі, стараюцца пахадзіць на жанчыну, што выклікае смех, сярод іх ёсць і “цыганка”, якая прыстае к усім. Просіць дазволу паваражыць” (в. Чкалава).

Вяселле ў вёсках Жыткавіцкага раёна заканчвалася наведваннем гасцямі бацькоў маладых. У в. Любавічы называлі гэты звычай “пірагі” (або “госці”) і адбываўся ён праз тыдзень пасля вяселля. Удзельнічалі звычайна ў гэтай паслявясельнай цырымоніі блізкія сваякі, хросныя бацькі і бацькі маладой, якіх садзяць на ганаровае месца ў хаце маладога і частуюць лепшымі пачастункамі. Мясцовы звычай забараняў маладой на працягу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тыдня бываць у сваіх бацькоў, патрабаваў абавязковага выканання песні “Вецер вее, павявае”:

*Вецер вее, павявае*
*Маці ў дачкі пра жыццё путае:*
*Путай, маці, у шэрай вуці.*
*Шэрая вуці на моры начуе,*
*На моры начуе – усё горачка чуе* (Запісана ў в. Любавічы Жыткавіцкага раёна ад Матарас Сцепаніды Прохараўны).

У в. Хільчыцы Жыткавіцкага раёна бытуюць дзве ўстойлівыя лакальныя назвы рытуалаў наведвання бацькоў маладых: гэта “пераводы”, калі радня маладой ішла ў госці да маладых, і “пірагі”, калі госці збіраліся ў хаце маладой. Прыходзілі і маладыя, але ўвагі на іх амаль не звярталі. Госці не проста пелі, жартавалі, але імітавалі асобныя вясельныя дзеянні: “Вубіралі з гасцей молодого і молодую. Молодою пошчы ўсегда буў мужчына, а молодым – жонка. Опраналіса оны, як молодые. Да после выкуплівалі ў настоўчых молодых покуця, шоб на его сесці. Да ўжэ, ек отвоююць его, то сядзяць усе пірогі на ём. Зноў спяваем, танцуем, шуцімо” (Запісана ў в. Любавічы Жыткавіцкага раёна ад Матарас Сцепаніды Прохараўны). Цікава, што “пераводы” адбываліся ў панядзелак, калі “бацькі і блізкая радня маладой ішлі праведаць маладую, як яна тут прыжылася” (Запісана ў в. Любавічы Жыткавіцкага раёна ад Матарас Сцепаніды Прохараўны).

Аналагічны абрадавы сэнс мае выраз “ісці ў прыданыя”, якім у в. Ляхавічы Жыткавіцкага раёна называюць паслявясельнае “гасцяванне” радні маладых у хаце жаніха:

*Адчыняй, матка, лецён,*
*Бо на тыя жоўтыя лаўкі*
*Ды пасядуць прыданкі.*
*Ды паселі ўсе прыданкі,*
*Што пагнуліся лаўкі.*
*Ой, не так увагнуцца,*
*Як гарэлкі нап’юцца* (Запісана ў в. Ляхавічы Жыткавіцкага раёна ад Кур’яновіч Ніны Іванаўны, 1927 г.н.).

Наведванне блізкімі сваякамі маладых у панядзелак мае ў в. Ляхавічы мясцовую назву “хадзіць у пярэзыў”. У в. Сямурадцы праз тыдзень пасля вяселля “назначаліся госці”, дзе збіраліся “самыя родныя з стараны жаніха і нявесты”.

Мясцовай асаблівасцю паслявясельнай традыцыі на Ельшчыне з’яўляецца “хвост”, сутнасць якога заключалася ў тым, што ў панядзелак пасля вяселля госці маладога збіраліся ў яго хаце, а госці маладой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыходзілі ў хату да яе, звычайна пераапраналіся мужчыны ў жаночае адзенне, а жанчыны – у мужчынскае. У якасці прадметнай вясельнай атрыбутыкі выкарыстоўваліся венік, які сімвалізаваў ёлку, каравай, прыносілі снеданне (“на жардзіну начапляюць і буракоў, і качаноў, і костак”), узнаўлялі асобныя вясельныя абрадавыя рытуалы (напрыклад, апявалі ёлку і завівалі маладых), выконвалі жартоўныя песні.

Многія з прыкмет і павер’яў, звязаных з вяселлем, мелі забабонны характар, асобныя вераванні, увасобленыя ў сімвалічных дзеяннях, з’яўляліся неабходным звяном у складанай структуры вясельнага абраду. Напрыклад, біццё посуду на вяселлі, зыходзячы з народных уяўленняў у некаторых мясцовых традыцыях, мела амбівалентны характар: абазначала няўдачу ў сямейным жыцці (“біць пасуду на свадзьбе – к разбітай жызні” (в. Стараселле Добрушскага р-на), а таксама лічылася, што маладыя будуць добра жыць (“добра, калі пасуда б’ецца на свадзьбе” (Запісана ад Арцёмавай Таццяны Мікалаеўны, 1931 г.н., в. Прысно Веткаўскага р-на). У в. Усохская Буда Добрушскага раёна выконвалі спецыяльны магічны рытуал, калі маладыя праходзілі па ручніку: “Перад нявестай і жаніхом клалі рушнік, а пад рушнік – расчэплены замок. Калі яны пераходзілі па рушніку, баба брала замок, замыкала яго і аддавала жаніху, а ключ – нявесце, шоб не разлучаліся” (Запісана ад Балмаковай Марыі Андрэеўны, 1929 г.н.).

З мэтай засцярогі ад уздзеяння звышнатуральнай сілы практыкавалі такі спосаб “абярэгу”: “Калі жаніх прыязджаў з дружынай да нявесты, б’юць сякерай аб сякеру, штоб адагнаць нячыстую сілу” (г. Добруш).

Жыхары в. Баршчоўка Добрушскага р-на верылі, што “калі на свадзьбе паламаеш каблук, рана мужыка пацяраеш” (Запісана ад Шкедавай Любові Кірылаўны, 1932 г.н.).

Па тым, як гараць свечкі, вызначалі, як складзецца лёс маладых: “Еслі свечкі гарат ярка, то ў сям’е будзе ўсё. Кагда свечка нявесты гарэла медленна і не ярка, то шчыталі, што нявесце будзе плоха ў сям’і жаніха” (Запісана ад Кудравец Клаўдзіі Фёдараўны, 1944 г.н., г. Мазыр).

Варажылі ў народзе і аб тым, як складуцца ўзаемаадносіны паміж свякрухай і нявесткай: з гэтай мэтай маладая высыпала зерне ў двары жаніха, каб ніхто не ўбачыў, а раніцай ішлі паглядзець, ці склявалі куры зерне (“Калі куры склявалі, то маладая будзе жыць добра са свякроўю, а калі не, то будзе разлад” (Запісана ад Кілянковай Г.Н., 1917 г.н., в. Скепня Жлобінскага р-на).

Каб не дапусціць у сям’і разладу, імкнуліся, каб ніхто “паміж маладымі не праходзіў” (Запісана ад Арцёмавай Таццяны Мікалаеўны, 1931 г.н., в. Прысно Веткаўскага р-на); каб падчас вяселля маладыя таксама моцна трымаліся за рукі (“каб между німі ніхто не прайшоў – каб не было развода” (Запісана ад Казловай Марыі Нікіфараўны, 1935 г.н., в. Халочча Чачэрскага р-на). Звязванне прадметаў качарэжніка, паводле народных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

вераванняў, прагназавала добрае і доўгае жыццё маладых. Невыпадкова, калі адпраўляліся ў сваты, і калі "сваты прыходзілі ў хату, то старая бабка звязвала ўместа качарэжнік, каб маладыя добра, доўга жылі" (Запісана ад Казловай Марыі Нікіфараўны, 1935 г.н., в. Халочча Чачэрскага р-на).

Важную магічную ролю ў каравайным абрадзе адыгрывала лапата (хлебная). "У кантэксце вяселля сімволіка лапаты хлебнай непасрэдна судачыняецца з сімволікай каравая і таму выяўляе ідэі багацця і ўраджаю, шлюбу і культу продкаў, ідэі самога роду, належнае месца займае і фалічная метафарычнасць лапаты хлебнай" [16, с. 279]. Апошняе яскрава выяўляецца ў маніпуляцыях з лапатай: "Пасля таго, как паставілі каравай у печ, лапату аб галаву б'юць, асобенна мужыкам" (Запісана ад Бабровай Еўдакіі Якаўлеўны, 1924 г.н., г. Мазыр).

Рыхтуючы цеста для каравая, пільна сачылі за тым, каб узяць адразу столькі мукі для замесу, каб больш яе не дабаўляць. Лічылі, што "сколько раз будзеш дабаўляць муку, столько раз малады / маладая будзе замуж ідці або жэніцца " (Запісана ад Бобрык Таццяны Максімаўны, 1925 г.н., в. Лужок Кармянскага р-на).

Матыў шчаслівага шлюбу маладых і матыў росту вішні – асноўныя ў каравайнай песні, запісанай у гэтай жа вёсцы на Кармяншчыне:

*Ой, вісу, мой вісу,*
*Да наліце воду ў місу,*
*Да ручанькі помоймо,*
*Да на вішэньку злеймо,*
*Шоб вішэнька развівалаcа,*
*Молодые красоваліса.*

У прыведзеным тэксце ілюструецца адзін з каравайных рытуалаў – мыццё рук каравайніцамі і выліванне вады пад пладовае дрэва. Пры дапамозе паралелізма ("Шоб вішэнька развівалаcа, / Молодые красоваліса") выразна дэманструецца магічны ўплыў той вады, у якой каравайніцы мылі рукі пасля замесу каравая.

У в. Кацуры Петрыкаўскага р-на, як і ў іншых мясцовасцях Гомельшчыны, першы кавалак каравая аддавалі маладым, было прынята ў мясцовых павер'ях, каб "маладыя ўкусілі з гэтага куска самі", прычым сэнс бацькоўскіх пажаданняў як вербальнага суправаджэння быў звязаны з важнай для сям'і умовай усведамлення працавітасці, як важнай катэгорыі ўладкавання сямейнага дабрабыту: "На чужы каравай рот не разяўляй, а свой май, штоб вы жылі, багацелі і свой хлеб мелі" (Запісана ад Плікус Марыі Сцяпанаўны, 1930 г.н.). Калі выпякалі каравай, абавязкова ў цеста мясцовыя каравайніцы клалі два яйкі ("каравай пяклі вялікі, у цеста лажылі два яйца і сажалі яго ў печ" (в. Кацуры Петрыкаўскага р-на).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

“Яйка ў міфа-паэтычнай традыцыі славян асэнсоўвалася як пачатак усіх пачаткаў, як сімвал адраджэння і абнаўлення, пладавітасці і жыццёвай сілы” [29, с. 397].

У рытуале сустрэчы маладых павінны былі ўдзельнічаць і свёкар, і свякруха (калі маці жаніха была ўдавой, то сустракала маладых разам з хросным бацькам). Па прынцыпу магічнага падабенства прагназавалася, што і “маладыя пражывуць у пары шмат гадоў” (Запісана ад Рыжанковай Таццяны Міхайлаўны, 1931 г.н., в. Лужок Кармянскага р-на).

Фальклорна-этнаграфічныя звесткі, запісаныя на Гомельшчыне, дазваляюць канстатаваць факт багатай лакалізацыі паслявясельнай традыцыі, яе незвычайнасці. Агульнасцю семантыкі і функцыянальнасці з’яднаны ўсе самыя розныя лакальныя назвы паслявясельнай часткі – гэта ідэя пладавітасці, магія дзетанараджэння. Разнастайныя сімвалічныя дзеянні ў структуры паслявясельнай абраднасці і паэзіі ў падтэксце дэманструюць нам іх сэнс, звязаны з пераводам дзяўчыны ў жаноцкі стан.

Сабраныя звесткі па вясельнай абраднасці Гомельшчыны дазваляюць канстатаваць факт арганічнай сувязі асобных вясельных момантаў з міфалагічнымі вераваннямі, прыкметамі і павер’ямі. Паколькі для беларускага вяселля, як і для ўкраінскага характэрна шырокая тэматычная спецыялізацыя песень і выразна абазначаны ў яго структуры асобныя этапы, то такую ж дыферэнцыяцыю ў адпаведнасці з апошнімі можна назіраць і ў сістэме прыкмет і павер’яў, прычым у кожнай лакальнай традыцыі яны вылучаюцца мясцовай спецыфікай.

Прадстаўленыя матэрыялы даследавання міфа-паэтычных матываў у вясельнай абраднасці і паэзіі Гомельшчыны дэманструюць архаічнасць светапогляду беларусаў, сведчаць аб прасякнутасці ўсіх абрадавых момантаў вяселля міфалагічнымі ўяўленнямі.

Вясельны абрад – гэта важная падзея ў сямейным і грамадскім быце беларускіх сялян. Чалавек заўсёды надаваў утварэнню сям’і важнае значэнне. Невыпадкова шлюбная традыцыя на працягу стагоддзяў шліфавалася, узбагачалася, сур’ёзна выконваліся неабходныя рытуалы і песні для кожнага абрадавага этапу, бо ідэя прадаўжэння роду спакон веку асэнсоўвалася ў народнай філасофіі як вызначальны жыццёвы фактар.

Вясельныя абрады і песні славянскіх народаў маюць шмат агульных рысаў, якія выяўляюцца ў самой структуры цырымоніі святкавання (яе падзеленасць на тры часткі – давясельныя, уласнавясельныя і паслявясельныя дзеянні).

Для вяселля ўсходнеславяскіх народаў характэрны такія этапы, як сватанне, якое адбывалася ў іншасказальнай дыялогавай форме, зборная субота (“девишник”), якая заканчвалася расплятаннем касы маладой, падрыхтоўка нявесты да вянчання, рытуалы “выкупу” маладой, дзяльба каравая, магічныя дзеянні з мэтай засцерагчы маладых. Адметнасці вясельнай абраднасці ў рускіх – гэта “рукабіццё”, як абрадавы момант, які

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

выконваўся, калі канчаткова дасягалася дамоўленасць паміж бацькамі маладых аб шлюбе, а таксама “баня”, якой заканчваўся перыяд падрыхтоўкі да вяселля.

На тэрыторыі ўкраінскага Палесся адметным элементам вяселля з’яўляўся рытуал абрадавага ўручэння ботаў нявесце (“чоботоносини”, “взувать молоду”).

Што датычыць агульнабеларускай вясельнай абраднасці, то варта адзначыць, што ва ўсіх рэгіёнах пераважаў шлюб па сватанню. Іншы раз назіраліся і адметнасці ў тэрміналагічным словаўжыванні. Як адзначаў А.С. Фядосік, “у некаторых месцах Беларусі сватанне нявесты аб’ядноўвалася з запоінамі; у другіх – запоіны спалучаліся з заручынамі і называліся або заручынамі, або запоінамі-заручынамі; у трэціх – запоіны папярэднічалі заручынам, якія адбываліся напярэдадні вяселля; у чацвёртых запоіны і заручыны называліся адпаведна малой гарэлкай і вялікай гарэлкай; у пятых – запоінамі называліся перадвясельныя абрады (да трох і больш), у тым ліку і дзявоцкі вечар; у шостых – заручынамі называлі блаславенне жаніха і нявесты перад царкоўным вянчаннем і інш.” [25, с. 119].

Сабраны матэрыял па вясельнай абраднасці яскрава прадэманстраваў карціну багатай мясцовай варыянтнасці як асобных этапаў абраду, іх паслядоўнасці, характару эпізодаў і рытуалаў, назваў, так і песеннага складу палескага вяселля, якое, аднак, устойліва захоўвае агульную структуру беларускай вясельнай абраднасці. Канкрэтныя ўмовы бытавання напаўняюць вясельны абрад у кожным выпадку спецыфічнымі мясцовымі асаблівасцямі, якія і ствараюць яго шматколерны воблік.

Сутнасць вынікаў даследавання звязаны найперш з цікавай фактычнай інфармацыяй, атрыманай у фальклорных экспедыцыях адносна сучасных рэгіянальна-лакальных форм бытавання беларускай вясельнай традыцыі на тэрыторыі Усходняга Палесся, іх ступені захаванасці і жыццёвай дынамікі.

Навуковая навізна вынікаў даследавання – ва ўвядзенні ў навуковы ўжытак новых матэрыялаў па вяселлі Гомельскага Палесся, ва ўзбагачэнні агульнабеларускай вясельнай абраднасці і паэзіі новымі фактычнымі звесткамі, у вызначэнні лакальна-рэгіянальнай спецыфікі вясельнага фальклору Палесся.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## Бібліяграфія

1 Аникин, В.П. Теория фольклора : курс лекций / В.П. Аникин. – М., 1996. – 408 с.

2 Восточнославянский фольклор. Словарь науч. и нар. терминологии.– Мн., 1993. – 478 с.

3 Бромлей, Ю.В. Очерки теории этноса / Ю.В. Бромлей. – М., 1983. – 412 с.

4 Беларусы : У 8 т. Т. 4. Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мн., 2001. – 433 с.

5 Путилов, Б.Н. Фольклор и народная культура / Б.Н. Путилов. – СПб., 1994. – 238 с.

6 Зуева, Т.В. Русский фольклор / Т.В. Зуева, Б.П. Кирдан. – М., 2002. – С.400.

7 Традиционная культура русских Сибири // www.rambler.search.short.

8 Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре / А.К. Байбурин // www. Cultinfo.ru/fulltext/books/baybur/Baybu.

9 Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре. Культура в Вологодской области // www.Cultinfo.ru/fulltext/books/baybur/Baybu.

10 Славянский мир / Р.В. Андреева, В.В. Будаков, Л.Ф. Попова. – Воронеж, 2001. – С. 32.

11 Мажэйка З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажейка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн., 1999. – С. 3.

12 Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья. – Мн., 1987. – С.248.

13 Елатов, В.М. Песни восточнославянской общности / В.М. Елатов; ред. Г. М. Цитович. – Мн., 1977. – С. 41.

14 Історія української культури / за загал. ред. І. Крип’якевича. – Київ, 1994. – С. 30-31.

15 Вовк, Хведір. Студіі з украінськоі етнографіі та антропологїї / Хведір Вовк. – Київ, 1995. – С. 195-196.

16 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мн., 2004. – 592 с.

17 Традыцыйнае вяселле на Гродзеншчыне. Запіс, літаратурная апрацоўка і натаванне песенных напеваў Т. Б. Варфаламеевай. – Мн., 1992.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

18 Вяселле. Абрад / уклад., уступ. артыкул і камент. К.А. Цвіркі; муз. дадатак З.Я. Мажэйка. – Мн., 1978.

19 Беларускае вяселле / аут.-склад. М. А. Даніловіч, Н. К. Памецька, І.В. Піваварчык. – Гродна, 2000.

20 Палескае вяселле / уклад. і рэд. В.А. Захаравай. – Мн., 1984. – 303 с.

21 Традыцыйны фальклор Магілёўскага Падняпроўя. – Мн., 1996. – 125 с.

22 Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В.Д. Ліцвінка; уклад. муз. часткі Г.Р. Кутырова. – Мн., 1995.

23 Фядосік, А.С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А.С. Фядосік. – Мн., 1997.

24 Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.)[ і інш.]. – Мн., 1989. – 575 с.: іл.

25 Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А.С. Фядосік.)[ і інш.].; уавук. рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мн., 2001. – 422 с.

26 Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кніга 1 / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мн., 1996.

27 Разумова, И.А. Потаенное знание современной русской семьи. Быт. Фольклор. История / И.А. Разумова. – М., 2001.

28 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – Мн., 2003. – 472 с.

29 Славянская мифология. Энциклопедический словарь. – М., 1995.

30 Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. / уклад. У. Васілевіч. – Мн., 1998.

31 Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры / отв. ред. член-кор-т АН СССР К.В. Чистов. – М., 1987.

32 Тресиддер, Дж. Словарь символов / Дж. Тресиддер; пер. с англ. С. Палько. – М., 1999.

33 Славянские древности: этнолингвистический словарь: в 5 т. Т.2 / под ред. Н.И. Толстого. – М., 1999.

34 Беларускія народныя абрады. – Мн., 1994.

35 Валодзіна, Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мн., 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

36 Славянские древности: этнолингвистический словарь: в 5 т. Т.1 / под ред. Н.И. Толстого. – М., 1995.

37 Русские: Семейный и общественный быт. – М., 1989.

38 Славянские древности: этнолингвистический словарь : в 5 т. Т. 3 / под ред. Н.И. Толстого. – М., 2004.

39 Крыніц кармянскіх паразвоны (абрады і песні ў сучасных запісах) / уклад., сістэмат., тэксталаг. праца, уступны артыкул В.С.Новак. – Гомель, 2000.

40 Роднае. Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Гомельскага раёна / уклад., сістэмат., тэксталаг. праца, уступны артыкул І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – Мазыр, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**ДЛЯ ЗАПИСЕЙ**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Вучэбнае выданне**

**Новак** Валянціна Станіславаўна

# ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА

**ТЭКСТ лекцыі па тэме**
**“Рэгіянальныя асаблівасці вясельных традыцый”**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1-21 05 01 “Беларуская філалогія**

***У аўтарскай рэдакцыі***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Падпісана ў друк 12.11.2009 (92) Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая № 1.
Гарнітура “Таймс”. Ум.-друк. арк. 6,2. Ул-выд. арк. 4,8. Тыраж 25 экз.

Аддрукавана ва ўстанове адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны”
246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104